
ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

БОЛЬШЭВІК БЕЛАРУСІ

№ 17—18

№ 17—18

МЕНСК
Выдавецтва ЦК КП(б)Б „ЗВЯЗДА“
1934



ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

БОЛЬШЭВІК БЕЛАРУСІ

ПАЛІТЫКА-ЭКАНАМІЧНЫ
ДВУХТЫДНЁВІК
ОРГАН ЦК КП(б)Б

ГОД ВЫДАННЯ VIII

№ 17—18

30-е ВЕРАСНЯ 1934 г.

ЗМЕСТ

КАНСУЛЬТАЦЫІ

КРЫТЫКА І БІБЛІЯГРАФІЯ

Адрас рэдакцыі:
Менск, Чырвонаармейская вул.
ЦК КП(б)Б, пакой № 105.
Тэлефон адказнага рэдактара па камутатару 20000 даб. 83; адк. сакратара—12; гарадскі—21044.



А. Чарвякоў

Вышэй сцяг советаў

Советы з'яўляюцца самымі масавымі арганізацыямі, праз якія рабочы клас, калгаснікі і ўсе працоўныя прымаюць непасрэдны ўдзел у кіраўніцтве дзяржавай і праз якія ажыццяўляецца кіруючая роля рабочага класа ў справе социялістычнага будаўніцтва.

Надыходзячая кампанія перавыбараў советаў з'яўляецца адказнейшай масавай палітычнай кампаніяй па далейшаму ўмацаванню советаў. Для паспяховага яе правядзення патрэбна агромная мабілізацыя і напружанне сіл усіх совецкіх, партыйных і грамадскіх арганізацый.

У БССР налічваецца каля трох мільёнаў выбаршчыкаў, якія карыстаюцца правамі выбіраць і самі могуць быць абраны ў советы, і якіх неабходна прыцягнуць да актыўнага ўдзелу ў пераабранні советаў.

Уся гэта маса выбаршчыкаў аб'ядноецца і прымае штодзенна ўдзел у кіраванні дзяржавай праз сваіх дэпутатаў, якія ўваходзяць у склад 1477 сельсоветаў, 32 гарадскіх советаў, 72 РВК і цэнтральных арганізацый—ЦВК і СНК БССР.

Асноўны актыў совета складаюць члены—дэпутаты советаў. Усяго ў склад советаў абрана ў 1931 годзе—45.441 дэпутат. Акрамя таго, у пастаянную работу ў советах праз секцыі і дэпутацкія групы ўцягнута яшчэ значная колькасць рабочых і калгаснікаў.

Пры арганізацыі сельсоветаў належная ўвага звернута на абслугоўванне працоўных нацыянальных меншасцей на іх роднай мове. З гэтаю мэтай у БССР арганізаваны і працуюць 40 польскіх, 24 яўрэйскія, 24 рускія, 16 украінскіх, 5 латышскіх, 2 нямецкія і 1 літоўскі советы.

З часу апошніх перавыбараў советаў адбыліся каласальныя змены ва ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага жыцця нашай рэспублікі. Перамогі, з якімі БССР ідзе к перавыбарам советаў, ёсць трыумф ленінскай нацыянальнай палітыкі. Гэтыя перамогі атрыманы ў жорсткай барацьбе супроць беларускага контррэволюцыйнага нацыянал-дэмакратызма і вялікадзяржаўнага шавінізма. Гэтыя перамогі ярчэй і лепш за ўсё выкрываюць і разбіваюць ушчэнт усе дамаганні беларускіх нацыянал-дэмакратаў, ускрываючы ў аголеным і агідным выглядзе іх контррэволюцыйную сутнасць. **Беларусь магла дабіцца пышнага росквіту гаспадаркі і культуры толькі як рэспубліка советаў, як неадлучная частка вялікага Совецкага союза.**

Асабліва значныя змены адбыліся ў сельскай гаспадарцы ў рэзультаце барацьбы за яе социялістычную рэканструкцыю. Замест 17 проц.

калектывізацыі і 4.112 калгасаў на 1 студзеня 1931 года, Совецкая Беларусь налічвае на 1 жніўня 1934 г. 9.820 калгасаў і 55,3 процанта калектывізацыі. Пасеўная плошча калгасаў складае 60,8 проц. усёй пасеўнай плошчы замест 33,8 проц. на 1 студзеня 1931 г. БССР за гэты час многага дабілася ў галіне механізацыі сельскай гаспадаркі. Замест 30 МТС з 1.006 трактарамі (без соўгасаў) у 1931 годзе, у гэтым годзе БССР мае 76 МТС з 2.120 трактарамі. Акрамя таго, соўгасы Наркамзема маюць 338 трактароў і соўгасы Наркамсоўгасаў маюць 993 трактары.

У межах БССР у гэтым годзе налічваецца каля 400 жывёлагадоўчых, насенаводчых і іншых спецыялізаваных соўгасных гаспадарак.

Ідзе хуткі рост малочна-таварных, свіна-таварных, а з гэтага года і аўцагадоўчых калгасных ферм са значным ростам пагалоўя ў гэтых фермах. Вялікая работа праводзіцца ў калгасах па захаванню маладняка і падрыхтоўцы жывёлагадоўчых ферм да надыходзячай зімы. Разам з тым заканчваецца практычнае ажыццяўленне дырэктывы партыі і ўрада аб тым, каб кожны калгаснік меў сваю карову.

Гэтыя агромныя поспехі ў справе соцыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі ўжо прыносяць свае дадатныя вынікі.

Не выпадкова-ж Совецкая Беларусь перавыканала план вясенняй сяўбы, паспяхова правяла прапалачную і ўборачную кампаніі і выканала ў гэтым годзе абавязковы план зернапаставак дзяржаве да 5 верасня, раней устаноўленага тэрміна і зярном добрай якасці. Гэта з'явілася, галоўным чынам, рэзультатам таго, што ў працэсе ўзмоцненай барацьбы за большэвіцкія калгасы, калгасы Совецкай Беларусі настолькі ўздужалі, вырасцілі такі значны і адданы калгасны актыў, што калгасы, як правіла, з'явіліся перадавікамі ў барацьбе за выкананне гэтага і іншых дзяржаўных абавязацельстваў.

Апіраючыся на калгасы і калгасны актыў, советы паспяхова разгарнулі работу сярод аднаасобнага сектара.

Абсалютная большасць калгасаў БССР пасля выканання ўсіх дзяржаўных абавязацельстваў, засыпкі насенных, страхавых і іншых фондаў здолеюць дастаткова забяспечыць жыццё саміх калгаснікаў, якія на справе ўжо ў гэтым годзе ажыццёвяць лозунг тав. Сталіна аб заможным жыцці. Вось чаму восень гэтага года азнаймавалася далейшым значным ростам калектывізацыі.

Мінулыя гады былі гадамі ўпорнай класавай барацьбы. Класавы вораг, разбітыя і выкрытыя, але недабітыя нацыянал-дэмакраты аказвалі жорсткае супраціўленне стварэнню і ўмацаванню калгасаў, выкананню дзяржаўных абавязацельстваў.

Барацьба за соцыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, за большэвіцкія калгасы і за заможнага калгасніка і з'яўляецца важнейшай задачай і праверкай работы сельсоветаў.

Там, дзе сельсоветы разумелі, што лінія партыі і совета адна, дзе советы на справе змагаліся за генеральную лінію партыі, дзе сельсовет з'яўляўся моцнай цытадэляй большэвізма,—там класавы вораг быў своечасова выкрыт, разбіт, выкінут з советаў, з калгасаў, там паспяхова разгортвалася калектывізацыя, калгасы на справе ператвараліся ў большэвіцкія, там своечасова выконваліся дзяржаўныя абавязацельствы і калгаснік упэўнена і цвёрда ішоў к заможнаму жыццю. І, наадварот, у тых выпадках, дзе ў советы пранікалі прамыя класавыя ворагі, агенты кулацтва, апартуністы, нацыянал-дэмакраты, гнілыя лібералы,—у тым совеце калгасы прадастаўляліся самім сабе і без кіраўніцтва ператвараліся часта ў арэну беспакаранай дзейнасці

контррэволюцыянераў. Тут на справе пацвярджаліся словы тав. Сталіна:

> «Справа не толькі ў советах, як у форме арганізацыі, хоць сама гэта форма прадстаўляе найвялікшую рэволюцыйную заваёву. Справа перш за ўсё ў змесце работы советаў, справа ў характары работы советаў, справа ў тым, хто іменна кіруе советам—рэволюцыянеры ці контррэволюцыянеры».

Разам са зменай характару сельскай гаспадаркі, якая перабудоўваецца з аднаасобнай у калгасную, ішло змяненне складу сельсоветаў. Замест 25 проц. калгаснікаў, абраных дэпутатамі сельсоветаў у 1931 годзе, колькасць членаў сельсоветаў-калгаснікаў у 1934 годзе ўзнялася да 53,4 проц. Гэтыя змены ў складзе членаў сельсоветаў адбыліся як за кошт таго, што абраныя ў сельсоветы ў 1931 годзе аднаасобнікі, з'яўляючыся лепшымі, адданымі партыі і совецкай уладзе перадавікамі, за гэты час самі сталі калгаснікамі, а таксама за кошт таго, што рад членаў сельсоветаў не апраўдалі сябе за час работы ў совеце, аказаліся чуждымі і былі адкліка765 са складу сельсоветаў, а замест іх былі даабраны адданыя справе партыі і соцыялістычнага будаўніцтва калгаснікі-ўдарнікі.

Увага партыі і ўрада ўвесь час была накіравана на тое, каб усямерна ўзмацніць сельсоветы. З гэтаю мэтай пад сельсоветы была падведзена моцная матар'яльная база. Замест 333 сельсоветаў, меўшых самастойны бюджэт у 1931 годзе, у 1934 годзе ўсе 1.477 сельсоветаў маюць свой самастойны бюджэт. Кіруючы склад сельсоветаў за гэты час значна ўзмоцнен за кошт накіравання ў вёску для сталай работы работнікаў з ліку раённага актыва. Значна палепшана матар'яльнае становішча работнікаў сельсоветаў. Такім чынам барацьба за соцыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі з'яўлялася ў той-жа час барацьбой за далейшае ўмацаванне сельсоветаў, за ачыстку сельсоветаў ад чуждых, прымазаўшыхся элементаў, ад агентаў класавага ворага, за папаўненне советаў за кошт лепшых і адданых калгаснікаў з ліку калгаснага актыва.

Дзякуючы прынятым мерам па ўмацаванню сельсоветаў, цэлы рад раёнаў і сельсоветаў, якія ішлі да гэтага з глыбокімі прарывамі, сталі раёнамі і советамі перадавымі, сістэматычна і своечасова выконваючымі ўсе свае абавязацельствы. Аршанскі, Слуцкі, Чэрыкаўскі, Чырвона-Слабодскі, Менскі і рад іншых раёнаў, а таксама Ерамкоўскі сельсовет, Оршанскага раёна, Баярскі сельсовет, Полацкага раёна, Бычынскі і Кішчына-Слабодскі сельсовет, Барысаўскага раёна, і вялікая колькасць іншых сельсоветаў, заваяваўшых сабе цвёрдае месца сярод перадавых раёнаў і сельсоветаў БССР, служаць лепшым гэтаму довадам.

Вельмі значны поспехі Совецкай Беларусі ў справе прамысловага будаўніцтва. За мінулы час закончан будоўляй і пушчан у эксплаатацыю рад новых буйных прадпрыемстваў, а таксама значна рэканструяваны і пашыраны існуючыя прадпрыемствы. Значна павялічылася колькасць рабочых на фабрыках і заводах. Валавая прадукцыя прамысловасці, якая складала ў 1930 г. 35 проц. усёй прадукцыі народнай гаспадаркі, у 1933 годзе складала 60 проц. Гэта гаворыць аб тым, што БССР ператварылася ў краіну індустрыяльна-аграрную.

Поспехі БССР у галіне індустрыялізацыі таксама знаходзяцца ў залежнасці ад работы советаў і ў першую чаргу горсоветаў. Там, дзе горсоветы самі праз секцыі, дэпутацкія групы займаюцца пытаннямі

прамысловага будаўніцтва і работай прамысловых прадпрыемстваў, там барацьба за промфінплан, за палепшанне матар'яльнага, культурна-бытавога становішча рабочых працякае пасьпяхова. І наадварот, прарывы ў рабоце прадпрыемстваў заўсёды і немінуча звязаны з недаацэнкай гэтай работы советамі, з адсутнасцю арганізацыйна-масавай работы ў советах.

Да таго часу, пакуль віцебскі горсовет мала займаўся пытаннямі прамысловасці, віцебская швэйная фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі», ды і іншыя фабрыкі, працавалі вельмі дрэнна. Калі-ж, побач з іншымі мерамі, прынятымі для аздараўлення і палепшання работы фабрыкі, горсовет разгарнуў масавую работу на прадпрыемстве, арганізаваў дэпутацкія пасты, дэпутацкія групы, устанавіўшы сістэматычную сувязь прадпрыемстваў праз тэтыя пасты і групы з прэзідыумам горсовета, дзякуючы чаму горсовет змог своечасова прыходзіць на дапамогу фабрыцы,—гэта фабрыка пасьпяхова вышла з прарыву.

Асабліва яркі прыклад значэння масавай работы горсоветаў дае праводзімы конкурс советаў на лепшае аказанне дапамогі чыгуначнаму транспарту. Цэлы рад сур'ёзнейшых задач, вырашэнне якіх сіламі саміх чыгунак было-б надзвычай затруднена, аказаліся лёгка вырашальнымі, калі на дапамогу прышлі советы, мабілізаваўшы для гэтай мэты свой актыў і сродкі. Прывядзенне ў парадак стрэлак, вартаўнічых будак, барацьба за пад'ездныя шляхі, за чыстату на станцыях чыгунак, за лепшае абслугоўванне пасажыраў, за палепшанне кватэрных умоў, а таксама снабжэння чыгуначнікаў і цэлы рад іншых задач пасьпяхова вырашаюцца пры ўдзеле горсоветаў. Менскі, Віцебскі, Оршанскі, Барысаўскі і іншыя горсоветы ўпорна дамагаюцца першынства ў гэтым спаборніцтве. Барысаўскі горсовет здолеў ужо заваяваць сабе першае месца сярод горсоветаў БССР.

Прамой задачай горсоветаў з'яўляецца барацьба за палепшанне комунальнай гаспадаркі гарадоў, за культурна-бытавое абслугоўванне рабочых і наогул працоўных горада. У гэтай галіне работы БССР мае вельмі вялікія поспехі. Аднак і недахопаў яшчэ вельмі многа. Прарывы і недахопы ў гэтай галіне належыць аднесці ў першую чаргу за лік кепскай работы горсоветаў. Калі зімой мінулага года рабочыя горада Менску пераживалі цяжкасці ў снабжэнні дрывамі, то ў першую чаргу гэта належыць аднесці за кошт несвоечасовай, недастаткова актыўнай пастаноўкі гэтага пытання менскім горсоветам.

Асабліва адказна роля як гарадскіх, так і сельскіх советаў ў ажыцьцяўленні мерапрыемстваў культурнага будаўніцтва. Нармальнае жыццё і пасьпяховая работа школы, лікпункта, дзіцячых ясель, ачагоў, хат-чытален, клубаў, кіно, радыёвузлоў, больніц, медпунктаў і інш. знаходзіцца ў простай залежнасці ад увагі і клопату аб іх з боку советаў. Барацьба за ўсеагульнае пачатковае навучанне, за ліквідацыю астаткаў няграматнасці, за ліквідацыю малаграматнасці, за аздараўленне гарадоў, за палепшанне матар'яльных умоў работы настаўніка, урача і інш.—усё гэта пасьпяхова выконваецца толькі там, дзе советы чэсна займаюцца гэтай справай.

Трэба адзначыць вельмі станоўчую ролю, якую адыграў у справе ажыўлення работы горсоветаў усесаюзны конкурс, аб'яўлены пастановай Прэзідыума ЦВК Саюза ССР. У конкурс на лепшую падрыхтоўка к навучальнаму году уключылася 80,1 проц. сельсоветаў, у конкурс па жывёлагадоўлі—85,2 проц. сельсоветаў, у конкурс па дарожнаму будаўніцтву—82,4 проц., у конкурс на лепшую дапамогу чыгуначнаму транспарту—13 горсоветаў і т. д.

Советы выкарысталі гэты конкурс для разгортвання шырокай масавай работы, для ліквідацыі прарываў шляхам мабілізацыі мас, вылучэння новага актыва, вылучэння на кіруючую работу сапраўды аданых людзей.

Пастанова Прэзідыума ЦВК Саюза ССР аб перавыбарах советаў і скліканні Ўсесаюзнага з'езда советаў яшчэ больш ажывіла масавую работу советаў і ўзняла новую хвалю соцыялістычнага спаборніцтва на лепшую работу. Выкананне ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній, вырашэнне ўсіх задач соцыялістычнага будаўніцтва ў сучасны момант звязваецца са справай падрыхтоўкі да перавыбараў советаў. Перадавыя прадпрыемствы ў гарадах бяруць на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў пад знакам падрыхтоўкі да перавыбараў советаў, пад знакам барацьбы за ганаровае права рапартаваць надыходзячым з'ездам советаў аб сваіх поспехах. Фабрыка штучнага валакна ў Магілеве ўзяла на сябе абавязацельства змагацца за тое, каб прадукцыя совецкай маркі была лепшай у свеце, і выклікала на спаборніцтва Сяскі камбінат (Ленінград), Свярдлоўскі камбінат (Урал), апрацоўваючую шоўкавую фабрыку «Чырвоны сцяг» (Ленінград) і Тушынскую фабрыку (Масква). «Неабходна даць совецкай радзіме лепшую ў свеце прадукцыю і ажыццяўленнем гэтай задачы адрапартаваць VII з'езду советаў—гаспадару совецкай зямлі»—заяўляюць ударнікі магілеўскай фабрыкі.

Аналагічныя рашэнні прымаюцца і на іншых прадпрыемствах Беларусі.

Уся работа ў вёсцы—барацьба за своечасовае выкананне зернапаставак і натураплаты МТС, за зварот насеннпазыкі, за своечасовае і поўнае выкананне лёну і канапель дзяржаве, за выкананне плана бульбазагатовак і хлебазакупак, за правядзенне вэімай сяўбы, за падрыхтоўку да зімы жывёлагадоўчых ферм і інш.—праходзіць пад лозунгам падрыхтоўкі да надыходзячай перавыбарнай кампаніі.

Тыя раёны, якія здолелі звязаць выкананне ўсіх кампаній з надыходзячымі перавыбарамі советаў, ідуць паспяхова ў іх выкананні. Затое Гарадоцкі, Мсціслаўскі, Дубровенскі, Суражскі, Чашніцкі, Лагойскі, Расонскі і іншыя раёны з'яўляюцца адстаючымі таму, што кіраўніцтва гэтых раёнаў недаацэньвае разгортвання масавай палітычнай работы, замяняючы масавую работу голым адміністраваннем, не здолела звязаць барацьбы за ажыццяўленне гаспадарча-палітычных кампаній з падрыхтоўкай да надыходзячых перавыбараў советаў.

Асабліва вялікае значэнне павінна адыграць перавыбарная кампанія советаў у справе барацьбы за завяршэнне калектывізацыі ў БССР. Усе прадпасылкі к гэтаму ў БССР ёсць. Сёння ўжо няма патрэбы даказваць аднаасобніку перавагі і выгады калгаснай гаспадаркі, бо большэвіцкія калгасы і заможнае жыццё калгасніка з'яўляецца лепшымі агітатарамі. Наша задача заключаецца ў тым, каб арганізацыйна замацаваць наяўны, ужо значны прыліў у калгасы, палітычна і арганізавана дапамагчы астатнім аднаасобнікам зрабіць гэты важны крок і ўступіць у калгасы.

Кампанія па перавыбарам советаў, як масавая кампанія, на якую будуць кінуты лепшыя сілы партыі і советаў, самы зручны момант для растлумачэння неабходнасці ўступлення ў калгасы ўсім беднякам і сераднякам, выкрыцця ўсіх і ўсялякіх адгаворак ад уступлення ў калгасы як класава-чуждых, антысовецкіх хітрасцей.

Той, хто за партыю, за советы, той без хістанняў павінен ісці ў калгасы.

Падрыхтоўка і правядзенне перавыбарнай кампаніі павінна яшчэ больш падняць аўтарытэт советаў, як органаў дыктатуры пролетарыята на месцах, як масавых арганізацый, замацаваўшы сувязь советаў з самымі шырокімі масамі працоўных горада і вёскі.

Работа кожнага совета павінна падвергнуцца ў перыяд перавыбараў самай дасканальнай праверцы і крытычнай ацэнцы з боку выбаршчыкаў. Задача советаў заключаецца ў тым, каб разгарнуць самую шырокую большэвіцкую крытыку і самакрытыку сваёй работы. Трэба, каб кожны працоўны ўясніў, што советы абавязаны дакладна і чотка ажыццяўляць усе рашэнні партыі і ўрада. Трэба мабілізаваць усе сілы на тое, каб яшчэ раз як найясней растлумачыць гэту адзіную лінію партыі і ўрада па ўсіх пытаннях соцыялістычнага будаўніцтва. Тады ясней будзе відаць у рабоце советаў адхіленні ад генеральнай лініі партыі і ўрада. Тады астрэй будзе відаць недахопы работы кожнага члена совета. Тады вярней і лягчэй мы зможам ачысціць советы ад чуждых, няўстойлівых апартуністычных элементаў.

Адсюль зразумела, што на перавыбарную кампанію неабходна мабілізаваць і накіраваць ў вёску ўвесь цэнтральны і раённы партыйна-совецкі актыў для таго, каб у кожным сельсовеце, на кожным прадпрыемстве пабывалі кіруючыя работнікі і расказалі аб задачах дзейнасці совецкага ўрада, падвергнуць крытыцы работу совета ў разрэзе адпаведнасці гэтай работы з мерапрыемствамі партыі і ўрада.

З другога боку, тая крытыка, якой падвергнуцца на рабочых і калгасных сходах даклады аб дзейнасці ўрада, дасць багацейшы матар'ял для далейшай дзейнасці самога ўрада. Разам з гэтым, прысутнасць кіруючых работнікаў цэнтральных устаноў і арганізацый у момант перавыбараў советаў на месцах, будзе з'яўляцца гарантыяй больш глыбокага разгортвання крытыкі дзейнасці советаў з боку працоўных.

Для паспяховага правядзення перавыбарнай кампаніі мы патрабуем ад усіх советаў абавязковага выканання наступных арганізацыйна-палітычных задач:

1. Кожны совет абавязан забяспечыць 100 проц. яўку выбаршчыкаў на справаздачна-перавыбарчыя сходы як у горадзе, так і на вёсцы. Профсаюзы, адміністрацыя фабрык, заводаў, устаноў, праўленні калгасаў, кіраўніцтва соўгасаў, МТС, прэзідыумы советаў абавязаны так арганізаваць папярэднюю растлумачальную работу, каб на перавыбарныя сходы з'явяліся ўсе 100 проц. рабочых, работніц, калгаснікаў, калгасніц, аднаасобнага сялянства і ўсіх працоўных. Асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на 100-проц. яўку працоўных жанчын. Вопыт мінулай перавыбарнай кампаніі гаворыць аб тым, што ў радзе раёнаў і советаў гэты ўчастак быў найбольш слабы. Яўка на перавыбары працоўных жанчын была ніжэй яўкі мужчын. Рад раёнаў і советаў недаверчыва аднесліся да справы ўцягнення ў советы жанчын, да справы абрання жанчын у кіруючыя органы советаў. З гэтымі антыпартыйнымі, антысовецкімі настроямі неабходна павесці самую рашучую барацьбу. Вырашэнне гэтай задачы ў вёсцы ў сучасны момант значна палягчаецца тым, што наша вёска ператварылася ў большасці з аднаасобнай у калгасную, што калгасніца за гэтыя гады значна палітычна вырасла і вылучыла самы актыўны, адданы партыі і совецкай уладзе выдатны актыў. Вось гэты актыў і павінен пайсці на папаўненне, на ўмацаванне нашых советаў. Агромную ролю тут будуць адыгрываць палітаддзелы МТС.

2. За мінулы час у нас зноў падраслі новыя кадры моладзі, якія ўпершыню будуць прымаць удзел у перавыбарах советаў. Трэба па-

мятаць агромнае значэнне, якое заўсёды надаваў Владзімір Ільіч Ленін справе ўцягнення ў дзяржаўнае будаўніцтва моладзі. Вось чаму неабходна асабліва ўрачыста, асабліва клапатліва арганізаваць уцягненне і ўдзел моладзі ў перавыбарнай кампаніі советаў, абраўшы лепшых комсамольцаў, ударнікаў з рабочых і калгаснікаў у лік членаў советаў.

3. Шматнацыянальны склад Совецкай Беларусі патрабуе асабліва ўважлівых адносін да справы ўцягнення ў перавыбарную кампанію працоўных усіх нацыянальнасцей, забяспечыўшы ім магчымасць гэтага ўдзелу на роднай мове. Рускія, палякі, яўрэі, латышы, літоўцы, немцы, эстонцы—працоўныя ўсіх нацыянальнасцей у момант перавыбараў павінны яшчэ больш рэзка, яшчэ мацней зразумець, што адзінай радзімай для ўсіх працоўных з'яўляецца рэспубліка дыктатуры пролетарыята, з'яўляецца Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, яднаючы ў адзінае цэлае ўсе совецкія рэспублікі, і што працоўныя ўсіх нацыянальнасцей нясуць адказнасць за лёсы сваёй соцыялістычнай радзімы.

4. Самую сур'ёзную ўвагу неабходна звярнуць на выбары дэлегатаў членаў советаў, памятаючы ўказанні тав. Сталіна, што «Справа ў тым, хто іменна кіруе советамі—рэволюцыянеры ці контррэволюцыянеры».

Неабходна рашуча ачысціць советы ад усіх чуждых, прымазаўшыхся, класава-варожых, ненадзейных элементаў. Пры гэтым неабходна выкрываць іх класава-варожы твар шырокім масам працоўных, каб на гэтым прыкладзе яшчэ больш завастраць, яшчэ больш загартоўваць класавую пільнасць усіх працоўных. Неабходна абраць у советы адданых справе партыі і совецкай дзяржавы людзей, у першую чаргу з ліку знатных людзей—ударнікаў фабрык, заводаў, соўгасаў, МТС і калгасаў. Неабходна значна вышэй узняць колькасць жанчын і моладзі, абіраемых у советы. Пры перавыбарах советаў неабходна памятаць тое, што лінія партыі і совецкага ўрада знаходзіць сваё непасрэднае ажыццяўленне ў советах і залежыць ад таго, якія людзі намі абраны ў гэтыя советы.

Рабочы клас і працоўныя Совецкай Беларусі дабіліся агромных поспехаў, змагаючыся за ўмацаванне советаў і дзякуючы таму, што работай советаў кіруе вялікая партыя Леніна—Сталіна, наш ленінскі ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б і што Совецкая Беларусь атрымала і атрымлівае агромнае брацкае падтрыманне ўсяго Совецкага саюза.

Яшчэ больш паспяхова пойдзе работа ўперад, калі мы паспяхова правядзем надыходзячую перавыбарную кампанію і ажыццёвім на справе ўказанні нашага правадыра і кіраўніка тав. Сталіна аб тым, што «сільная і магутная дыктатура пролетарыята—вось што нам патрэбна цяпер для таго, каб развеяць ушчэнт апошнія рэшткі паміраючых класаў».

Большэвіцкія советы ёсць абавязковая ўмова паспяховай барацьбы за соцыялізм. Мы абавязаны дабіцца і даб'емся ў час перавыбараў таго, каб усе советы Беларусі былі большэвіцкімі.

Л. Хейфец

Прафсаюзы—на ўзровень задач другой пяцігодкі

[illegible]

[illegible] ымі элементамі. Вырас і акрэп большэвікі [illegible]. Значна перабудавалі сваю работу і прафсаю[illegible].

> «Нельга параўнаць нашы фабзаўкомы, — казаў тав. Кагановіч на XVII партыйным з'ездзе, — [illegible] перыяд старога прафсаюзнага трэд'юніянісцкага кіраўніцтва, з тымі фабзаўкомамі, якія мы маем сення».

Але яшчэ не мала недахопаў і прарэх у рабоце [illegible]. Грандыезны размах па завяршэнню [illegible] 2-й пяцігодцы рэканструкцыі [illegible] народнай гаспадаркі краіны, [illegible] ко[illegible] рост [illegible], пашырэнне дзейнасці прафсаюзаў (перадача функцый [illegible], Соцстраха і масавага кантроля) прад'яўляюць прафсаюзам з надзвычайнай вострасцю запатрабаванне павысіць [illegible] ляючыся магутным і самым [illegible] прафсаюзы, на ўскладзеных [illegible] задач другой пяцігодкі, павінны [illegible] кіраваць [illegible] нелізарнейшы рух соцспаборніцтва і [illegible] данне тэхнікай, за культурны рост. К[illegible] дыферэнцыяваным і [illegible]

З гэтага пункту [illegible] ЦК [illegible] [illegible] прафсаюзаў непа[illegible] [illegible]

На XVII партыйным з'ездзе тав. Кагановіч [illegible] арганізацыйных пытаннях [illegible]

> «Калі паглядзець нарады, пратаколы [illegible] камітэта саюзаў, то ўбачым, што людзі [illegible]
> [illegible]
> вога жыцця, якое б'е крыніцай у нас на [illegible]. Эмпірызм заядае прафсаюзы. Яны пра[illegible], яны стараюцца, але яшчэ не навучыліся [illegible] тое, што намячаюць».

Гэтыя ўказанні тав. Кагановіча цалкам і поўнасцю адносяцца і да прафсаюзаў БССР. ЦК КП(б)Б у сваей пастанове «Аб рабоце прафесіянальных саюзаў БССР» адзначае, што ў рэзультаце барацьбы за ажыццяўленне задач, пастаўленых партыяй, прафсаюзы БССР правялі вялікую палітычную і практычную работу, што знаходзіць сваё адлюстраванне ва ўзросшым удзеле прафсаюзаў у барацьбе за промфінплан, за павышэнне працоўнай дысцыпліны, у росце соцспаборніцтва і ўдарніцтва і ў яго вышэйшай форме —соцтэхэкзамене, у павелічэнні ахопу тэхвучобай на 19.000 рабочых, у росце прафсаюзнага членства на 45.000 чал. З года ў год паляпшаецца матэрыяльнае становішча рабочых. У некалькі раз вырасла харчовая база прадпрыемстваў—прыгарадныя гаспадаркі, малочна-свіныя фермы. 58 тысяч рабочых надзелены ў 1934 г. індывідуальнымі гародамі.

Але, тым не менш, у рабоце прафсаюзаў яшчэ безліч недахопаў. Галоўны недахоп—недастатковая аперацыйнасць і канкрэтнасць у рабоце ЦСПСБ, ЦП саюзаў, горпрофсаветаў. Нездавальняюча пастаўлена работа прафсаюзаў у арганізацыі сістэматычнага кантроля над работай усіх звенняў дзяржаўнага савецкага апарата асабліва гандлёва-снабжэнчых арганізацый (ЗВК, сталовая, орсы і г. д.). А гэта [illegible] абавязкаў прафсаюзаў, ускладзеных на іх XVII з'ездам партыі.

Ужо адзін той факт, што прафсаюзы не ўзяліся адразу-ж пасля рашэння ЦК ВКП(б) за рашучую і належную барацьбу ў галіне арганізацыі масавага рабочага кантроля на ўсіх участках [illegible] гандлёвай работы ў тых памерах і формах, як на тэта ўказаў другі пленум камісіі партыйнага кантроля пры ЦК ВКП(б), сведчыць аб тым, што прафсаюзы яшчэ поўнасцю не засвоілі функцый новых органаў РСІ.

Колькі фармальнага бюракратычнага дабрадушша праяўляюць многія гаспадарнікі, кааператыўныя, снабжэнчыя арганізацыі ў пытаннях забеспячэння рабочых кватэрамі, у пытаннях своечасовага і добраякаснага рамонту жылёвых будынкаў, у [illegible] рабочых кватэр, за снабжэнне рабочых і служачых дрывамі, пры патуранні з боку прафсаюзаў! Ці даволі актыўнасці і напорыстасці праявілі тут прафсаюзы? Далёка не. Бюро ЦК КП(б)Б адзначае слабы разварот прафсаюзаў у падрыхтоўцы да зімы (рамонт рабочых кватэр, інтэрнатаў, рамонт абутку і вопраткі, падрыхтоўка склепаў і складаў для гародніны і т. д.).

Недастаткова змагаюцца прафсаюзы і за ўшчыльненне рабочага дня, з перарасходам фондаў зарплаты. Слаба кантралююць выкарыстанне сродкаў па ахове працы і тэхнікі бяспечнасці. Даволі сказаць, што з 1.600.000 рублёў, асігнаваных прадпрыемствамі на правядзенне мер па ахове працы, выдаткавана толькі 650 тысяч руб. [illegible]

[illegible] работа [illegible] ваны.

[illegible] нам за [illegible] профсаю[illegible] работы.

Але [illegible] канкрэтнасці, калі паміж рабочым і ЦК, [illegible] цэнтральным праўленнем саюза, немалая адлегласць з прычыны [illegible]ноства прамежкавых [illegible] ячэек МК і

ФЗМК, калі буйнейшыя прафсаюзы (машынабудаўнічых, будаўнічых рабочых, чыгуначнікаў) ядналюць па мільёну і больш членаў, ды да лёка не ўсіх рабочых і служачых. У нас, у БССР, амаль 26 працэнтаў работнікаў прадпрыемстваў, устаноў, лесазагатовак і т. д. не аб'яднаны ў прафсаюзы, не ахоплены прафсаюзным членствам. Прафсаюзныя арганізацыі не сочаць за узыманнем членскіх узносаў. Членскія узносы ў большасці не выплачваюцца па 8—10 месяцаў, але фабком і не думае непакоіцца, і «мёртвыя душы» лічацца арганізаванымі членамі прафсаюза.

«Гэтыя факты гавораць аб беззарукасці, аб расхлябанасці, аб недаацэнцы арганізацыйнай работы многімі прафсаюзнымі работнікамі. Верючы ў папяровыя рашэнні, у пісаныя дырэктывы і цыркулярах, яны замяняюць живую справу» («Праўда»).

Вось чаму ЦК КП(б)Б у сваей пастанове патрабуе ад прэзідыума ЦСПСБ бязлітасна выкрываць з практыкі работы прафсаюзаў безадказнасць, бесканторольнасць, папярова-бюракратычныя метады работы, здымаючы з работы асоб, якія не жадаюць працаваць па новаму і разумець, што асновай работы з'яўляецца хуткае рэагаванне на ўзрослыя патрабаванні рабочых і уважлівыя адносіны да іх патрэб і скаргаў.

З гэтага пункту погляду перабудова прафсаюзаў, разбуйненне іх і набліжэнне цэнтральных апаратаў да прадпрыемстваў мае вялікае значэнне. Гэта рашэнне прынята па ініцыятыве Цэнтральнага Камітэта нашай партыі і асабіста тав. Сталіна. Яно з'яўляецца адным са звенняў у выкананні указанняў XVII з'езда партыі аб неабходнасці падцягнуць арганізацыйную работу да ўзроўню ўзросшых палітычных задач. У гэтым рашэнні яшчэ раз дэманструецца магутны рост нашай краіны, велізарнейшы наступальны рух сацыялізма.

«Палітычны і практычны сэнс разбуйнення саюзаў,—указваў у сваім дакладзе на IV пленуме ВЦСПС тав. Шверник,—зводзіцца к таму, што прафсаюзы пасля разбуйнення, бліжэй падыходзячы да патрэб рабочых, яшчэ лепш і канкрэтней будуць весці р[illegible] творчасць, яшчэ больш уцягваць найшырэйшыя масы рабочых у барацьбу за павышэнне прадукцыйнасці працы і авалодання тэхнікай.

IV пленум ВЦСПС пастанавіў стварыць 154 саюза замест існаваўшых 47. Разбуйненне спалучаецца з іншымі важнымі арганізацыйнымі мерапрыемствамі, накіраванымі на павышэнне якасці прафработы. Месца прабывання значнай часткі ЦК саюзаў пераносіцца ў раёны абслугоўваемых імі прадпрыемстваў, у самую гушчу [illegible] рабочых. У БССР (у Мінску) будуць тры ЦК [illegible] школ і саюза рабочых [illegible] Ліквідуецца многа сярэдніх профсаюзных [illegible] гарадскія [illegible]левыя аддзелы саюзаў. Гэтым самым робіцца больш сільным, [illegible] і дзейсным прыводны рэмень ад партыі к масам. Рэзка скарачаецца платны апарат (на 36 проц.) і бярэцца ўпор на шырокае прыцягненне добраахвотнага актыву, на [illegible] ў профсаюзах [illegible]масці.

Усе гэтыя мерапрыемствы могуць выжыць канцылярска-бюракратычныя метады кіраўніцтва, зрабіць кіраўніцтва больш [illegible], больш дзейсным, больш дыферэнцыраваным.

Апартуністы і блытальнікі стараюцца прадставіць справу так, што разбуйненне профсаюзаў азначае нібы адмаўленне ад вытворчага [illegible], што разбуйненне [illegible] страту профсаюзамі аўтарытэта. Няма чаго даказваць, што гэта агідны [illegible].

Вытворчая пабудова профсаюзаў была, ёсць і застанецца карэнным прынцыпам совецкага прафесіянальнага руху. «Кожны завод—адзін саюз»—было і застаецца асновай арганізацыйнай пабудовы нашых профсаюзаў.

Разбуйненне і перабудова работы профсаюзаў датычыць у аднолькавай меры і профсаюзаў БССР.

У нас, у БССР, пастановай V пленума ЦСПСБ намечана 76 проф[illegible], якія будуць аб'яднаны ў 33 цэнтральныя праўленні, тры [illegible]ныя камітэты. 18 упаўнаважаных ЦК. Астатнія саюзы будуць непасрэдна падпарадкваны сваім цэнтральным камітэтам. Будуць [illegible] прафесіянальныя советы. Міжсаюзныя профсаветы захоўваюцца толькі ў тых гарадах, дзе налічваецца звыш 10 тыс. членаў профсаюза. Да такіх гарадоў адносяцца: Віцебск, Гомель, Магілеў, Бабруйск, Барысаў, Орша, Полацк і Рэчыца. Скарачаюцца апараты профсаюзаў.

Правядзенне ўсёй гэтай перабудовы патрабуе большай гнуткасці, канкрэтнасці ў рабоце профсаюзаў, яшчэ больш рашучага высоўвання ўдарнікаў на профсаюзную работу. Неабходна больш прыцягнуць і добраахвотны актыў да сталай профсаюзнай работы.

Асаблівая ўвага павінна быць удзелена профсаюзнай рабоце на вёсцы. ЦК КП(б)Б адзначыў слабасць профсаюзнай работы ў вёсцы і патрабуе ад усіх профсаюзаў БССР і ў першую чаргу ад профсаюзаў, якія непасрэдна працуюць у вёсцы, рашуча палепшыць сваю работу ў калгасах і соўгасах.

[illegible] раз павінен быць узмоцнен пролетарскі ўплыў і шэфства горада над вёскай, калгасамі і МТС.

Наша рэспубліка датэрмінова выканала дзяржаўны план хлебапаставак. Ураджай у гэтым годзе ў нас добры. Тым з большай настойлівасцю і ўпорствам павінны мы працаваць над выка[illegible] [illegible]шым умацаваннем калгасаў, [illegible] ў гэтых адносінах выкл[illegible] правесці [illegible] уменне ар[illegible] ([illegible])

Пагранічнае становішча нашай рэспублікі, рост народнай гаспа[illegible] [illegible] гненне новых тысяч рабочых у вытворчасць патра[illegible] [illegible] гэтым участку у нас вельмі многа недахопаў. [illegible] у, Оршы (Асінторф) і на іншых прадп[illegible] [illegible] годзе немала нацыяналістычных, шавін[illegible] [illegible]семіцкіх [illegible] быць [illegible].

Нават у такім буйным пролетарскім цэнтры як Гомель культпрацаўнікі, працэзны [illegible] вытворчасць. [illegible] ленскім. Замест [illegible] Былі дапушчаны [illegible] над [illegible] рабочым [illegible] тыя факты прайшлі міма гомельскіх прафсаюзных [illegible] нават міма самога горпрофсавета ([illegible] Камак). А [illegible] працягу доўгага часу над рабочымі немцамі [illegible] заводзе імя Варашылава хіба не сведчаць аб [illegible] слабай [illegible] яанальнай рабоце прафсаюзных арганізацый?

Вось чаму ЦК КП(б)Б [illegible] профсаюзаў у галіне [illegible] усіх прафсаюзных [illegible] лепшыць [illegible] жачых [illegible]

Барацьба за пролетарскі інтэрнацыяналізм павінна стаць адной з цэнтральных задач профсаюзаў БССР.

*

Перабудова проф[illegible] павінна [illegible] якасць усёй профсаюзнай работы, павысіць іх ролю у соцыялістычным [illegible] ніцтве. ЦК патрабуе ад усіх цэнтральных праўленняў саю[illegible] скіх камітэтаў карэнным чынам палепшыць пастаноўку [illegible] вытворчай работы на [illegible] чых і ІТР у вытворча[illegible] ваючы рэалізацыю прапаноў рабочых. Шырэй разгарнуць тэхнічную вучобу і здачу соцтэхэкзаменаў. Весці рашучую бараць[illegible] парушэння працоўнага заканадаўства, з перавыдаткаваннем фондаў зарплаты і абліччваннем рабочых.

V пленум ЦСПСБ па ініцыятыве перадавых рабочых аб'явіў усебеларускі вытворча-культбытавы паход імя VII з'езда советаў СССР. Профсаюзы павінны [illegible] гэты паход і [illegible] усіх рабочых, усіх працоўных на [illegible] выкананне рашэнняў ЦК КП(б)Б, на паспяховую падрыхтоўку к зіме, на дастойную сустрэчу пролетарскага свята—XVII гадавіны Окцябра.

«Нечуванаю ганьбай для кожнага прадпрыемства будзе,—пісала «Правда»,—калі яно прыдзе к з'ездам советаў, як даўжнік краіне, не выканаўшы плана». Рапартаваць гаспадару краіны, з'езду советаў, выкананнем сваіх вытворчых заданняў [illegible] у колькасных, так і ў якасных паказчыках [illegible] кожнага прадпрыемства, кожнай профарганізацыі, кожнага [illegible] Пленум ЦСПСБ абавязаў усе прафесіянальныя арганізацыі надаць гэтаму паходу масава-палітычны характар. Паход павінен прынесці нам поўную перамогу ў барацьбе за план другога года другой пяцігодкі.

Задача профсаюзаў—падрыхтаваць [illegible] к зіме і XVII [illegible] Окцябра. На гэтым участку мы маем яшчэ [illegible] к зіме як [illegible] вытворчасці, так і бытавой вядзецца надзвычай слаба. Рамонт рабочых кватэр, [illegible] зацягваецца. З намечаных к рамонту 13.000 рабочых кватэр адрамантавана толькі каля 5.000.

Профсаюзныя ар[illegible] не праяўляюць яшчэ неабходнай [illegible] рыстасці, паслядоўнасці [illegible] сродкаў, у прыцягненні ініцыятывы і актыўнасці самых рабочых да арганізаванай сустрэчы зімы.

Ад профсаюзаў, як ніколі, патрабуецца больш увагі, больш чуткасці ў барацьбе за інтарэсы рабочага класа.

> «Профработнікі павінны, як гаварыў Ленін,—жыць адным жыццём з рабочымі, ведаць іх запросы і патрэбы, дапамагаць пераадольваць цяжкасці, быць з масамі, на чале мас, адным словам ажыццяўляць на справе сваю ролю—школы камунізма і прываднога рэменя ад партыі к масам».

Не разумець гэтага могуць толькі людзі, якія канчаткова заблыталіся.

Профсаюзы растуць з кожным днём, расце і іх аўтарытэт. Але гэты аўтарытэт, як справядліва падкрэсліў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Валковіч на V пленуме ЦСПСБ, павінен быць заваяван упорнай барацьбой за выкананне задач другой пяцігодкі, за паляпшэнне матэр'яльнага становішча рабочага класа, за культурную працу на вытворчасці і ў быце.

> «Работа ЦСПСБ, ЦП саюзаў, горпрофсаветаў і кожнага профсаюзнага звяна,—гаворыцца ў пастанове ЦК КП(б)Б.—з'яўляецца выключна важнай палітычнай арганізатарскай работай сярод шырокіх мас рабочых і служачых, забяспечваючы масавы і актыўны ўдзел працоўных на усіх участках сацыялістычнага будаўніцтва, асабліва у рэалізацыі рашэнняў XVII з'езда партыі па пытаннях асваення профсаюзамі функцый нізавых органаў РСІ на прадпрыемствах, кіраўніцтва кантрольнымі органамі орсаў, ЗРК сталовых. ЦК КП(б)Б патрабуе ад усіх савецкіх, партыйных і гаспадарчых арганізацый самых уважлівых і чуткіх адносін к рабоце профсаюзаў і ўсямернай практычнай дапамогі з тым, каб уся работа профсаюзаў ў бліжэйшы адрэзак часу была канкрэтным чынам палепшана».

Рашэнне ЦК КП(б)Б аб рабоце профсаюзаў, як і рашэнне пленума ВЦСПС аб перабудове сістэмы профсаюзаў, ускладае выключную адказнасць за іх рэалізацыю на усе профсаюзныя і партыйныя арганізацыі.

А. Чарнушэвіч

Па-бальшэвіцку змагацца за выкананне рашэнняў партыі і ўрада аб школе

На базе гістарычных перамог партыі у галіне сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі дасягнут нябачаны рост нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зместу культуры.

Асабліва агромны нашы поспехі ў галіне будаўніцтва совецкай школы.

Беларускія нацдэмы, якія раней сядзелі ў Наркамасветы, умела расстаўляючы свае кадры на месцах, імкнуліся скарыстаць совецкую школу ў сваіх контррэволюцыйных мэтах. Яны не толькі пробавалі (а дзе-ні-дзе пробуюць і зараз) прышчапіць дзецям нацыяналістычную антыпролетарскую ідэалогію, але і прымалі меры к таму, каб затрымаць тэмпы росту школьнай сеткі. Беларускія нацдэмы так «планавалі» увядзенне ўсеагульнага пачатковага навучання, што яно ажыццявілася-б толькі ў 1934—35 навучальным годзе.

Адзін з лідэраў беларускіх нацдэмаў былы нарком асветы Баліцкі ў свой час пісаў:

> «Эканамічнае становішча рабочых яшчэ настолькі цяжкае, што значная частка з іх не маюць магчымасці ўтрымліваць сваіх дзяцей у агульнаадукацыйнай школе нават на працягу сямі год і таму масавай школай на бліжэйшы перыяд часу, асабліва ў сельскіх мясцовасцях, будзе 4-х годка»

Гэтыя «планы» беларускіх нацдэмаў былі выкрыты і разбіты. Совецкая Беларусь не толькі першай з саюзных рэспублік ажыццявіла, але і першай яшчэ у 1932 годзе закончыла увядзенне ўсеагульнага абавязковага пачатковага навучання. З таго-ж 1932 года БССР прыступіла да увядзення ўсеагульнага навучання на базе няпоўнай сярэдняй школы.

К 1934 году ў гарадах і рабочых пасёлках усеагульнае навучанне праведзена на базе няпоўнай сярэдняй школы, а у весцы ахоплена 80 проц. дзяцей, якія падлягаюць усеагульнаму навучанню. Бліжэйшыя 1—2 гады вырашаюць правядзенне ўсеагульнага навучання поўнасцю і на вёсцы.

У выніку правільнага ажыццяўлення ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі, дзеці ўсіх нацыянальнасцей БССР навучаюцца на роднай мове. У свой час беларускія нацдэмы і іншыя буржуазна-нацыяналістычныя элементы, карыстаючыся прытупленнем класавай піль-

насці работніка. Наркамасветы і праф[арган]ізацыя саюза асветы, праціўнічаючы «тэорыі» «мацярынскай» мовы [illegible] на пытанню навучання дзяцей на роднай мове. Так [illegible] цыркуляры Наркамасветы ад 15.VIII—20 г. за подпісам правадатара нацдэма Ігнатоўскага даваў [illegible]:

> «Пад этым тлумачыцца, што пад роднай мовай трэба разумець мову, на якой гаворыць большасць насельніцтва данай мясцовасці; пад народнай мовай трэба разумець тую мову, якая [illegible] ў Беларусі, акрамя беларускай (напрыклад: руская, яўрэйская, польская)».

Гэтыя нацыяналістычныя [illegible] праводзіліся [illegible] дзяцей беларусаў пасылалі толькі ў беларускія школы, яўрэяў—у яўрэйскія і т. д. Зусім не ўлічвалася, якую мову [illegible] сям'і і жаданне бацькоў [illegible] нацыянальнай прыналежнасці, не улічвалася [illegible] мелі курс на ліквідацыю рускіх школ. Адначасова нацыяналістычныя [illegible] імкнуліся к палітыцы ігнаравання рускай мовы у беларускіх [illegible] школах, адводзячы ёй другарадное месца і свядома [illegible] рамагнасць дзяцей на рускай мове. Адрэзкі гэтай [illegible] прычыны мелі месца ў паасобных школах і ў мінулым годзе. Дазволю прывесці факт ігнаравання рускай мовы у [illegible] школе, Шклоўскага раёна, дзе нацдэм Клішо—былы дырэктар гэтай школы і выкладчык рускай мовы—у 1933—34 навучальным годзе [illegible] выкананне праграмы па рускай мове, а ў 1932—33 навучальным годзе [illegible] патуранні шклоўскага АНА зусім не выкладаў рускай мовы [illegible].

Установкі і «тэорыі» беларускіх нацдэмаў і іншых буржуазных нацыяналістаў былі выкрыты і разгромлены комуністычнай партыяй большэвікоў Беларусі.

Мінулы навучальны год характарызаваўся далейшым ростам усёй школьнай сеці, у прыватнасці сетка беларускіх [illegible], якая у 1933—34 навучальным годзе [illegible] 17.291 [illegible] 5.011 класаў сярэдняй школы. У 1934—35 навучальным годзе сетка беларускіх школ павялічваецца і дасягае 15.[illegible] камплектаў пачатковай і 6.73[illegible] класаў сярэдняй школы. Асабліва расшыралася сярэдняя школа. Амаль у кожным раёне з гэтага навучальнага года адчынена сярэдняя школа (8, 9, 10 класы).

Беларуская школа расла не толькі колькасна, але і якасна. Сотні перадавых школ дабіліся значных поспехаў у галіне асваення асноў навук і разгортвання інтэрнацыянальнага выхавання.

Рост сеці беларускіх і нацыянальных школ, палепшанне якасці іх работы сустракалі прамое супраціўленне з боку вялікадзяржаўных элементаў.

Дазволю прывесці [illegible]. Настаўнік гор. Гомеля Дэйніс, [illegible] у школе «Комінтэрна», адкрыта выступаў у школе сярод дзетвары і сярод настаўніцтва супроць беларусізацыі, ганьбячы беларускую мову. [illegible] Пасвятаўскай няпоўнай сярэдняй школы Бураўцоў [illegible] вялікадзяржаўніцкія погляды у выхаванні дзетвары, распальваючы сярод дзяцей шавіністычныя настроі, [illegible], што беларуская культура ёсць культура [illegible] непаваротлівы, няздольны чалавек і стаць на галаву вышэй рускага».

Яшчэ і зараз далека не зжыты вялікадзяржаўніцкія тэндэнцыі сярод паасобных навуковых працаўнікоў, якія заяўляюць аб немагчымасці выкладання на беларускай мове, як мове адсталай і некультурнай.

Практыка мінулага году паказала, што не заўсёды своечасова гэтыя вялікадзяржаўніцкія погляды і тэндэнцыі выкрываюцца, што ім не заўсёды даецца рашучы адпор у паасобных звеннях сістэмы Наркамасветы.

Няухільнае ажыццяўленне ленінскай нацыянальнай палітыкі ў рабоце школ, далейшае ўмацаванне пазіцыя пролетарскага інтэрнацыяналізма на фронце народнай асветы павінны праходзіць у рашучай барацьбе з беларускім контррэволюцыйным нацдэмакратызмам, з праявамі вялікадзяржаўнага шавінізма і буржуазнага нацыяналізма іншых колераў.

Пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б Наркамасветы і яго органы павінны весці рашучую барацьбу за правільнае ажыццяўленне ленінскай нацыянальнай палітыкі ў галіне школьнага будаўніцтва. Адным з цэнтральных звеньяў работы Наркамасветы ў гэтай галіне, побач з барацьбой за разгортванне і палепшанне сеці беларускіх школ і школ нацменшасцей, з'яўляецца барацьба за разгортванне рускай школы, за павышэнне якасці выкладання рускай мовы ва ўсіх школах рэспублікі.

Яшчэ ў мінулым навучальным годзе сетка рускіх школ была даведзена да 407 камплектаў пачатковай і 139 класаў сярэдняй школы. К пачатку гэтага навучальнага года сетка рускіх школ даведзена да 647 камплектаў пачатковай і 214 класаў сярэдняй школы. Гэты рост рускай школы, яшчэ цалкам не задавальняе запатрабаванню у ёй. Задачай Наркамасветы з'яўляецца далейшы рост сеткі рускай школы.

Работа па рэалізацыі намечаных планаў у разгортванні рускай школы некаторымі раёнамі была недаацэнена. Пры пераглядзе сеткі школ прадстаўнікі Уздзенскага, Чачэрскага, Нараўлянскага раёнаў спрабавалі даказаць «немэтазгоднасць» адчынення рускіх школ, яны стараліся «забыць», што руская школа адчыняецца не толькі для дзяцей рускага насельніцтва, але і для тых, у каго роднаю мовай з'яўляецца руская. Такім настроям Наркамасветы даў рашучы адпор. Выпраўляліся скажэнні нацпалітыкі і ў галіне будаўніцтва польскіх і іншых нацыянальных школ.

Мінулы навучальны год з'явіўся годам рашучага зруху ў справе ўмацавання пазіцый пролетарскага інтэрнацыяналізма ў школе. Гэта гаворыць у першую чаргу аб палітычным росце совецкага настаўніка, аб актывізацыі яго дзейнасці у галіне выхаваўчай работы.

Яркім паказчыкам росту дзіцячай актыўнасці і разумення сваіх абавязкаў перад вялікай соцыялістычнай радзімай з'яўляецца праведзены усебеларускі абаронны злет школьнікаў-піонераў, лепшых ударнікаў вучобы. А тысячы юных вынаходцаў, авіямадэлістаў, юныя дараванні ў галіне літаратуры і мастацтва, тысячы юнкораў, сценкораў, варашылаўскіх стралкоў —хіба ўсё гэта не з'яўляецца яркім довадам таго, што пад кіраўніцтвам нашай вялікай партыі ў совецкай школе выхоўваецца магутнае большэвіцкае племя.

У мінулым 1933—34 годзе школы Беларусі, змагаючыся за рэалізацыю рашэнняў партыі і ўрада аб школе, дабіліся ў радзе важнейшых галін школьнай работы прыметнага палепшання. Вынікі мінулага навучальнага года і вясеннія праверачныя іспыты лепш за ўсё

аб гэтым гавораць. Поспехі відавочны. Школы, як правіла, працавалі па адзінай праграме і падручніках, на аснове ўмацаванага школьнага рэжыма і безумоўна павышанай дысцыпліны.

Лекцыя стала адзінай і абавязковай формай навучання на падставе цвердага раскладу. Настаўнік больш энергічна рыхтаваўся да лекцыі, імкнучыся абагаціць яе неабходным дыдактычным матар'ялам, энергічна ўзяўся за павышэнне сваей кваліфікацыі, разумеючы, што без гэтага ен не зможа сення стаць цэнтральнай фігурай педагагічнага працэса. Выраслі дзесяткі і сотні сапраўдных майстраў педагагічнага працэса, сапраўдных ударнікаў і энтузіястаў савецкай школы, якія на ўсебеларускім з'ездзе настаўнікаў-ударнікаў абмяняліся вопытам і прадэманстравалі сваю работу.

Мы маем рост паспяховасці і ведаў вучняў. Агульны процант паспяховасці па БССР узняўся да 92. Ён нас абсалютна не здавальняе, але гаворыць аб нязухільным руху наперад у галіне ліквідацыі «карэннага недахопу» школы.

Мінулы навучальны год, пры павышаных запатрабаваннях настаўніка да ведаў вучняў, характэрны зніжэннем другагодніцтва. Найбольш прыемнаю з'явай трэба лічыць павелічэнне колькасці паспяваючых па ўсіх прадметах. Есць зрух і ў барацьбе за граматнасць вучняў.

Мабілізацыя ўвагі настаўніцтва вакол гэтых пытанняў дала свае станоўчыя вынікі, хоць далека яшчэ недастатковыя. Нельга не адзначыць, што, у рэзультаце перагляду сеткі узорных школ па кожнаму раёну, удалося дасягнуць неабходнага пералому як у адносінах да узорных школ, так і ў палепшанні якасці работы гэтых вядучых звенняў, абавязаных даваць сапраўдныя узоры работы школы і настаўніка. Увесь гэты працэс адбываўся на фоне ўзрослай матар'яльнай базы школы. У мінулым годзе ўступіла ў строй 206 школьных памяшканняў, было прыстасавана пад школы да 500 былых кулацкіх дамоў, фонд прышкольных участкаў узрос з 2 да 18 тыс. га, з іх зняты нядрэнны ўраджай.

Аднак, поспехі школ Беларусі далёка яшчэ не адказваюць запатрабаванням, пастаўленым партыяй і урадам перад школай. Трэба проста сказаць, што работа школы паляпшаецца надзвычай марудна і ў радзе выпадкаў яшча не адпавядае узрослай матар'яльнай базе. Мы яшчэ слаба ўяўляем сабе сапраўдны стан і патрэбнасці школы, вялікім спазненнем выяўляем іх. Многія аддзелы народнай асветы часта не ведаюць сапраўднай колькасці настаўнікаў і вучняў, не ведаюць жывых людзей, рэдка заглядаюць у школу, мала ўважлівы к цэнтральнай фігуры школы—настаўніку. Многія раены часта бамбардыруюць Наркамасветы, крычаць аб недахопе выкладчыцкіх кадраў і ў той-жа час з выключнай нядбайнасцю выкарыстоўваюць наяўныя кадры. Маюць месца факты, калі настаўнікі з вышэйшай асветай працуюць выкладчыкамі малодшых класаў, а ў сярэдняй школе ёсць яшчэ выкладчыкі, якія не маюць вышэйшай адукацыі.

У Камарынскім раене «клопаты» аб настаўніку, аб замацаванні яго на рабоце выразілася у «планавай» перакідцы да 30 проц. настаўнікаў раена. У Касцюковіцкім раене гора-кіраўнікі думалі перакінуць 80 проц. настаўніцкага складу. Не мала было фактаў парушэння матар'яльна-прававога становішча настаўніцтва. Дарэмна сказаць, што патрабавалася рашучае умяшанне ЦК КП(б)Б, СНК БССР і ўпаўнаважанага камісіі савецкага кантроля, каб прымусіць рад раенаў ліквідаваць запазычанасць па зарплаце настаўнікам.

Адсюль у значнай меры штучнае стварэнне дадатковых цяжкасцей у педагагічных кадрах, у іх правільным размяшчэнні, недапушчальныя факты перабежкі настаўнікаў з раёна ў раён, пераманьванняў, з якімі Наркамасветы прыходзіцца рашуча змагацца.

З усёй рэзкасцю трэба падкрэсліць безадказныя адносіны рада раёнаў (Лельчыцы, Чашнікі, Гомель, Магілеў, Крупкі і інш.) да павышэння кваліфікацыі настаўніцтва. Гэтыя раёны не толькі сарвалі пасылку настаўнікаў на кароткатэрміновыя курсы, але нічога не зрабілі для таго, каб ахапіць некваліфікаванае настаўніцтва завочным навучаннем, падрыхтаваць для здачы іспытаў за курс сярэдняй школы.

Паасобныя раёна і нават дырэктары школ часам разважаюць: «Падрыхтоўка кадраў нас не датычыць; іх рыхтуе Наркамасветы, які і павінен даць настаўнікаў». Такія «кіраўнікі» крычаць аб кадрах, але самі не дапамагаюць настаўніку павысіць кваліфікацыю, не правяраюць, як ён працуе над сабой.


Задача савецкага настаўніка—узяцца за сістэматычнае, паглыбленае павышэнне сваёй кваліфікацыі. Некваліфікаваная частка настаўніцтва ў першую чаргу павінна зразумець, што без адпаведнай адукацыі яна не можа задаволіць запатрабаванні школы, з усімі выцякаючымі адсюль вынікамі.

Недапушчальна адстае наша школа ў выкананні праграмнага матэрыялу, асабліва па мове, літаратуры, гісторыі і геаграфіі. Аб гэтым гавораць даныя выбарачнага агляду, рэзультаты вясенніх іспытаў, метадычныя дакументы, апрацаваныя і выданыя Наркамасветы і Навукова-даследчым інстытутам педагогікі. Нас зусім не здавальняе ступень культуры пісьма і мовы вучняў, ступень аўладання іншымі дысцыплінамі. Частка настаўнікаў недастаткова працуе над сабой, слаба рыхтуецца к лекцыі, а часам падмяняе сапраўдную барацьбу за павышэнне ведаў дзяцей ліберальнымі адносінамі і очкаўцірацельствам.

Узяць хоць-бы такі прыклад. Чырвонапольскі раён у мінулым годзе прадставіў Наркамасветы даныя аб 100 проц. паспяховасці вучняў у першым паўгоддзі, тым часам вынікі навучальнага года і вясеннія іспыты паказалі, што веды значнай часткі вучняў па асноўных прадметах зусім нездавальняючыя. Падобныя факты очкаўцірацельства былі ў Зембінскай школе, Барысаўскага раёна, у радзе менскіх школ і т. д.

Органы народнай асветы, дырэктары і загадчыкі школ не зрабілі яшчэ ўсіх неабходных вывадаў з рашэнняў XVII партыйнага з'езда. Многа видзецца гутарак аб рэарганізацыі, а па сутнасці метады кіраўніцтва школай амаль не змяніліся ў радзе месц, як быццам указанні тав. Сталіна аб чэсных балбатунах, зазнаўшыхся вяльможах, парушальніках партыйнай і савецкай дысцыпліны не маюць ніякага дачынення да органаў і ўстаноў народнай асветы.

Пры разглядзе ў Наркамасветы сеці школ загадчыкі гомельскага, чашніцкага, прапойскага і іншых раёна паказалі поўнае няведанне жывых людзей. Паўстае пытанне: як-жа яны кіруюць школай, калі забыліся, што поспех справы вырашаюць жывыя людзі, якіх трэба ведаць, якімі трэба кіраваць, правяраючы іх работу, правільна расстаўляючы іх? Адзначаныя недапушчальныя правы на паасобных участках работы школы з усёй нагляднасцю сведчаць аб тым, што органы Наркамасветы недастаткова аперацыйна кіравалі школай.



Перад органамі Наркамасветы, дырэктарамі і загадчыкамі школ стаіць важнейшая задача—безадкладна наладзіць сістэматычную праверку таго, як выконваюцца рашэнні партыі і ўрада аб школе, каб папярэдзіць і выправіць усе заўважаныя недахопы.

Майскія пастановы ЦК і СНК Саюза аб школе—канкрэтная праграма арганізацыйнай перабудовы школы і органаў Наркамасветы. Яны нанеслі рашучы удар лявацкім «пражэктерам», якія цягнулі школу на шлях выхавання няграматных манекенаў, замест патрэбных краіне будуючагася соцыялізма усебакова развітых і культурных людзей. Гэтыя рашэнні разгромілі спробы правых і «левых» апартуністаў сказіць палітыку партыі ў галіне школьнага будаўніцтва, яны з'явіліся баявою праграмай падрыхтоўкі школ да новага навучальнага года, якая пачалася раней і прайшла больш арганізавана і лепш, чым у мінулыя гады. У рэзультаце мабілізацыі ўвагі пролетарскай грамадскасці, праведзенага конкурса сельсоветаў на лепшую падрыхтоўку школ, конкурса шэфаў-прадпрыемстваў, саўгасаў і МТС непамерна вырасла ўвага к совецкай школе, клопаты аб яе патрэбах.

Рабочы актыў і кіраўніцтва такіх перадавікоў-шэфаў, як менскі машынабудаўнічы завод імя Варашылава, менскі эльвод, бабруйскі лясны камбінат на справе паказалі, як трэба змагацца за рэалізацыю дырэктыў партыі і ўрада аб школе. Падшэфныя школы гэтых прадпрыемстваў к 15 жніўня былі не толькі адрамантаваны, але і даабсталяваны палітэхнічнымі, наглядным і іншымі дапаможнікамі, папоўнена і адрамантавана класная мэбля, створана база для гарачых снеданняў.

Конкурс ЦВК ушчыльнуў сотні сельсоветаў у канкрэтную падрыхтоўку да навучальнага года. Перадавікі вялікай справы Ермакоўскі сельсовет Оршанскага раёна (старшыня т. Межуеў), Меркулаўскі сельсовет, Рагачоўскага раёна, Гажанскі сельсовет, Пропойскага раёна, Густарскі сельсовет, Клімавіцкага раёна і рад іншых датэрмінова закончылі усю падрыхтоўчую работу. Школы і мэблю адрамантавалі, зрабілі гадавы запас паліва, своечасова ўбралі ўраджай з прышкольных участкаў, выкупілі поўнасцю падручнікі, пісьмовыя прылады і дапаможнікі.

Дзесяткі і сотні калгасаў па прыкладу шэфаў-прадпрыемстваў па-бальшэвіцку праявілі клопаты аб школе. Вось перадавыя калгасы: «Чырвоныя Гарбацэвічы» Ермакоўскага с.-с., «Комунар»—Якаўлевіцкага с.-с., «Рэволюцыя» Пропойскага с.-с., «Росквіт» Осіповіцкага раёна, «Чырвоная Украіна»—Гадзенскага с.-с., Камарынскага раёна і т. д.

Грамадскасць рада раёнаў мабілізавала сотні тысяч рублёў на падрыхтоўку да навучальнага года. Слуцкі раён мабілізаваў звыш 300,000 руб., Бабруйскі 200 000 руб. і т. д. Прыкладам правільнага разумення рашэнняў XVII партыйнага з'езда аб значэнні арганізацыйнай работы, умення па-бальшэвіцку ажыццяўляць адзінаначалле і адказнасць за падрыхтоўку школ да навучальнага году могуць служыць рад дырэктароў і загадчыкаў школ. Разам з перадавікамі шэфамі, сельсоветамі і раёнамі павінны быць вядомы краіне: тав. **Дзятко**—дырэктар 13 Менскай школы, тав. **Ераменка**—дырэктар Осіповіцкай школы, тав. **Асташкевіч**—дырэктар Рагачоўскай 4-й школы, тав. **Тіханаў**—дырэктар Віцебскай 22-й чыг. школы, тав. **Шынгароў**—дырэктар Камарынскай школы, тав. **Шылінгоўскі**—дырэктар Брагінскай школы, тав. **Мухін**—дырэктар 12-й Полацкай школы, тав. **Коршук**—дырэктар Урэцкай узорнай школы, тав. **Кандыбовіч**—дырэктар Віцебскага інстытута.

Папярэднія рэзультаты падрыхтоўкі да новага навучальнага года паказваюць, што Полацкі, Клімавіцкі, Рагачоўскі і Слуцкі раёны з поўным правам могуць быць названы перадавымі. Добрыя паказчыкі маюць гор. Менск, Віцебск, Орша. З першага дня заняткаў вучні мелі добра адрамантаванае памяшканне, мэблю, дастатковую колькасць падручнікаў і пісьмовых прылад, гарачыя сытыя снеданні і падрыхтаванага к заняткам педагога.

Гэтыя поспехі ёсць рэзультат увагі і аперацыйнай дапамогі школе мясцовых партыйных і советскіх органаў.

Аднак цэлы рад раёнаў і сельсоветаў, дырэктароў і загадчыкаў школ недаацанілі значэння баявой падрыхтоўкі школ да навучальнага года, указанняў ЦК КП(б)Б і СНК БССР па гэтаму пытанню. Бялыніцкі, Крупскі, Чавускі, Смалявіцкі, Уваравіцкі, Бешанковіцкі, Лезненскі, Сіроцінскі, Багамольскі, Плешчаніцкі пры розных з іншымі раёнамі умовах не стварылі школам належных умоў для нармальнай работы, абсалютна не займаліся адпаведна да падрыхтоўкі матэрыяльнай базы нацыянальных школ.

Агульныя даныя гавораць, што не менш 70 проц. усіх школ БССР было ахоплена рамонтам. Аднак, к пачатку навучальнага года ў адзначаных вышэй раёнах рамонт недапушчальна зацягнуўся.

З капітальным будаўніцтвам недапушчальны прарыў. Са 170 пераходзячых аб'ектаў і новапабудоў па 30 раёнах у эксплаатацыю уступіла толькі 87 школ. Гомель сарваў будаўніцтва рускай школы. У Касцюковіцкім, Крычаўскім, Гарадоцкім, Сіроцінскім, Заслаўскім, Гомельскім раёнах займаліся «падфарбоўкаю» школьных памяшканняў звонку і знутры, забыўшы пра такія «дробязі», як рамонт акон, дзвярэй, труб і т. д.

Забяспечыць усе школы паліvам не здолеў ні адзін, нават з лепш падрыхтаваных раёнаў. Заслаўскі, Гомельскі, Менскі раёны не прыступалі к вывазцы паліва, асабліва для сельскіх школ. Кіраўнікам раёнаў, дырэктарам школ, старшыням сельсоветаў трэба памятаць, што ўрад і партыя не дазволяць сарваць заняткаў з-за адсутнасці паліва. Прарыў у гэтай галіне трэба безадкладна ліквідаваць.

У гэтым годзе больш арганізавана праходзіла выданне і праходжанне падручнікаў. К 1 верасня ў раёны завезена падручнікаў на 3 млн. рублёў. Нельга не адзначыць, што некаторыя падручнікі, як буквар Сіўко, руская хрэстаматыя Каркашэўскай, граматыка Бязлепкіна і Северцавай маюць тэхнічныя памылкі і недахопы ў матэрыяле. ДВБ зацягвала дасылане падручнікаў, якія выйшлі ў мінулым годзе невялікімі тыражамі. Ужо зараз ёсць прарыў у забяспечанні падручнікамі моцна выраслых 8, 9 і 10 класаў.

Тармозяцца нармальныя заняткі ў радзе нацменаўскіх школ (польскіх, украінскіх), якія не забяспечаны падручнікамі.

Агромная колькасць падручнікаў, выпушчаных і завезеных у гэтым годзе, патрабавала не толькі бюджэтных асігнаванняў, але і шырокай мабілізацыі сродкаў грамадскасці, што дало каля 2.500.000 руб. Да гэтага часу не выкупілі ўсіх падручнікаў Дуброўна, Крупкі, Чашнікі.

Пісьмовымі прыладамі школа забяспечана на 6—7 месяцаў. Нармальнай працы школ пагражаюць безадказныя адносіны рада аддзелаў БАКТ да забяспечання школ палітэхнічным абсталяваннем і нагляднымі дапаможнікамі. Як правіла, у раёны завозіцца некамплектнае абсталяванне, заяўкі раёнаў не выконваюцца. Трэба сказаць, што

БАКТ з гэтым проста не спраўляецца, нават у межах бюджэтных асігнаванняў (5 млн. руб.).

Праграмы ў гэтым годзе разгружаны ад лішняга і недаступнага матар'ялу, забяспечана поўная магчымасць усваяемасці і замацавання прапрацоўваемага матар'ялу, павышэння індывідуальнай адказнасці дырэктара і кожнага педагога за працу.

Наша адказная задача—разгарнуць далейшую барацьбу за абсалютную граматнасць вучняў, за культуру мовы, за добры почарк, за культурныя адносіны дзетвары да работы і рэчаў. Вырашэнне яе цалкам ляжыць на кіраўніку школы, на настаўніку.

Барацьба за культуру (ад дробных да буйных пытанняў), за чыстату, за абсалютны парадак, за далейшае ўмацаванне школьнага рэжыма— такава актуальнейшая задача.

Простым зрывам рашэнняў партыі і ўрада з'яўляецца тое, што ДВБ не выканала выдавецкага плана па белетрыстыцы і занятнаму пытанню для масавай школы. Друкаванне падручнікаў заканчваецца, таму ДВБ мае поўную магчымасць пераключыцца на выданне так патрэбнай школе дзіцячай літаратуры.

Рост сеці школ выклікаў вялікі размах падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў. Праз летнія курсы перападрыхтоўкі павысіла сваю кваліфікацыю 1105 настаўнікаў, якія перакінуты ў старэйшыя класы. Павысілі кваліфікацыю 1050 настаўнікаў сярэдняй школы. Спецыяльныя курсы перападрыхтоўкі выкладчыкаў гісторыі і геаграфіі ахапілі 497 чалавек. Для ўзбагачэння вопытам і ведамі 100 лепшых настаўнікаў-ударнікаў былі накіраваны ў экскурсіі па СССР.

Аднак, к пачатку навучальнага года не хапае 320 настаўнікаў, галоўным чынам славеснікаў і гісторыкаў, у сувязі з павелічэннем гадзін па гэтых прадметах. Перад Наркамасветы і яго органамі стаіць адказнейшая задача літаральна ў некалькі дзён вырашыць пытанне аб дадатковых кадрах, рашуча ліквідуючы факты безадказнага выкарыстання настаўнікаў, беспадстаўных перакідак і перамалёўвання іх, што мае месца у Брагінскім, Мсціслаўскім, Сіроцінскім і інш. раёнах.

Гэты год павінен быць апошнім і рашучым годам у справе ліквідацыі «карэннага недахопу».

Тав. Сталін на XVII з'ездзе партыі гаварыў, што так званыя аб'ектыўныя ўмовы звяліся к мінімуму, тады як роля нашых арганізацый і іх кіраўнікоў стала рашаючай і выключнай. А што гэта значыць? Гэта значыць, што адказнасць за нашы прарывы і недахопы ў рабоце на дзевяць дзесятых кладзецца цяпер не на аб'ектыўныя ўмовы, а на нас саміх і толькі на нас.

Усе работнікі народнай асветы, зверху да нізу, павінны канчаткова перайсці на рэйкі канкрэтнага кіраўніцтва, аперацыйных рашэнняў, заснаваных на дэтальным веданні справы. Кожны дырэктар, кожны выкладчык павінен узмацніць асабістую адказнасць. Трэба навучыць нашага дырэктара і загадчыка школы ўмець па-бальшэвіцку спалучаць цвёрдае адзінаначалле ў ажыццяўленні рашэнняў партыі і ўрада з грамадскай дапамогай, бальшэвіцкай крытыкай і самакрытыкай ва ўсёй сваёй рабоце. Трэба наладзіць сістэматычную праверку таго, як выконваюцца ўсе рашэнні аб школе, павышаючы гэтым персанальную адказнасць кожнага работніка за даручаную яму справу.

Дырэктар і загадчык школ павінны стаць фігурай, роўнацэннай з дырэктарам завода, соўгаса, старшынёю калгаса.

Совецкі настаўнік—цэнтральная фігура педагагічнага працэса. Выкарыстоўваючы ўсю паўнату праў і абавязкаў, з поўным усведамленнем сваеи адказнасці, совецкі педагог павінен узяцца па-ўдарнаму за якаснае палепшанне выкладання, за комуністычнае выхаванне дзетвары. Совецкі педагог павінен быць агорнут штодзенным клопатам і ўвагаю ўсёй нашай грамадскасці. Не павінны мець месца факты агідных адносін да настаўніка, якія былі ў Лёзненскім, Плешчаніцкім, Бабруйскім і інш. раёнах.

Совецкі настаўнік зможа справіцца са сваімі задачамі толькі ў няўтомнай рабоце па павышэнню свайй кваліфікацыі. Абавязак загадчыка АНА, дырэктара школы—арганізаваць вучобу некваліфікаваных настаўнікаў, забяспечыць іх падручнікамі, наладзіць кансультацыю сіламі кваліфікаваных настаўнікаў, сістэматычна правяраць работу настаўніка над сабой. Абавязак органаў Наркамасветы, падінстытутаў, педтэхнікумаў і інстытутаў павышэння кваліфікацыі—пакончыць з безадказнай пастаноўкай завочнага навучання.

Бібліятэчнае кіраўніцтва і бібліятэкі на месцах павінны арганізаваць настаўніку дапамогу кнігай, асабліва па мове, літаратуры, гісторыі, геаграфіі. Трэба неадкладна стварыць сець бібліятэчных перасовак спецыяльна для настаўніка. Гэта—справа Дзяржаўнай бібліятэкі і бібліятэк буйнейшых гарадоў. Кожны дырэктар і загадчык школы павінны наладзіць забяспечанне настаўнікаў школы патрэбнай літаратурай.

Асаблівую ўвагу ўсяго настаўніцтва, Наркамасветы і яго органаў павінна прыцягнуць пастаноўка выкладання мовы, літаратуры, гісторыі, каб рашуча ліквідаваць недапушчальнае адставанне і скажэнне ў выкладанні гэтых важнейшых дысцыплін. Веды вучняў не могуць быць прызнаны здавальняючымі, як і сама работа настаўніка любой дысцыпліны, калі вучань піша няграматна, калі ён не ўладае мовай. Пісьмовыя работы кантрольнага характару павінны быць уведзены па кожнаму прадмету, як дадатковы кампанент для ацэнкі ведаў вучня, як дакумент, характарызуючы работу настаўніка.

Высокаякаснае і поўнае выкананне навучальных праграм па кожнаму прадмету—дзяржаўны абавязак кожнага дырэктара, кожнага педагога. Трэба раз і назаўсёды пакончыць з антыдзяржаўнымі тэндэнцыямі ў выкананні праграм, як гэта было ў Магілеўскай чыгуначнай, у менскіх і радзе іншых школ. Кожны дырэктар школы і настаўнік павінны зразумець, што якаснае і поўнае выкананне праграм роўнасільна выкананню промфінплана, што гэта—дзяржаўная справа, невыкананне якой ператвараецца ў дзяржаўнае злачынства.

Някепскі ўраджай, зняты з прышкольных участкаў, павінен, пасля засыпкі насенных фондаў, пайсці на гарачыя снеданні (80 проц.) і на палепшанне снабжэння настаўнікаў (20 проц.).

Арганізацыя гарачых снеданняў у кожнай школе, інтэрнатаў—стымулы замацавання вучняў у школах. Кожны дырэктар і загадчык школы з першых дзён заняткаў павінен павесці моцную барацьбу з адсевам.

У мінулым навучальным годзе Наркамасветы наладзіў жывую сувязь з паасобнымі школамі і настаўнікамі. Цяпер яна павінна яшчэ больш узмацніцца. У Наркамасветы кожны дзень паступаюць многа заяў ад настаўнікаў, кіраўнікоў школ. Большасць піша аб сваіх патрэбах. Гэта не кепска. Але, на жаль, мала такіх дырэктароў школ і настаўнікаў, якія-б ставілі перад Наркамасветы пытанні вытворчага па-

радку: аб праграме, падручніку, методыцы, выхаваўчай рабоце. Наркамасветы ў гэтым годзе рашыў выдаваць бюлетэнь, каб кожная школа і настаўнік мелі магчымасць хутка арыентавацца ў бягучых пытаннях школьнай палітыкі і практыкі. Намячаецца рад арганізацыйных мер: выданне новага статута, перавод школы на самастойны бюджэт.

Перад Наркамасветы, Навукова-даследчым інстытутам педагогікі, райана стаіць задача — ужо з пачатку года узяцца за праверку пастаноўкі вучэбнай справы, за вывучэнне паасобных працэсаў работы і канкрэтную дапамогу школе.

Высока трымаючы сцяг пралетарскага інтэрнацыяналізма, рашуча змагаючыся са спробамі нацдэмаўскага ахвосця і іншых класавых ворагаў выкарыстаць школу ў сваіх мэтах, праводзячы ленінскую нацыянальную палітыку у школе, совецкае настаўніцтва Беларусі, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, абавязана ажыццявіць і ажыццявіць гістарычнае рашэнне партыі і ўрада аб пабудове сапраўднай школы Маркса—Леніна Сталіна дастойнай сваёй вялікай эпохі, сваёй вялікай соцыялістычнай радзімы.

Чырвонасцяжнае настаўніцтва БССР павінна па-большэвіцку змагацца за высокае права узнагароды Беларусі ордэнам Леніна не толькі ў галіне эканомікі, але і культуры.

Г. Чорны

ПЫТАННІ ПЛАНА І ПЛАНАВАННЯ

Месца плана і планавання ў соцыялістычнай гаспадарцы

Калі ўяўленне аб капіталістычнай гаспадарцы перш за ўсё звязваецца з яе анархічнасцю, разрозненасцю паасобных галін і прадпрыемстваў, хоць і звязаных паміж сабою рынкам у форме вастрэйшай канкурэнтнай барацьбы, у пагоні кожнага капіталістычнага прадпрыемца за больш высокай нормай прыбытку, метадам самай жорсткай эксплёатацыі рабочага класа, што абумоўлена інстытутам прыватнай уласнасці, — то савецкую соцыялістычную гаспадарку немагчыма сабе ўявіць без плана і планавасці, без адзінага арганізуючага і накіроўваючага цэнтра—дыктатуры пролетарыята і яго ленінскай партыі.

Агромныя поспехі соцыялістычнага будаўніцтва ў рэзультаце выканання першай пяцігодкі, якія абумовілі сабою гістарычныя рашэнні XVII з'езда ВКП(б) аб пабудове к канцу 2-й пяцігодкі бяскласавага грамадства, пацвярджаюць выключныя перавагі савецкай соцыялістычнай гаспадарчай сістэмы, як арганізаванай планавай.

Таму рост і развіццё соцыялістычнай гаспадаркі нашай краіны суправаджаецца ўсё ўзрастаючай роляю і значэннем планавага пачатку, планавай работы і планавых органаў у народнай гаспадарцы,— што, зразумела, ускладае яшчэ большую адказнасць на планавыя органы і планавых работнікаў.

Планавая работа вядзецца на навуковых, марксісцка-ленінскіх пачатках.

Навуковыя асновы соцыялістычнага плана і планавання распрацаваны Леніным, прадоўжаны і развіты ў тэорыі і на практыцы тав. Сталіным.

Калі прасачыць гісторыю барацьбы за умацаванне дыктатуры пролетарыята, за будаўніцтва соцыялізма ў нашай краіне, то на ўсіх этапах гэтай барацьбы мы выявілі, што план, планавыя органы і планаванне былі улюбёнымі участкамі, куды забіраліся яўныя і скрытыя ворагі рабочага класа, прадстаўнікі агентуры закардоннай контррэволюцыі, шкоднікі ўсіх масцей - ад промпартыі да меншавіцкага цэнтра— Рамзіны, Кандрацьевы, Громаны, Базаравы і т. п.

Апартуністычныя элементы ў партыі — правыя, „левыя“, трацкісты— развівалі свае „канцэпцыі“ ў галіне тэорыі і практыкі планавання.

Участак нашай планавай работы—арэна жорсткай класавай барацьбы і цяжка знайсці такое пытанне планавання, вакол якога не адбывалася-б класавая барацьба—адкрытая і скрытая.

Вакол пытанняў планавання тэмпаў, размяшчэння прадукцыйных сіл, планавання калектывізацыі, таваразвароту і цэн, зарплаты, крэ-

дыту і грашовага звароту, падрыхтоўкі кадраў, навукова-даследчай работы і т. д. Ішла і ідзе жорсткая класавая барацьба.

Вось чаму патрэбна выключная пільнасць і ўзброенасць марксісцка-ленінскай-сталінскай тэорыяй соцыялістычнага планавання, каб своечасова выкрыць усякага роду спробы класавага ворага перашкодзіць на планавым фронце соцыялістычнаму будаўніцтву.

* * *

Гісторыя барацьбы за соцыялістычную Беларусь, з ворагамі Савецкай Беларусі, з яўнымі і скрытымі прадстаўнікамі і агентамі інтэрвенцыяніскай контррэволюцыі налічвае не мала старонак подлай шкодніцкай работы, выкрытай у планаванні, у планавых органах БССР.

*Давол*і ўспомніць шкодніцтва, выкрытае ў Дзяржплане БССР у 1931 годзе, прышчэпаўшчыну,—шкодную арганізацыю ў Наркамземе, выкрытую ў 1933 годзе, контррэволюцыйную нацдэмаўшчыну, а таксама вялікадзяржаўніцкія вылазкі ў пытаннях плана і планавання народнай гаспадаркі БССР, каб стала ясна, якое значэнне нашы ворагі прыдавалі і прыдаюць плану і планаванню, як важнейшым участкам народнай гаспадаркі.

Найбольш наглядна шкодніцкая дзейнасць сказалася ў галіне капітальных укладанняў, капітальнага будаўніцтва.

Асноўная мэта класавага ворага і яго агентуры заключалася ў тым, каб амярцвіць найбольшую долю сродкаў капітальных затрат, звесці на нішто ўсе намаганні па будаўніцтву, і—у якасці мінімума—звесці эфектыўнасць і рацыянальнасць капіталаўкладанняў да самых нізкіх паказчыкаў.

Усё гэта, вядома, павінна было затрымаць тэмпы нашага будаўніцтва, затрымаць рух БССР уперад па шляху соцыялізма.

Для дасягнення гэтых мэт прымяняліся і выкарыстоўваліся, у залежнасці ад сітуацыі, мінімалісцкія правапартуністычныя і максімалісцкія „левацкія“ трацкісцкія праектыроўкі.

Мінімалісцкія праваапартуністычныя праектыроўкі самі па сабе выключалі неабходныя аб'ёмы і тэмпы развіцця будаўніцтва гаспадаркі, што было проста на руку шкоднікам і агентуры класавага ворага, паколькі забяспечвала немінучае адставанне і слабасць краіны перад узброеным да зубоў капіталістычным светам.

Максімалісцкія, трацкісцкія „левацкія“ праектыроўкі служылі шырмаю, прыкрыццем для шкодніцкага размеркавання сродкаў на мноства аб'ектаў, адначасова пачынаўшыхся будаўніцтвам, з такім разлікам, каб расцягнуць будаўніцтва на працяглыя перыяды і гэтым амярцвіць капіталы. Гэты метад прымяняўся амаль ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі і асабліва ў галіне соцыяльна-культурнага і комунальна-жыллёвага будаўніцтва. Іменна гэтай акалічнасцю ў значнай меры трэба тлумачыць тое, што ў БССР мы маем параўнальна большыя аб'ёмы пераходнага, незакончанага будаўніцтва ад першай пяцігодкі да другой і нават яшчэ ад 1933 года на 1934 г. Значная частка гэтых аб'ектаў пачата будаўніцтвам яшчэ ў 1931, 1930, 1929 і нават 1928 гадах.

І замест таго, каб размеркаваць сумы на меншую колькасць аб'ектаў з такім разлікам, каб забяспечыць завяршэнне найбольшай іх колькасці, сродкі механічна размяркоўваліся паміж усімі або мноствам аб'ектаў, што не забяспечвала заканчэння ні аднаго. Усе гэтыя факты сведчаць аб адсутнасці канкрэтнага кіраўніцтва і няведанні фактычнага становішча спраў будаўніцтва як у радзе цэнтральных, так і раённых арганізацый.

Але шкодніцтва і скажэнні ў галіне планавання капітальнага будаўніцтва не вычэрпваюцца прыведзенымі фактамі, і не толькі ўчасткам капітальнага будаўніцтва. Планаванне вытворчасці, сельскай гаспадаркі і інш. былі такстіма ўчасткамі, дзе шкоднікі пад прыкрыццём апартуністычных элементаў тварылі сваю подлую справу.



Практыка шкодніцтва адлюстроўвала адпаведныя тэарэтычныя палажэнні, вынікала з пэўнай мэтавай устаноўкі. І калі гэтыя мэтавыя ўстаноўкі раскрываліся толькі пазней (хоць усім вядома, якія мэты ставілі і ставяць ворагі соцыялістычнага будаўніцтва і совецкай краіны — аднаўленне капіталізма), то рэштаў атарскія тэарэтычныя палажэнні з выглядам метадалагічных разважанняў аб плане і планаванні, аб заканамернасцях развіцця совецкай гаспадаркі ізлагаліся адкрыта ў пасобных манаграфіях і журнальных артыкулах (Кандрацьеў, Юроўскі, Осадчы, Базараў, Громан і т. п.).

Рамкі журнальнага артыкула не дазваляюць нам разгледзець пабудаванні ў галіне тэорыі і метадалогіі планавання прадстаўнікоў розных груп варожага і антысовецкага лагера, а роўна і тэорыі правых, „левых“ і трацкістаў у галіне планавання. Але што найбольш характэрна ва ўсіх буржуазна-шкодніцкіх канцэпцыях, гэта—трактоўка плана незалежна ад дыктатуры пролетарыята, адцягваючыся ад такой „дробязі“, як наяўнасць у СССР зусім адметных ад капіталізма законаў развіцця народнай гаспадаркі, асновай якіх з'яўляецца дыктатура пролетарыята, або сцвярджанне, што ў совецкай гаспадарцы дзейнічаюць законы рынку і вартасці, уласцівыя капіталізму, або што совецкая гаспадарка развіваецца на аснове эмпірычных заканамернасцей, г. зв. вонкагна устаноўленых статыстычных адносін асноўных галін гаспадаркі—прамысловасці і сельскай гаспадаркі, адносін, якія скláліся ў дарэволюцыйнай Расіі і працягваюць планаваць і вызначаць шляхі развіцця народнай гаспадаркі СССР.

На аснове такіх тэарэтыка-метадалагічных прадпасылак і развіваліся трактоўкі плана з пункту погляду генетыкі, прагноза і прадбачання або прасцей кажучы, што план на аснове ўліку дарагога і блізкага буржуазным рэстаўратарам і шкоднікам мінулага, змог прадбачыць жаданае для іх будучае і зафіксаваць гэта ў лічбах і заданнях.

Але, як вядома, гэтыя псеўда-тэарэтычныя пабудаванні былі выкрыты партыяй і яе нязменным правадыром і тэарэтыкам тав. Сталіным так сама, як практыка шкодніцтва выкрывалася і выяўлялася сустрэчнымі планамі, крытыкай самых рабочых і працоўных мас.

У нашай эканамічнай літаратуры доўгі час мела свабоднае хаджэнне антыленінская трактоўка заканамернасцей развіцця нашай гаспадаркі і сутнасці плана, выходзіўшыя з-пад пяра і членаў партыі.

Я маю на ўвазе не славуты трацкісцкі „закон першапачатковага соцыялістычнага накаплення“ Прэабражэнскага і яго разнавіднасці, або праваапартуністычную, механістычную трактоўку марксавай тэорыі вартасці, як вечнага „закона працоўных затрат“, дзеючага і пры соцыялізме, хоць і ў „іншым гарнітуры“ і т. п.

Справа ідзе аб тых аўтарах, якія хоць і крытыкавалі трацкісцкія і праваапартуністычныя трактоўкі заканамернасцей і сутнасці плана

ў совецкай гаспадарцы, аднак самі сцвярджалі, што асноўным законам совецкай гаспадаркі з'яўляецца план, аб'ектыўна дзеючы па аналогіі са стыхійным законам вартасці ва ўмовах капіталізма. Тым часам, план з'яўляецца толькі выражэннем эканамічнай палітыкі дыктатуры пролетарыята. План выступае ў ролі сродку дыктатуры пролетарыята і сродку класавай барацьбы, накіраванага, у залежнасці ад канкрэтных асаблівасцей кожнага этапа нашага будаўніцтва, на абмежаванне, выцясненн , ліквідацыю кулацтва і капіталістычных элементаў, на пабудову бяскласавага социялістычнага грамадства.

План будуецца на аснове пэўнай мэтавай установкі і дырэктыў партыі і з'яўляецца абавязковым для выканання, патрабуе мабілізацыі і арганізацыі шырокіх мас працоўных на барацьбу за яго выкананне для дасягнення пастаўленых партыяй і рабочым класам мэт па пабудове бяскласавага социялістычнага грамадства.

Кіруючым і плануючым органам з'яўляецца ЦК нашай партыі і вышэйшыя органы совецкай улады—ЦВК і СНК.

Задачы планавай сістэмы

Задачы, пастаўленыя XVII з'ездам ВКП(б), атрымалі сваё выражэнне ў зацверджаным плане 2-й пяцігодкі. План другой пяцігодкі стаў сцягам барацьбы працоўных мас за дасягненне мэт, пастаўленых XVII з'ездам, за завяршэнне социялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі, за паляпшэнне матэр'яльна-бытавых умоў працоўных, за ліквідацыю астаткаў капіталізма у эканоміцы і свядомасці людзей, за пабудову бяскласавага грамадства.

План другой пяцігодкі БССР прадугледжвае аб'ем будаўніцтва і мерапрыемстваў, што вынікаюць з рашэнняў XVII з'езда прыстасоўна да ўмоў і асаблівасцей нашай рэспублікі, як часткі Совецкага саюза.

У дакладзе тав. Куйбышэва на XVII з'ездзе былі акрэслены ў агульнай форме тыя асноўныя задачы, якія стаяць перад кожнай рэспублікай, краем і областцю, у тым ліку і перад БССР.

„Важнейшай задачай 2-й пяцігодкі БССР з'яўляецца рэзкае паляпшанне паліўнага баланса рэспублікі ў напрамку павышэння долі мясцовых відаў паліва, у прыватнасці торфу. Торф з'явіцца асноўнай паліўнай базай электрастанцый рэспублікі.

Развіваючаеся машынабудаўніцтва захоўвае сваю спецыялізацыю на сельскагаспадарчым і агульным машынабудаўніцтве і на абслугоўванні патрэбнасцей рэспублікі ў рамонце абсталявання.

У галіне хімічнай прамысловасці прадугледжваецца арганізацыя новых вытворчасцей, у прыватнасці торфа-хіміі.

Наяўнасць буйнай сыравіннай базы ставрае спрыяючыя ўмовы для развіцця лёгкай прамысловасці, цэнтральнае месца ў будаўнічай праграме гэтай галіны у другім пяцігоддзі займае ільнаапрацоўка.

Па папяровай прамысловасці другое пяцігоддзе выраšае задачу асваення ўжо наяўных вытворчых магутнасцей для павелічэння выпуску паперы з 28,7 тыс. тон да 54,1 тыс. тон.

Тэхнічнае пераўзброенне сельскай гаспадаркі ўмацоўвае ільнаводную базу БССР і адначасова дазваляе шырока развіць рад іншых культур.

Важнейшай задачай з'яўляецца шырокае развіццё прадукцыйнай жывёлагадоўлі з асобым ростам яе хуткаспелых відаў".

Прыведзеныя ў дакладзе тав. Куйбышэва задачы, у якасці асноўных, указваюць на вядучыя звенні плана і не вычэрпваюць сабой усяго аб'ёма будаўніцтва і мерапрыемстваў на 2-е пяцігодцзе.

Пры ўсёй важнасці, у якасці рашаючых элементаў для ўсёй народнай гаспадаркі, вядучых звенняў, пры складанні плана належыць забяспечыць таксама і астатнія падпарадкваныя галіны народнай гаспадаркі, якія вызначаюць сабою рэальнасць і паспяховасць народна-гаспадарчага плана ў цэлым. У гэтым сэнсе ўнутраная узаемасувязь плана на аснове народна-гаспадарчых балансаў з'яўляецца абавязковай пры складанні плана.

Аб'ём запраектаванай вытворчасці, на аснове праектуемай вытворчай магутнасці прадпрыемстваў, абавязвае забяспечыць план капітальнага будаўніцтва па ўводу ў строй і эксплаатацыі запраектаваных прадпрыемстваў. У сваю чаргу паспяховасць і рэальнасць плана капітальнага будаўніцтва знаходзіцца ў прамой залежнасці ад аб'ёма плана вытворчасці, асабліва будматар'ялаў і абсталявання. Але запраектаваны план вытворчасці і будаўніцтва аднолькава абвязвае забяспечыць у плане аб'ём патрэбнай сыравіны, паліва, электрычнай энергіі, рабочай сілы, транспарта. Абслугоўванне рабочай сілы, стварэнне нармальных матар'яльна-бытавых і сацыяльна-культурных умоў для працоўных, як асноўная ўмова для паспяховага выканання плана займае асобае і самастойнае месца ў плане. Гаворачы аб вытворчасці і будаўніцтве, мы не расчляняем гэтыя галіны плана па асноўных галінах народнай гаспадаркі. Тым часам, план па прамысловасці, і тым больш па асобных галінах, мае свае асаблівасці, у адзнаку ад сельскай гаспадаркі, а сельская гаспадарка ўнутры сябе мае свае галіны.

Гэтыя адметныя асаблівасці выражаюцца не толькі ў спецыфічнасці прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці. Асаблівасці плана сельскай гаспадаркі выражаюцца, перш за усё, у тым, што ў сельскай гаспадарцы мы яшчэ маем справу з пэўнай доляй аднаасобных гаспадарак, а калгасы, пакуль што, з'яўляюцца толькі соцыялістычнымі гаспадаркамі па форме, але яшчэ не паслядоўна-соцыялістычнымі, якімі з'яўляецца наша соцыялістычная прамысловасць і соўгасы.

План носіць на сябе сляды асаблівасцей кожнага данага этапа нашага соцыялістычнага будаўніцтва. У гэтым сэнсе ўсе наступныя планы адрозніваюцца ад папярэдніх, выражаюць сабою дасягнутыя намі поспехі і з'яўляюцца больш дасканалымі і больш складанымі, паколькі яны ахапляюць усё большы аб'ём узросшай народнай гаспадаркі і ў больш канкрэтным выражэнні. Гэта можна прадэманстраваць на прыкладзе і нашага планавання ў БССР. Даволі параўнаць планавыя дакументы 1934 г. з папярэднімі гадамі, каб пераканацца, наколькі наша планавая работа рушыла ўперад.

Мы ў 1934 годзе склалі план у раённым разрэзе, чаго не было да 1934 г. Гэта патрабавала агромнага напружання і больш канкрэт-

ных велаў народнай гаспадаркі не толькі ў рэспубліканскім разрэзе і не проста галін гаспадаркі, а канкрэтна па паасобных раёнах. Гэта азначае, што народная гаспадарка БССР канкрэтызуецца ў прасторы на 75 тэрытарыяльных адзінак. Але сэнс і важнасць раённага разрэзу плана заключаецца ў тым, што раённыя арганізацыі, райпланы, а пры з іх рэспубліканскія арганізацыі і наркаматы шчыльна падыходзяць да паасобных прадпрыемстваў, соўгасаў, калгасаў.

У гэтым напрамку мы яшчэ не можам пахваліцца вялікімі дасягненнямі. Хоць план 1931 года і складзен у раённым разрэзе, але гэта яшчэ не значыць, што ўсе раёны, тым больш рэспубліканскія арганізацыі і наркаматы, прагледзелі планы паасобных прадпрыемстваў, соўгасаў, калгасаў і т. п. Пакуль што, на-жаль, і раённыя арганізацыі аперыруюць сярэдне-раённымі велічынямі. Пасеўныя плошчы, севазварот, пагалоўе жывёлы, забяспечанасць кармамі, рабочай і цягавай сілай і т. д. і т. п. складаюцца без папярэдняй прапрацоўкі ў сельсаветах, тым больш у калгасах.

У гэтым сказваюцца сляды функцыяналкі ў метадах работы планавых органаў і ў самай пабудове планавых органаў.

Дзяржплан БССР, як і іншыя органы, быў пабудован у асноўным па функцыянальнаму прызнаку. У Дзяржплане не было спецыяльнага ўтварэння па кіраўніцтву раённымі планавымі камісіямі, па распрацоўцы плана ў раённым разрэзе. Толькі нядаўна, пасля XVII з'езда, створан сектар раённага планавання, за якім якога і з'яўляецца распрацоўка пытанняў раённага плана і кіраўніцтва раипланавымі камісіямі. Але і ў пытаннях галіннага планавання панавала функцыяналка, паколькі галінныя сектары абмяжоўвалі сваю работу па планаванню сваей пэўнай галіны толькі нямногімі паказчыкамі, амаль выключна колькаснага парадку. Напрыклад план галіны абмяжоўваўся аб'емам вытворчасці, у натуральным часам адарты менце і грашовым выражэннях.

Пытанні ж працы, зарплаты, якасных паказчыкаў, капітальнага будаўніцтва, фінансаў распрацоўваліся іншымі функцыянальнымі сектарамі: сектарам працы, фінсектарам, сектарам капітальнага будаўніцтва і т. д. Гэта прыводзіла к таму, што складзены план у рэспубліканскім разрэзе даваў выражэнне па асобных вертыкалях плана. Напрыклад: аб'ём вытворчасці, дапусцім, па асобных галінах, баланс працы і фонд заработнай платы, якасныя паказчыкі, аб'ём капітальных укладанняў і т. д. Але, унутры рэспубліканскага плана, не было цэльных, унутры ўвязаных і прапрацаваных паасобных галінных планаў, як пэўнага неабходнага адзінства, што ўласна-толькі і можа забяспечыць рэальнасць гэтых планаў. Па сельскай гаспадарцы план выражаў агульную пасеўную плошчу, агульны севазварот, агульнае пагалоўе жывёлы і т. д. і т. п., па рэспубліцы ў цэлым.

Праведзеная рэарганізацыя апарата, побач з забяспечаннем прапрацоўкі плана ў раённым тэрытарыяльным разрэзе, ліквідуе функцыяналку і абавязвае сектары распрацоўваць галінныя планы з ахопам ўсіх элементаў, увязваючы ўнутры ў неабходным адзінстве аб'ём вытворчасці, колькасць рабочай сілы і фонд заработнай платы з заданнем па зніжэнню сабекошту і росту прадукцыйнасці працы, з накапленнем і капітальнымі затратамі. І ўсё разам узятае павінна атрымаць сваё фінансавае выражэнне ў фінплане данай галіны, з улікам узаемаразліку з дзяржаўным бюджэтам і крэдытнымі ўстановамі. Сінтэтычныя ўтварэнні, якія захоўваюцца ў зводна-планавым кіраўніцтве, зводзяць народна-гаспадарчы план у патрэбных разрэзах на аснове даных галінных планаў і матар'ялаў.

Зразумела, што галіновыя сектары атрымліваюць ліміты і абмежаваны граніцамі ўстаноўленых для іх заданняў як колькаснага, так і якаснага парадку. У гэтым сэнсе асоба выключная роля выпадзе на долю новастворанага кіраўніцтва матар'яльных фондаў, згодна пастанове СНК Саюза ад 8 жніўня гг.

Кіраўніцтва матар'яльных фондаў на аснове выяўленага аб'ёма магчымай вытворчасці, попыту і патрэбнасцей народнай гаспадаркі ў сыравіне, у будматар'ялах, абсталяванні і т. п. складае народнагаспадарчыя балансы, на якіх выяўляюцца лішкі і дэфіцыт, магчымыя к вывазу і патрэбныя к завозу фонды. Адпаведна робяцца заяўкі ў Саюздзяржплан на патрэбную сыравіну, будматар'ялы і абсталяванне. Гэтае-ж кіраўніцтва плануе і арганізуе размеркаванне паступаючых фондаў як за кошт унутранай вытворчасці, так і за кошт завазімых па агульнасаюзнаму плану.

З пералічаных задач, ускладаемых на кіраўніцтва матар'яльных фондаў, відаць, якая агромная адказнасць кладзецца на гэта ўтварэнне і на ўсю планавую камісію, бо якасць работы гэтага кіраўніцтва будзе сказвацца на кожным прадпрыемстве, будоўлі.

Не менш важныя па адказнасці задачы ўскладаюцца на планавыя органы у сувязі з апошнімі рашэннямі СНК Саюза аб барацьбе з бясплановым, беспраектным і бескаштарысным будаўніцтвам і фактамі павышэння сабекошту будаўніцтва. І ў гэтай частцы Дзяржплану неабходна зусім чотка арганізаваць работу, якая забяспечвала-б кампетэнтны прагляд і заключэнне па праектах і каштарысах, кантроль і нагляд за правільным і своечасовым выкананнем плана капітальнага будаўніцтва.

Пералічаныя задачы, ускладаемыя на планавую камісію, могуць быць ёю паспяхова выкананы, пры ўмове высокай якасці работы кожнага супрацоўніка, што прадпалагае канкрэтнае веданне даручанай справы, планіруемага аб'екта, веданне марксісцка-ленінска-сталінскай тэорыі, метадалогіі і практыкі планавання, класавай пільнасці і непрымірымасці к парушальнікам планавай дысцыпліны і зрываючым план, актыўнага ўдзелу ў барацьбе за выкананне плана.

А. Манусевіч

Барацьба за рост прадукцыйнасці працы ў прамысловасці БССР

У сваім дакладзе XVI з'езду ВКП(б) тав. Сталін указаў:

> «Без сістэматычнага росту прадукцыйнасці працы, як у галіне прамысловасці, так і ў галіне сельскай гаспадаркі мы не зможам вырашыць задач рэканструкцыі, не зможам не толькі дагнаць і перагнаць перадавыя капіталістычныя краіны, але нават адстаяць сваё самастойнае існаванне».

Перамогшы ў нашай краіне пралетарыят стварыў усе неабходныя прадпасылкі для безупыннага, росту прадукцыйнасці працы.

Гэтыя прадпасылкі заложаны ў самой сістэме дыктатуры пралетарыята, у характары нашай грамадскай арганізацыі працы, у нашых соцыялістычных вытворчых адносінах.

Перавага соцыялістычных вытворчых адносін забяспечыла тэмпы росту прадукцыйнасці працы, якіх мы ніколі не наглядалі нават у найбольш перадавых капіталістычных краінах. За 4½ гады першай пяцігодкі выпрацоўка на аднаго рабочага ў нязменных цэнах 1926-27 гг. вырасла па прамысловасці СССР на 41 проц., у тым ліку па цяжкай індустрыі на 53,1 проц. У параўнанні з даваенным узроўнем прадукцыйнасць працы ў буйной прамысловасці амаль падвоілася.

У такіх галінах прамысловасці, якія выпрацоўваюць сродкі вытворчасці, як машына-будаўніцтва, прадукцыйнасць працы павялічылася на 69,3 проц., у нафтавай прамысловасці—на 71,1 проц., у шкляной—на 203,5 проц. Гэты рост адбыўся пры агромных якасных зрухах у асваенні новых складаных вытворчасцей.

Калі ўлічыць, што рабочы дзень скараціўся з 8 да 7 гадзін, то выпрацоўка на аднаго рабочага ў першай пяцігодцы ўзрасла на 61,1 проц.—у 2,8 раза супроць 1913 г.

Затрата працы ў калгасах на апрацоўку аднолькавай плошчы скарацілася ў параўнанні з аднаасобнымі гаспадаркамі ў 1,3—2,0 раза, ў соўгасах—у 10 раз.

Вялікія поспехі росту прадукцыйнасці працы маем таксама ў прамысловасці БССР. Дынаміка росту выпрацоўкі на аднаго рабочага па

прамысловасці 4 наркаматаў БССР характарызуецца наступнымі данымі (у нязменных цэнах 1926—27 гг.):

Галіны прамысловасці	1927—1928 гг.	Па плану пяцігодкі на 1932—1933 гг.	Фактычн. выканан. у 1932 г.	1932 г. у проц. к 1927—28 гг
Уся прамысловасць	4422	8406	8057	182,0
У тым ліку:				
Тарфяная	1267	1490	1340	107,7
Металаапрацоўчая	3476	5427	5866	168,8
Хімічная	2385	—	8938	374,6
Дрэваапрацоўчая	6610	14376	30438	460,5
Швейная	8864	17588	13382	151,0

Адказваючы тым, хто выстаўлў палажэнне, што цэнтральнай ідэяй першай пяцігодкі з'яўляецца рост прадукцыйнасці працы «наогул», тав. Сталін указаў.

> «У росце прадукцыйнасці працы наогул зацікаўлена ўсякае грамадства, і капіталістычнае і дакапіталістычнае. Адметная рыса совецкага грамадства ад усякага іншага грамадства ў тым именна і заключаецца, што яно зацікаўлена не ва ўсякім росце прадукцыйнасці працы, а ў такім росце, які забяспечвае перавагу соцыялістычных форм гаспадаркі над іншымі формамі і перш за ўсё над капіталістычнымі формамі гаспадаркі, які забяспечвае такім чынам перасіленне і выцясненне капіталістычных форм гаспадаркі».

Прадукцыйнасць працы ў СССР па сваіх тэмпах росту абганяе самыя перадавыя капіталістычныя краіны.

Пры капіталізме «Усякае развіццё прадукцыйнасці аказваецца ў той-жа час зброяй супроць рабочых» (Маркс). У СССР—рост прадукцыйнасці працы абумоўлівае безупыннае павышэнне жыццёвага ўзроўню рабочага класа, рост яго матэрыяльнага, культурнага і бытавога дабрабыту.

Не глядзячы на агромную перавагу і магутнасць совецкай эканомікі, мы аднак не выканалі планавых заданняў росту прадукцыйнасці працы і зніжэння сабекошту нашай прадукцыі. Паказчыкі прадукцыйнасці працы недавыкананы зараз па многіх прадпрыемствах БССР.

Прычыны трэба шукаць у тым, што «усё яшчэ не ўпарадкавана дрэнная арганізацыя працы і зарплаты, абязлічка ў працы, ураўнілаўка ў сістэме зарплаты», што «далёка яшчэ не ліквідаваны канцылярска-бюракратычны метад кіраўніцтва ў гаспадарчых наркаматах... лёгкай і харчовай прамысловасці» (Сталін, даклад XVII партз'езду).

Задача другой пяцігодкі—узняць прадукцыйнасць працы на 63 проц. і знізіць сабекошт на 26 проц. Магчымасці такіх тэмпаў росту прадукцыйнасці працы заключаюцца, перш за ўсё, як гэта

ўказваў тав. Молатаў у дакладзе XVII партз'езду, у агромным росце новай удасканаленай тэхнікі, у асваенні новых прадпрыемстваў. У гэтай галіне намі дасягнуты ўжо буйныя поспехі.

Барацьба за тэхнічны мінімум узняла соцспаборніцтва на новую, вышэйшую ступень.

Прыводзім даныя на 10 мая гг. (ка дню першай Усебеларускай канферэнцыі ўдарнікаў тэхвучобы легкай прамысловасці) аб ахваце тэхвучобай рабочых:

Назва трэстаў	Усяго рабоч. на прадпрыемстве трэста	Лік рабоч., абавязаных здаць тэхмінімум	Лік неахопленых тэхвучобай		Лік рабочых здаўшых тэхмінімум		Лік рабочых, маючых права на значок ЗОТ	
			Колькасць	У проц. да падлягаўш. ахопу.	Колькасць	У проц. да ахопл. вучобай.	Колькасць	Проц.
Швэйны	12042	8044	7345	91,3	1203	16,3	657	54,6
Тэкстыльны	8432	4810	3422	71,1	1788	52,3	834	46,0
Скурана-абутковы	1915	1108	[illegible]	247,1	814	27,5	117	51,9
Паліграфічны	1739	755	1043	138,1	[illegible]	[illegible]	83	28,6
Шчацінны	2234	480	1163	301,8	121	28,7	146	34,7
Шкляны	2811	[illegible]	[illegible]	144,1	78	7,3	11	14,1
Культпрам	993	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	30	17,8
Будпрам	1407	620	569	91,8	59	10,1	25	12,3
Разам	34613	16967	18388	102,5	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]

З табліцы відаць, што рад трэстаў мае вялікія дасягненні, ахапіўшы тэхвучобай многа рабочых, тым часам як тэкстыльны і швэйны трэсты маюць адваротныя паказчыкі.

Рад прадпрыемстваў Віцебска паказаў лепшыя ўзоры барацьбы за аўладанне тэхнікай. У першую чаргу неабходна адзначыць панчошна-трыкатажную фабрыку імя Клары Цэткін. З агульнай колькасці 881 чалавек, падлягаўшых абавязковаму ахопу тэхвучобай, на 10 мая было ахоплена 736 рабочых. Здалі соцтэхэкзамен 574 рабочых, з іх 303 на вельмі добра і 271 на добра. На гэтай фабрыцы 41 зотавец арганізавалі шэфства на 76 адстаючымі, каб падрыхтаваць іх да соцтэхэкзамену.

Фабрыка «Пролетарская перамога» на 1 чэрвеня г. г. мела здаўшых соцтэхэкзамен 543 рабочых, з іх 260 на вельмі добра і 241 на добра.

Завод «Большэвік», замест падлягаўшых тэхмінімуму 94 рабочых, ахапіў 411 чал., з якіх здалі соцтэхэкзамен 327 рабочых, у тым ліку 228 на вельмі добра і 53 на добра.

На шклозаводзе імя Дзімбайя, пасля Усебеларускай канферэнцыі ўдарнікаў тэхвучобы, лік ахопленых тэхвучобай вырас да 650 чал., з якіх на 1 чэрвеня здалі соцтэхэкзамен 139 рабочых, у тым ліку 40 на вельмі добра і 40 на добра.

Значкісты ЗОТ дабіліся вытворчых дасягненняў.

Брыгада **Кругловай** з фабрыкі «Клары Цэткін» выканала план першага квартала на 112 проц., знізіла брак да 2,5 проц., супроць пачатковых 7 проц., і дала эканоміі 186.000 руб.

Комсамольская брыгада **Берковіча** з фабрыкі «КІМ» пасля здачы соцтэхэкзаменаў пачала працаваць без браку, сістэматычна выконвае на 120 проц. план. Комсамолка **Карнеева** да вучобы з'яўлялась дававала бракаваную прадукцыю, здаўшы-ж соцтэхэкзамен на вельмі добра, працуе без браку.

Такіх-жа поспехаў дабіліся паасобныя брыгады завода «Большэвік», ф-ка «Х Октябр», «Пролетарская перамога» і інш.

Разгледзім даныя на 5 ліпеня т. г. аб разгортванні тэхвучобы на прадпрыемствах металаапрацоўчай прамысловасці БССР:

Заводы	Лік рабочых, якія павінны ахапіць тэхвучобай	Здалі соцтэхэкзамен: Колькасць	Здалі соцтэхэкзамен: У процантах	Здалі на вельмі добра: Колькасць	Здалі на вельмі добра: У процантах
„Варашылава"	650	269	41,3	85	31,5
„Комунар"	450	104	23,1	52	50,0
„Ударнік"	155	121	78,0	31	25,6
„Чырвоны металіст"	565	217	38,4	54	24,8
„Пролетарый"	480	249	51,8	103	41,3
„Рухавік рэволюцыі"	120	73	60,8	28	38,3
Акулярная фабрыка	420	132	31,4	76	57,5
Разам	2840	1165	41,0	429	36,8

Прыводзім дасягненні паасобных значкістаў-зотаўцаў:

Тав. **Доўнар** (з-д «Варашылава»), працуючы без браку, выканаў свой паўгадавы план на 116,4 проц., т. **Сухоцкі** на 184 проц.

Тав. **Адуцкевіч** (з-д «Пролетарый») сістэматычна выконвае план на 140—150 проц., тав. **Кінштэйн**—на 130—140 проц., тав. **Якубава**—на 140 проц., тав. **Каровін** на 100—125 проц. Усе яны працуюць без браку.

Тав. **Камлюк** (з-д «Ударнік») выканаў план у сакавіку на 122 проц., у красавіку—130 проц., у маі—140 проц.; тав. **Курган** у сакавіку на 105 проц., у красавіку—112, у маі—115. Тав. **Фрэнкель**—у сакавіку на 102, у красавіку—107, у маі—119 проц. Усе яны не даюць браку.

Добрыя паказчыкі ў выкананні промфінплана далі значкісты віцебскай акулярнай фабрыкі тт. **Блюмкін**, **Апава**, завода «Молатава»—тт. **Паўлаў**, **Мушкіна**, **Парфімовіч** і рад іншых.

Абмяжоўваючыся гэтымі фактамі[1], неабходна адзначыць рад вельмі значных недахопаў ў разгортванні тэхвучобы.

[1]) Гл. арт. т. Слоніма Ніна. „Тэхэкзамен на прадпрыемствах". „Большэвік Беларусі" № 6. 1934 г.

Тав. Балцан у сваім дакладзе на Ўсебеларускай канферэнцыі ўдарнікаў тэхвучобы лёгкай прамысловасці прывёў рад фактаў скажэння тэхэкзаменаў.

На гомельскай шчацінкай фабрыцы ў пагоні за рэкардсменскімі лічбамі за адзін вечар было «пераэкзаменавана» 200 рабочых. А ў рэзультаце аказалася, што сярод 27 выдатнікаў 7 не выконвае сваю норму выпрацоўкі. На «Дзвіне» быў выпадак бюракратычнага правядзення тэхэкзаменаў у габінеце начальніка цэха. Работніца Левітанус, атрымаўшая такім чынам вельмі добра, не выконвае свой план.

Нармальнае развіццё тэхвучобы патрабуе няўсыпнай увагі ўсіх гаспадарчых, партыйных, прафсаюзных і грамадскіх арганізацый. Поспех у гэтай справе будзе забяспечаны, калі кожнае прадпрыемства створыць нармальныя ўмовы для тэхвучобы, дасць адпаведныя памяшканні, абсталюе тэхкабінеты, забяспечыць метадычнай дапамогай і падручнікамі, якасцю выкладчыкаў, поўнасцю прыстасаваўшы тыповыя праграмы да канкрэтных умоў данай вытворчасці. Паказчыкам сапраўднай барацьбы за авалоданне тэхнікай з'яўляюцца поўнае выкананне колькасных і якасных паказчыкаў агрэгата, цэха, усяго прадпрыемства.

У справе авалодання тэхнікай вялікае значэнне мае інстытут грамадскіх тэхнаркаў. Грамадскія тэхнаркі з ІТР прымацоўваюцца да паасобных брыгад па авалоданню тэхнікай і дапамагаюць у авалоданні тэхналагічным працэсам, тэхпромфінпланам брыгады, у выкананні плана рацыяналізатарскіх і тэхнічных мерапрыемстваў, у выяўленні прычын браку і спосабаў іх знішчэння, дапамагаюць кожнаму рабочаму ў яго тэхвучобе.

Інстытут грамадскіх тэхнаркаў атрымаў сваё развіццё на заводзе «Бальшавік», фабрыках «Пралетарская перамога» і «Октябрь». Вопыт гэтых прадпрыемстваў неабходна перанесці на ўсю прамысловасць БССР.

Ажыццяўляючы пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і любімейшага правадыра тав. Сталіна будаўніцтва соцыялізма ў СССР, пралетарыят у барацьбе за выкананне промфінплана высоўвае ўсё новыя і новыя формы соцспаборніцтва: скразныя брыгады (ініцыятыва рабочых завода «Ростсельмаш»), грамадскі буксір (шахта «Арцема»), рацыяналізатарскія брыгады (завод «Красный Аксай» Паўночнага Каўказа), сустрэчны промфінплан (завод імя К. Маркса—Ленінград), зменасустрэчны промфінплан (завод імя Ільіча—Марыупаль), гаспадарчаразліковыя брыгады (ленінградскія заводы «Бальшавік», «Севкабель» і інш.), соцтэхэкзамен («Уралмаш»).

Па даных ЦСПСБ на 1 красавіка 1934 г. з агульнай колькасці 57296 рабочых на 122 буйнейшых прадпрыемствах усімі відамі спаборніцтва было ахоплена 2/3 рабочых, 60 проц. маюць індывідуальныя соцдагаворы.

Штодзённы вопыт нашага пасляховага соцыялістычнага будаўніцтва дае нам шматлікія прыклады узорнай барацьбы за рост прадукцыйнасці працы. Зараз, напрыклад, мы маем значны размах соцспаборніцтва [illegible] брыгада [illegible] рэарганізаваўшы соцыялістычныя метады працы, закончыла свой сезонны план к 24 чэрвеня і [illegible] да ўсіх рабочых-тарфянікаў БССР аб [illegible] выкананні плана торфасезона [illegible] брыгады [illegible], падхопленая [illegible] брыгадамі торфараспрацовак БССР.

вылілася ў магутны соцыялістычны рух—вытворчы паход імя тав. Гікало на датэрміновае выкананне плана торфаздабычы ў сезоне 1934 г.

На заводзе «Шлях соцыялізма» 29-VI закончыла свой план брыгада тав. Бірыла, 30-VI—брыгада тав. Шчэрбіна, 1-VII брыгада тав. Бандарэнко.

На заводзе «Большэвік» 4-VII—закончылі свой план брыгады тт. Зубава і Карніленко; 5-VII брыгада тав. Сеўрука; 7-VII закончыла свой план брыгада тав. Марунеўскага (завод «Чырвоны Октябр») і брыгада тав. Жура (завод імя Гея).

У рэзультаце вытворчага паходу імя тав. Гікало урадавы план здабычы торфа выкананы заводамі Белторфа датэрмінова 15 жніўня г. г. на 108,7 проц.

Па даных ЦСПСБ на 1-IV—1934 г. у БССР налічвалася 58 прадпрыемстваў, дзе былі гаспадарча-разліковыя брыгады. З 1012 гаспадарча-разліковых брыгад, якімі было ахоплена 13505 рабочых 683 брыгады выканалі свае вытворчыя заданні, 428 брыгад далі за сакавік 72613 руб. эканоміі.

На заводзе імя Варашылава лепшая комсамольская гаспадарча-разліковая брыгада тав. Салавейчыка выканала свой план за першае паўгоддзе 1934 г. на 126,7 проц., пры зніжэнні сабекошту на 10 проц. Гаспадарча-разліковая брыгада тав. Давідзюка выканала свае планавае заданне на 135 проц., пры зніжэнні сабекошту на 17 проц.

На заводзе імя Молатава гаспадарча-разліковая брыгада тав. Асановіча выканала свае заданне за 2-гі квартал 1934 г. на 103 проц., брыгада тав. Добравольскага на 103,8 проц., тав. Бурака—на 105,5 проц.

На шклозаводзе імя Домбаля гаспадарча-разліковая брыгада тав. Шмірко, сістэматычна выконваючы план на 110—130 проц., звязла брак да 0,3—0,7 проц. супроць планавых 2 проц. Брыгада тав. Маліноўскага на гэтым-жа заводзе сістэматычна перавыконвае план на 10—15 проц., пры скарачэнні планавай нормы браку на 50—60 проц. Брыгада тав. Медзюка сістэматычна перавыконвае план на 20 проц., пры зніжэнні браку на 70—75 проц. супроць плана.

Падобных прыкладаў не мала па раду іншых прадпрыемстваў, асабліва такіх, як завод «Большэвік», фабрыка «Пролетарская перамога», фабрыка «Клары Цэткін».

У разгортванні гаспадарча-разліковых брыгад па БССР мы маем і рад вельмі істотных недахопаў.

Па-першае, палова прадпрыемстваў БССР зусім не мае гаспадарча-разліковых брыгад, шмат дзе яны развальваліся, бо былі няправільна арганізаваны і кепска кіраваліся. Не мала і «папяровых» гаспадарча-разліковых брыгад.

Аб незадавальняючым кіраўніцтве можна меркаваць хоць-бы па тым, што 33 проц. гаспадарча-разліковых брыгад за разглядаемы перыяд не выканалі сваіх вытворчых заданняў, 56 проц. у рэзультаце не далі ніякай эканоміі.

За апошні час на радзе прадпрыемстваў гаспадарча-разліковыя брыгады ў загоне. Сям-там гавораць «тэорыі» аб тым, што значэнне гаспадарча-разліковых брыгад зазнілася ў сувязі з укараненнем тэхпромфінплана і соцтэхэкзаменамі. Такія меркаванні вынікаюць з неразумення, або нежадання разумець указанні Леніна і Сталіна аб значэнні матэрыяльных стымулаў у разгортванні соцспаборніцтва. Укара-

[illegible]не тэхпромфінплана не выключае, а наадварот,—стварае лепшыя умовы для разгортвання гаспадарча-разліковых брыгад.

Недастатковая чоткасць уліку і планавання з'яўляецца асноўнай перашкодай у разгортванні гаспадарча-разліковых брыгад. Поспехі рабочых у авалоданні тэхнікай ствараюць лепшыя умовы для выканання якасных паказчыкаў плана. Пры правільным кіраўніцтве гаспадарча-разліковым брыгадам рабочыя заўсёды будуць знаходзіць новыя крыніцы для новай эканоміі, для матар'яльнага стымулявання зацікаўленасці рабочых.

Соцыялістычная праца—фронт класавай барацьбы. Таму на нашых прадпрыемствах мы сустракаемся яшчэ з такімі з'явамі, як шкодніцтва (у сакавіку выяўлена 1118 шкоднікаў), рвацтва, прагулы і іншыя парушэнні пралетарскай працоўнай дысцыпліны.

Гіганцкія тэмпы нашага соцыялістычнага будаўніцтва суправаджаюцца безупынным ростам рабочых кадраў і за лік калгаснікаў, аднаасобнікаў і дробна-буржуазных слаёў горада.

Гэтыя новыя папаўненні пралетарыята патрабуюць сур'ёзнай работы па іх соцыялістычнаму перавыхаванню. Поспехі гэтага перавыхавання па меры далейшых новых перамог на фронце будаўніцтва соцыялізма ў СССР будуць усё больш узрастаць. Для перавыхавання калгаснікаў і аднаасобнікаў буйнейшае значэнне мае пашырэнне нашых поспехаў у галіне арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў.

Ленін разглядаў лодыраў і дэзарганізатараў вытворчасці, як злейшых ворагаў пралетарскай дзяржавы і прапанаваў прымяняць да іх самыя строгія меры ўздзейнічання.

На базе росту самадзейнасці мас і новых метадаў працы, пры адначасовай барацьбе з парушальнікамі працоўнай дысцыпліны мы дасягнулі значных поспехаў. Аб гэтым сведчаць даныя УНХУ.

Дынаміка прагулаў па няўважлівых прычынах у прамысловасці БССР:

	1929 г.	1930 г.	1931 г.	1932 г.	1933 г.
Усяго па прамысловасці БССР	1,14	1,55	3,35	4,41	1,12
Тарфяная прамысловасць	5,70	12,81	11,56	15,12	[illegible]
Металаапрацоўчая прамысловасць	1,18	4,44	[illegible]	4,11	[illegible]
Тэкстыльная прамысловасць	1,74	2,18	4,25	4,41	2,01

Такім чынам, пасля 1931 г. і 1932 г., калі прагулы асабліва ўзмацніліся, чым выклікана была неабходнасць выдаць у 1932 г. спецыяльны закон аб барацьбе з прагульшчыкамі, у 1933 г. прагулы па няўважлівых прычынах скараціліся, а ў 1934 г. скараціліся яшчэ больш. За 4 месяцы 1934 г. прагулы па няўважлівых прычынах у сярэднім колькасці дзён на аднаго работніка складалі: па Металатрэсту 0,1, па Энергатрэсту 0,12, у прамысловасці будматэр'ялаў 0,2, у хімічнай 0,19, тэкстыльнай—0,17, шклянай—0,17, скурана-абутковай—0;03.

Нельга не сказаць аб прагулах па ўважлівых прычынах. Як вядома, у апошнія месяцы наглядаецца вельмі шкодная тэндэнцыя скрыць пад рубрыкай «уважлівых прычын» усякія прагулы.

Значныя поспехі атрыманы таксама ў зніжэнні цякучасці, хоць размеры яе усе яшчэ застаюцца на вельмі высокім узроўні.

Дынаміка цякучасці ў прамысловасці БССР па даных УНХУ (у процантах да сярэдняй спісачнай колькасці рабочых):

	1929 г.	1930 г.	1931 г.	1932 г.	1933 г.	4 месяцы 1934 г.
Прыбыла	10,7	13,3	10,4	9,1	12,0	10,8
Убыла	9,1	9,9	8,9	10,8	11,2	7,8

У барацьбе за пролетарскую дысцыпліну працы значную ролю павінны адыграць вытворча-таварыскія суды, дзейнасць якіх узмацнілася з другога паўгоддзя 1933 г. На даных выбарачнай праверкі ЦСПСБ 54 проц. усіх разгледжаных вытворча-таварыскімі судамі за другое паўгоддзе 1933 г. спраў былі справы аб парушэннях працоўнай дысцыпліны. На радзе фабрык («Пролетарская перамога», «Герой працы») паседжанні вытворча-таварыскіх судоў праходзілі пры значнай колькасці і актыўным удзеле рабочых.

Аднак, на многіх прадпрыемствах вытворча-таварыскія суды не вядуць патрэбнай барацьбы за працоўную дысцыпліну. На абутковай фабрыцы імя Кагановіча, Гомсельмашы, швейнай фабрыцы імя Дзяржынскага, заводзе «Цепи Галля», панчошнай фабрыцы «Спартак» і Бабруйскім камбінаце (за выключэннем базы сыравіны) вытворчыя таварыскія суды на працягу 4 месяцаў гг. зусім не займаліся пытаннямі працоўнай дысцыпліны.

Безупыннае паляпшэнне дабрабыту пролетарыята БССР і спецыяльныя мерапрыемствы па соцыялістычнай ахове здароўя, працы і тэхнікі бяспекі дазволілі скараціць за перыяд пяцігодкі захворванне з уратай працаздольнасці рабочых цэнзавай прамысловасці БССР на 29,1 проц. і прамысловы траўматызм на 30,8 проц. Забяспечанне поўнага эфекту ў звязку са зніжэннем захворванняў і прамысловага траўматызма патрабуе нясласлабнай барацьбы з парушальнікамі працоўнай дысцыпліны—сімулянтамі. У гэтых адносінах асаблівую ролю павінен адыграць інстытут рабочага кантралёра на дому, які праверае сапраўдныя прычыны невыхаду на работу і дае неабходную дапамогу хворым.

За першы квартал 1934 г. па даных абследавання ЦСПСБ 15-ці прадпрыемстваў машынабудаўнічай, швейнай і хлебапякарнай прамысловасці, з'явілася 3449 выпадкаў невыхаду на работу па хваробе, выяўлена 85 чал. сімулянтаў і пазбаўленых права на аплату па часовай непрацаздольнасці, прычым 5 рабочых былі перададзены вытворча-таварыскаму суду.

Пры бясспрэчных поспехах барацьбы з прагуламі нельга [illegible] лічыць становішча здавальняючым. Нельга забываць, што прыведзеныя даныя УНХУ з'яўляюцца сярэднімі ў адносінах усіх раб[illegible]

а прагулы адносяцца пераважна да адсталай часткі рабочых, да лодыраў і дэзарганізатараў вытворчасці

Рад прадпрыемстваў недастаткова змагаецца за пролетарскую дысцыпліну працы. Завод «Комунар», менская электрастанцыя, завод «Цепи Галля», фабрыка імя Кагановіча, шклозавод «Пролетарый», швейная фабрыка імя Крупскай, фабрыка «Дзвіна», Бабруйскі лесакамбінат, не маюць правіл унутранага распарадку, не вядуць дастатковай барацьбы з парушальнікамі працоўнай дысцыпліны. Рад гаспадарнікаў разглядае закон аб звальненні за прагул як права, а не абавязак, і часта абмяжоўваюцца заменай звальнення за прагул іншымі мерамі спагнання.

На менскай электрастанцыі ў I квартале 1934 г. мелі месца 56 прагулаў, звольнена-ж за прагулы толькі 49 чалавек. Рад звольненых за прагулы рабочых пераходзілі працаваць у іншыя цэхі электрастанцыі. Падобныя з'явы былі на шклозаводзе «Пролетарый», на Бабруйскім лесакамбінаце і інш.

Адсюль зусім зразумела, чаму на заводах растуць прагулы пры агульным зніжэнні іх у прамысловасці БССР. На абутковай фабрыцы імя Кагановіча ў студзені было 8 прагулаў, у лютым — 6, у сакавіку — 4, у красавіку — 10. На шчотачнай фабрыцы імя Крупскай за 4 месяцы было 50 прагулаў і за 20 дзён мая — 17 прагулаў. На Бабруйскім камбінаце за 1 квартал было 449 прагулаў.

Вось характэрныя даныя аб вытворчым стажы прагульшчыкаў.

Так, напрыклад, з 15 прагульшчыкаў наборнага цэха менскай шчотачнай фабрыкі 11 чалавек працавалі толькі па аднаму месяцу, адзін чалавек толькі 5 дзён. З 11 прагульшчыкаў за 1 квартал 1934 г. 2-га пашывачнага цэха абутковай фабрыкі імя Кагановіча 7 чалавек нядаўна прышлі на вытворчасць. Са 117 прагульшчыкаў на Гомсельмашы — 84 працавалі да 1 года, у тым ліку 35 да 1 месяца. З 42 прагульшчыкаў па лесацэху № 1 Бабруйскага камбіната 28 чал. працавала да 6 месяцаў, у тым ліку 14 чал. да 2 месяцаў.

Барацьба з цякучасцю, як і ўся барацьба за соцыялістычную арганізацыю і дысцыпліну працы, патрабуе, каб няўхільна выконваліся дырэктывы партыі і ўрада аб штодзеннай увазе матэрыяльнаму і культурна-бытавому абслугоўванню рабочых.

У сваім дакладзе XV з'езду КП(б)Б тав. Гікало, указаўшы на дасягнутыя вялікія поспехі ў паляпшэнні матэрыяльнага становішча рабочых калгаснікаў і працоўных мас, у той-жа самы час з усёй катэгарычнасцю падкрэсліў неабходнасць прыцягваць да партыйнай адказнасці ўсіх тых, хто, адказваючы за справу арганізацыі рабочага быту, не праводзіць дырэктыў партыі аб сістэматычным штодзенным клопаце і ўнікненні ва ўсе «дробязі» быту рабочых.

Штодзенныя клопаты і барацьба за палепшанне культурна-бытавых умоў рабочых (рамонт рабочых кватэр і новае жыллёвае будаўніцтва, палепшанне грамадскага харчавання на прадпрыемствах, арганізацыя культурнага адпачынку, фізкультуры, чысціня і парадак у цэху і на прадпрыемстве і т. д.) з'яўляюцца неад'емнай часткай барацьбы за павышэнне прадукцыйнасці працы, за выкананне промфінплана, палепшанне якасці прадукцыі, узмацненне працоўнай дысцыпліны і т. д.

Побач з далейшай неаслабнай барацьбой з прагуламі асаблівае значэнне мае барацьба за максімальнае скарыстанне рабочага дня.

Тав. Молатаў у сваім дакладзе на XVII партз'ездзе ўказаў:

«Павышэнне прадукцыйнасці працы грунтуецца, па-другое, на выкарыстанні агромных рэзерваў нескарыстоўваемага рабочага часу ў нашых прамысловых прадпрыемствах. Бясспрэчнымі фактамі даказана, як агідна скарыстоўваецца скарочаны совецкім урадам да 7-мі гадзін рабочы дзень у прамысловасці СССР. Даказана, што на многіх прадпрыемствах фактычны рабочы час у рабочых не складае больш 5—5½ гадзін у дзень. Тут многа залежыць ад саміх рабочых, але гэта яшчэ больш залежыць ад гаспадарчага кіраўніцтва, ад палепшання усей справы арганізацыі працы на фабрыках і заводах».

Матэр'ялы праведзенай па раду прадпрыемстваў фатаграфіі рабочага дня сведчаць аб зусім нездавальняючым скарыстанні рабочага часу.

На Бабруйскім камбінаце рабочыя цэха стандартных дамоў Грышын і Дабрынеўскі па сваей віне прастаялі 36 проц. рабочага часу. У гэтым-жа цэху рабочы Бабкоў 10-VI 1934 г. працаваў толькі 2 гадз. 37 мінут, астатні час яму прышлося прастаяць па арганізацыйных прычынах. Рабочыя па укамплектаванню экспартнай тары таго-ж цэха 11-VI 1934 г. скарысталі рабочы дзень для асноўнай работы толькі на 54 проц.; 12 проц. рабочага часу было патрачана па віне самых рабочых, астатні час — на іншых арганізацыйных непаладках. У цэху будаўнічых дэталей на стругальным варштаце рабочым прыходзілася траціць 15 проц. рабочага часу на прастоі па арганізацыйна-тэхнічных прычынах.

На заводзе «Комунар» арганізацыйна-тэхнічныя непаладкі адабралі ў рабочага Гомельскага 10,5 проц., у рабочага Уласава—40, Давідава—12,5 проц., у рабочага Цыпкіна 7, у Янушкевіча—12 проц. рабочага часу.

Падобныя з'явы былі на фабрыцы імя Кагановіча, на заводзе імя Молотава і інш.

Па даных Белторфа за сезон 1933 г. прастоі па розных прычынах складалі ад 26 да 37 проц.

Па даных Інстытута працы рабочы дзень на лесазагатоўках у радзе ЛПГ не перавышаў 5 гадзін.

Побач з барацьбой за пролетарскую дысцыпліну працы неабходна змагацца з усімі арганізацыйнымі і тэхнічнымі непаладкамі ў цэху як асноўнымі прычынамі безадказнага скарыстання рабочага дня на многіх прадпрыемствах.

Калі асноўны ўдар па абязлічцы пасля выступлення тав. Сталіна быў нанесен у шырокай валакце, то недабітая абязлічка знаходзіць сваё праяўленне у цэлым радзе іншых форм, як абязлічка ў браку з-за адсутнасці аперацыйна-тэхнічнага кантролю, абязлічка ў арганізацыі планава-папераджальнага рамонту, абязлічка у абслугоўванні рабочых месц дапаможнымі рабочымі і т. д.

Як на адну з форм недабітай яшчэ ўраўнілаўкі ў зарплаце, неабходна указаць на адсутнасць на многіх прадпрыемствах (Бабруйскі камбінат) аплаты працы у залежнасці ад якасці і сортнасці выпускаемай прадукцыі. Да гэтага часу на прадпрыемствах харчовай прамысловасці пачасовыя і здзельныя рабочыя тарыфікуюцца аднолькава.

Для правільнай арганізацыі працы і зарплаты асаблівае значэнне мае тэхнічнае нармаванне.

«У аснову правільнай арганізацыі працы і ўнутрызаводскага планавання павінна быць паложана тэхнічнае нармаванне» (з рэзалюцыі 17-й партканферэнцыі).

Адзін з асноўных недахопаў многіх нашых прадпрыемстваў—гэта частае зводзенне задач тэхнармавання да ўстанаўлення норм выпрацоўкі без папярэдняга вывучэння ўсіх фактараў, якія забяспечваюць рост прадукцыйнасці працы. На многіх прадпрыемствах няма вытворчага інструктажа, як неабходнейшай прадпасылкі правільнага і своечасовага ўкаранення новых норм выпрацоўкі. Аб значэнні вытворчага інструктажа можна, напрыклад, меркаваць па наступных даных:

Дынаміка прадукцыйнасці працы на торфараспрацоўках ў 1933 г.:

	Прадукцыйнасць працы ўсіх тарфянікаў		У тым ліку яміншчыкаў	
	у цэглах	у проц.	у цэглах	у проц.
Май	133	100	238	100
Чэрвень	149	112,0	260	109,2
Ліпень	170	127,8	300	126,0
Жнівень і верасень	170	127,8	310	130,2

Трэба сказаць, што пры належнай арганізацыі вытворчага інструктажа высокая прадукцыйнасць працы магла быць забяспечана з самага пачатку сезона.

На радзе прадпрыемстваў усё яшчэ практыкуецца празмерная множнасць і дробнасць норм. Такія нормы становяцца незразумелымі для рабочых. Гэта практыка рэзка асуджана ў пастанове ЦК і СНК аб рабоце Донбаса і чыгуначнага транспарта.

Так, на біржы пілапрадукцыі Бабруйскага камбіната было звыш 400 норм, якія ўжо пасля невялікага іх вывучэння Інстытутам працы ўдалося скараціць больш як у 4 разы.

Яшчэ не на ўсіх прадпрыемствах ліквідавана функцыяналка ў тэхнічным нармаванні, якое поўнасцю перадаверана нарміроўшчыкам. Усё гэта прыводзіць к таму, што «нормы выпрацоўкі і расцэнкі не з'яўляюцца да гэтага часу у руках камандна-тэхнічнага персанала асноўным рычагом ў барацьбе за арганізацыю працы і дасягненне высокай прадукцыйнасці».

Пастанова ЦК і СНК па Донбасу і чыгуначнаму транспарту павінна быць пакладзена ў аснову арганізацыі нармавання і аплаты працы у нашай прамысловасці.

Агромны фактар у барацьбе за рост прадукцыйнасці працы—рабочае вынаходніцтва. Па даных ЦС вынаходцаў пры ЦСПСБ за 1933 г. па 70 прадпрыемствах БССР паступіла 10.436 рацыяналізатарскіх прапаноў, з якіх прынята 49 проц. Па падліках, эканомія ад 985 прапаноў дасць звыш 2.5 мільёна руб. у год.

Армія рабочых рацыяналізатараў, якая расце агромнымі тэмпамі, высунула з сваіх радоў рад талентаў—рацыяналізатараў:

Інструментальшчык Заходняй чыгункі тав. Еўстафееў, з 50-гадовым вытворчым стажам (зараз пенсіянер), былы плотнік, герой працы, узнагароджаны ордэнам працоўнага сцягу, даў транспарту звыш 104 рацыяналізатарскіх прапаноў на сотні тысяч рублёў эканоміі.

Стары рабочы віцебскага шчацціннага камбіната тав. Гофман—былы чырвоны партызан—вынайшаў машыну па выгладжванню шчаціны. Машына гэта замяняе 50 рабочых і дае 32.000 руб. эканоміі ў год. Рабочы механічных майстэрань Бабруйскага камбіната тав. Крупенецкі вынайшаў варштат для шліфавання сепаратарных напільнікаў, што дае 175.000 руб. эканоміі ў год. Рабочы завода імя Варашылава т. Глайхенгауз з 51-гадовым вытворчым стажам унёс рад рацыяналізатарскіх прапаноў, даўшы эканоміі 15.000 руб. у год. Рацыяналізатарскія прапановы слесара завода «Ударнік» тав. Кацовіча, які зараз з'яўляецца начальнікам цэха і выконвае свой план на 116 проц., далі 25.000 руб. эканоміі ў год.

Абмяжоўваючыся гэтымі прыкладамі, а іх можна прывесці значна больш, неабходна адзначыць зусім ненармальную з'яву—зменшанне паступленняў рацыяналізатарскіх прапаноў за апошні год.

За другое паўгоддзе 1933 г. паступіла 3734 рац. прапановы супроць 6702 у першым паўгоддзі, прынята 1551 супроць 2312 у першым паўгоддзі.

За першае паўгоддзе 1934 г. на такіх прадпрыемствах, як швейная фабрыка імя Валадарскага, фабрыка «Дзвіна», Магілеўскі трубаліцейны завод, завод імя Домбаля, не паступіла амаль ні адной рацыяналізатарскай прапановы ад рабочых.

Прычына ў тым, што рад гаспадарнікаў упорна ігнаруе дырэктывы ЦК і СНК аб перабудове работы па рацыяналізацыі і вынаходніцтву і не ўскладае гэтыя функцыі непасрэдна на начальнікаў цэхаў, майстраў і тэхнарукаў прадпрыемства.

Насобныя гаспадарнікі, фармальна ліквідаваўшы аддзелы рацыяналізацыі і БРІЗ'ы як функцыянальныя органы, ліквідавалі саму рацыяналізатарскую справу і рабочае вынаходніцтва. У рэзультаце рабочыя прапановы марынуюцца, узнікае валакіта з аплатай прэмій вынаходнікам, не аказваецца дапамога аўтарам у распрацоўцы і рэалізацыі рабочых прапаноў, прэміяванне часта зводзіцца да аплаты «за ініцыятыву». З такімі з'явамі трэба неадкладна пакончыць.

У барацьбе за ўздым прадукцыйнасці працы актуальнейшае значэнне мае ўкараненне тэхпромфінплана—гэтай вышэйшай формы планавання. Прыцягненнем усіх рабочых і ІТР прадпрыемства да распрацоўкі тэхпромфінплана, максімальна забяспечваецца магчымасць выявіць усе фактары выканання і перавыканання плана.

Тэхпромфінплан у прамысловасці БССР укараняецца недастатковымі тэмпамі. Лепшыя прыклады паказвае завод «Большэвік». Вядзецца падрыхтоўка і на некаторых іншых прадпрыемствах. Вопыт перадавых прадпрыемстваў Масквы і Ленінграда і нашага завода «Большэвік» неабходна скарыстаць, каб фарсіраваць укараненне тэхпромфінплана.

Тав. Сталін на XVII партз'ездзе ўказаў:

> «З усіх дасягненняў прамысловасці, заваяваных ёю за справаздачны перыяд, самым важным дасягненнем трэба лічыць той факт, што яна здолела за гэты час выхаваць і выкаваць тысячы

новых людзей і новых кіраўнікоў прамысловасці, цэлыя слаі новых інжынераў і тэхнікаў, сотні тысяч маладых кваліфікаваных рабочых, асвоіўшых новую тэхніку і рушыўшых уперад нашу соцыялістычную прамысловасць».

Ад гэтых людзей і новых кадравых папаўненняў другой пяцігодкі поўнасцю залежыць ажыццяўленне пад кіраўніцтвам партыі намечаных тэмпаў росту прадукцыйнасці працы і скарыстанне ўсіх перавагаў нашых соцыялістычных вытворчых адносін для максімальнага забеспечання «самага важнага і самага галоўнага»—безупыннага росту прадукцыйнасці працы. А для гэтага трэба ліквідаваць разрыў паміж вытворчай базай, якая ўсё больш і больш удасканальваецца, і захаваўшымися яшчэ ва многіх галінах прамысловасці адсталымі метадамі кіраўніцтва і арганізацыі вытворчасці.

Арганізацыя кіраўніцтва, як гэта указаў тав. Сталін у дакладзе на XVII партз'ездзе, павінна быць узнята да ўзроўню палітычнага кіраўніцтва.

А. Архіпаў
Нач. палітаддзела
соўгаса „Кухцічы"

За ўмацаванне жывёлагадоўчага соўгаса

Ліпеньскі пленум ЦК ВКП(б) указаў, што «асноўным звяном у справе ўздыму жывёлагадоўлі з'яўляецца разгортванне **калгасных таварных ферм і ўмацаванне жывёлагадоўчых соўгасаў».**

Пленум ЦК КП(б)Б даў разгорнутую практычную праграму работы жывёлагадоўчых соўгасаў БССР, якая забяспечыць рэалізацыю рашэння пленума ЦК ВКП(б) аб ўмацаванні соўгасаў іператварэнні іх **у рэнтабельныя, перадавыя сельска-гаспадарчыя прадпрыемствы.**

У поўнай сіле застаюцца словы тав. Сталіна на XVI з'ездзе партыі аб тым, што соўгасы з'яўляюцца становым хрыбтом перабудовы **старога ўкладу вёскі.**

Суровая крытыка работы соўгасаў на пленумах ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б павінна дапамагчы ліквідаваць адставанне і ў хуткім часе **вывесці соўгасы на перадавыя пазіцыі сельскай гаспадаркі.**

У барацьбе за ўздым усёй жывёлагадоўчай гаспадаркі соўгасы з іх больш перадавою тэхнікай, палепшаным **пагалоўем** стада, кадрамі спецыялістаў і кваліфікаванымі рабочымі, могуць і павінны быць якасна вядучай сілай, дапамагчы ў разгортванні і ўмацаванні калгас**ных таварных ферм**

На 10 жніўня 1934 г. у свінагадоўчых і жывёлагадоўчых соўгасах БССР лічыцца свіней 117 тыс., буйнай рагатай жывёлы—46 тысяч галоў.

На прыкладзе аднаго з свінагадоўчых соўгасаў менскага Свінаводтрэста—соўгаса «Кухцічы», Уздзенскага раёна мы хочам пака**заць, як партыйная арганізацыя на чале з палітаддзелам за гэты невялікі адрэзак часу пасля пленума ЦК змагаецца за правядзенне ў жыццё яго рашэнняў.**

Соўгас «Кухцічы» па сваёй вытворчай магутнасці—сярэдняе прадпрыемства ў сістэме менскага Свінаводтрэста.

Яго паказчыкі:

Ворнай зямлі	[illegible] га
Сенажаці	[illegible]
Коней рабочых (без маладняка)	38
Трактароў	2
Аўтамашын	2
Свінаматак	200
Усяго свінапагалоўя (на 1 жніўня)	[illegible]
Кароў	76

Аднак, удзельная вага соўгаса вымяраецца не толькі колькаснымі паказчыкамі, не наяўнасцю жывога і мёртвага інвентара, а лічбамі здачы прадукцыі дзяржаве.

Соўгас «Кухцічы» павінен здаць у 1934 г. 1093 цнт. мяса і 35 цнт. масла. Калі прыняць пад увагу, што соўгас «Кухцічы» не толькі сярод трэстаўскіх, але адзін з нямногіх у рэспубліцы даў прыбыткі ў 1933 годзе, то надзвычайна цікава прасачыць работу і перспектывы такога соўгаса ў святле рашэнняў апошніх пленумаў ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б.

На прыкладзе соўгаса «Кухцічы» можна прасачыць паасобныя буйныя недахопы, уласцівыя пэўнаму раду соўгасаў, на гэтым-жа прыкладзе можна практычна ўказаць шляхі для ліквідацыі адставання, бачыць дзелавую работу партарганізацыі.

Прасочым за паасобнымі ўчасткамі работы.

* * *

Кармавая база. Адзін з асноўных і рашаючых фактараў развіцця жывёлагадоўлі ў нашых соўгасах—гэта забяспечанасць гаспадаркі кармамі. Наркамзем СССР т. Чарноў у артыкуле, змешчаным у час. «Социалистическая реконструкция сельского хозяйства» (№ 7, стр. XXIX) прыводзіць наступныя нармальныя рацыёны кармлення (у проц.):

Кармы	для кароў	для свіней
Грубыя	40	5 (прыкладна)
Сакавітыя	35	35
Канцэнтраваныя	[illegible]	60

Фактычнае размеркаванне рацыёна ў соўгасе Кухцічы

Кармы	для кароў	для свіней
Грубыя	89	4
Сакавітыя	10	25
Канцэнтраваныя	1	71

З гэтага параўнання перш за ўсё бачым рэзкую колькасную розніцу паміж рацыёнамі кароў і свіней. Карова ў соўгасе займала апошняе месца і яшчэ зараз не задавальняецца. Некаторыя дырэктары соўгасаў лічаць, што ў свінагадоўчай гаспадарцы буйная рагатая жывёла абслугоўваецца ў другую чаргу. Ці трэба крытыкаваць такую з дазволу кажучы «тэорыю»?

З табліц таксама відаць, што соўгас мае вялікую патрэбу ў канцэнтраваных кармах—да 700 тон у год—галоўным чынам пакупных, бо ўласнымі канцэнтратамі, выходзячы з сярэдняга ўраджаю і наяўнага пагалоўя, соўгас забяспечвае [illegible] на 15–16 проц., тым часам як грубымі і сакавітымі—да 100—110 проц.

Залежнасць у кармах на 80—85 проц. ад прывазных, пагроза перабояў у снабжэнні, асабліва далёкіх ад чыгункі соўгасаў, можа прывесці і прыводзіць да вялікіх гаспадарчых страт.

У барацьбе за колькасць кармоў трэба дабівацца галоўным чынам павышэння ўраджайнасці. Для прыкладу параўнаем ўраджайнасць двух суседніх соўгасаў—«Кухцічы» і малочнага соўгаса «Уздзянка», зямельныя масівы якіх якасна мала чым розняцца.

Прыводзім даныя па ўраджаю 1933 г., бо за 1934 год няма яшчэ дакладных вестак, прыкладна-ж суадносіны застаюцца аднолькавыя

	„Кухцічы“	„Уздзянка“
Жыта	13,05 *цнт на га*	6,45 *цнт на га*
Авёс	8,16 „ „	2,81 „ „
Ячмень.	10 „ „	5,35 „ „
Пшаніца	10 „ „	7,81 „ „
Гарох	9,6 „ „	4,36 „ „

Якасць пасеўных работ, своечасовасць апрацоўкі ворыва, ранняя сяўба, вывазка ўгнаенняў, барацьба са стратамі і т. д.—вось скрытыя патэнцыяльныя рэзервы канцэнтраваных кармоў. Ураджаі соўгаса «Кухцічы», зразумела, не толькі не з'яўляюцца гранічнымі, але з пункту погляду патрабаванняў, якія зараз ставіць партыя перад сельскай гаспадаркай,—мінімальнымі.

На першы погляд можа здацца, што з грубымі і сакавітымі кармамі справа ідзе добра. Аднак, у нас не толькі няма павышэння ўраджайнасці сена, але наадварот—заўважваецца зніжэнне, якое можа цягнуцца і далей, калі не правесці хоць-бы прасцейшых агратэхнічных мерапрыемстваў у лугавой гаспадарцы. У 1933 г. соўгас «Кухцічы» сабраў з 1 га 17 цнт. сена, у 1934 годзе 11½—12 цнт.

Не кажучы ўжо аб вельмі эфектыўных мерапрыемствах, як пасеў траў, мінеральныя ўгнаенні, якія могуць даць сотні і тысячы тон грубых і сакавітых кармоў, трэба правесці самае простае, пасільнае кожнаму соўгасу: зрэзку купін, ачыстку ад кустоў і т. д.

Зусім нездавальняюча прывіваюцца ў соўгасах севазвароты. Сілосныя культуры, аднагадовыя і шматгадовыя травы займаюць у «Кухцічах» 25 проц. плошчы. Прычым, калі вясною гэтага года патрэбна было засеяць 22 га канюшынай, а ў соўгасе свайго насення не было, то прыйшлося наладзіць абменныя аперацыі з калгасамі літаральна на кілограмах. Насенне было надзвычай нізкай якасці, і ўраджаі атрымалі дрэнныя.

Пасевы канюшыны—адной з важнейшых культур не толькі для корму жывёлы, але і для павышэння ўраджайнасці зернавых—павінны быць пашыраны. А таму соўгасы ў першую чаргу павінны клапаціцца аб тым, каб мець уласнае насенне.

Першы ўкос сена прайшоў здавальняюча, аднак другі ўкос не ў пашане. Лічаць нават магчымым і план недавыконваць і раздаць нека-

торую колькасць з га за тыя ці іншыя работы, замест аплачвання іх грашыма.

Партыйная арганізацыя соўгаса паставіла мэтай не дапусціць продажы ні аднаго га сена, бо другі ўкос дасць не менш 50 проц. першага, т. зн. сотні тон сена ва ўмовах кожнага соўгаса.

План сыласавання к 15 жніўня соўгас выканаў на 27 проц.—80 тон з планавых 300 тон. Ставім сабе мэту—перавыканаць план на 50—70 тон у камсамольскі звышпланавы фонд, для чаго мабілізуем усе сілосныя рэсурсы бульбяннік, бацвінне і т. д., таксама і рабочыя са сваіх індывідуальных гародаў даюць бацвінне на сілос.

Важнае значэнне ў гаспадарцы маюць пытанні скарыстання кармоў. Калі даць жывёле брудную ці марожаную бульбу і караняплоды, нясечаную, незапараную сечку, неамолатыя канцэнтраты, то эфектыўнасць корму ў значнай меры знізіцца.

Нядобраякасная падрыхтоўка кармоў звязана не толькі з недахопам перарабляючых корм машын. Яны ёсць у цэлым радзе соўгасаў, але не скарыстоўваюцца, бо, вядомая рэч, лягчэй і хутчэй прыгатаваць корм з неадсартаванай, бруднай бульбы, неразмолатага аўса. Практыка соўгаса «Кухцічы» ведае дзесяткі выпадкаў абсалютна недапушчальных адносін да прыгатавання корму. Палітаддзел на канкрэтных участках вучыць змагацца за высокаякаснае кармленне жывёлы.

Задача, пастаўленая ліпеньскім пленумам ЦК КП(б)Б аб забеспячэнні соўгасаў перапрацоўваючымі корм машынамі: біттэрд, малатковыя млыны, зернадрабілкі, кормазапарнікі і т. д., з'яўляецца першачарговай, бо насычанасць соўгасаў імі яўна недастаткова.

У практыцы работы соўгаса не зжыты яшчэ выпадкі разбазарвання кармоў, няўважлівых адносін да захавання іх і т. д. Выдаткаванне і ўлік кармоў усё яшчэ пастаўлены ў нас нездавальняюча. Бывае часта, што рацыёны складаюцца са спазненнем, або не з'яўляюцца дакументам, фактычна рэгулюючым выдаткі корму. Прыём без вагі, «на глазок» стварае спрыяючую глебу для раскрадвання. Таму, побач з барацьбой за ўласную кармавую базу, трэба навесці рашучы бой супроць раскрадвання і разбазарвання кармоў, за іх эканомнае выдаткаванне.

Ад ступені забяспечанасці ўласнымі кармамі, ад эфектыўнасці іх выкарыстання, ад пастаноўкі ўліку залежыць і кошт кармоў. Нельга забываць, што кармы ў расходах на свінагадоўлю займаюць каля 50 проц. Таму адна з галоўных крыніц рэнтабельнасці жывёлагадоўчых соўгасаў—гэта падзешаўленне кармоў.

Спецыялізацыя соўгаса. У БССР 101 свінагадоўчы соўгас з 118 жывёлагадоўчых, прычым свінагадоўчыя соўгасы маюць каля 14 тысяч галоў буйнай рагатай жывёлы.

Спецыялізацыя раду соўгасаў устанаўлялася выпадкова а часам нават і па-шкодніцку. Свінарнікі нярэдка будаваліся на балотах, багатыя лугі свінагадоўчых соўгасаў поўнасцю не выкарыстоўваліся, свінагадоўчыя соўгасы мелі малую ворную плошчу, тым часам як жывёлагадоўчыя, маючы меншы патрэбы ў канцэнтратах, атрымалі больш пахаці, затое мала лугу і т. д.

Возьмем для прыкладу хоць-бы тыя-ж соўгасы: «Кухцічы» і «Уздзянка».

Соўгас «Кухцічы» мае 326 га ў большасці высокаякаснай сенажаці. Пры 149 галовах буйнай рагатай жывёлы (уключаючы маладняк) і 59 конях (таксама з маладняком) выходзіць нават лішак сенажаці, ад

50 да 60 га, які перадаецца іншым свін[illegible]соўгасам, што знаходзяцца на адлегласці 50—80 кіламетраў ад «Кухцічы».

Соўгас «Уздзянка» пры 260 гал. буйнай рагатай жывёлы і 43 конях (таксама уключаючы маладняк) мае толькі 172 га сенажаці горшай якасці і адчувае недахоп у сене.

Зусім іншы малюнак па ворнай плошчы: соўгас «Уздзянка», не маючы ніводнай свінні, карыстаецца [illegible] га, а соўгас «Кухцічы», з двухтысячным [illegible], мае [illegible]. Камента[illegible] к такой «спецыялізацыі» наўрад ці патрэбны.

Пленум ЦК КП(б)Б [illegible] у адпаведнасці з кармавой базай, свіне[illegible] буйную рагатую жывёлу— у свінагадоўчыя соўгасы. [illegible], вузкая спецыялізацыя, ствараюцца ўмовы для [illegible] развароту соўгаснай жывёлагадоўлі.

[illegible] сур'ёзна і ўважліва[illegible] правесці размеркаванне і [illegible] па соўгасах БССР, згодна [illegible] пленума ЦК КП(б)Б.

> «Расставіць пагалоўе буйнай рагатай жывёлы і свіней па соўгасах у адпаведнасці з магчымасцямі стварэння ў кожным соўгасе [illegible] уласнай кармавой базы».

[illegible] такога [illegible] бясспрэчна.

Укажам [illegible] падыходу да [illegible] у соўгасе «Кухцічы» і перакідка яго ў соўгас «Уздзянка»—на адлегласць [illegible] кіламетры. Наўрад ці апраўдаецца затрата вялікіх грошай [illegible] у новых свінарнікаў у соўгасе «Уздзянка», калі ў «Кухцічах» свінарнікі будуць пуставаць.

У [illegible] соўгасе [illegible] кармамі з 16 прац. дойдзе да 40—50 прац. [illegible] ураджайнасці, а ён павінен і будзе з года ў год расці.

[illegible] і сенакосу будзе таксама даволі. Адпадзе неабходнасць [illegible] іншым далёкім соўгасам. [illegible], што там, дзе есць [illegible], не сена павінна ісці к жывёле, а жывёла к сену.

[illegible] соўгасаў усё-ж будуць рэдкі, бо неабходнаю ўмовай для гэтага з'яўляецца тэрытарыяльная блізкасць. Наяўнасць [illegible] матываў у спалучэнні са спрыяючым размяшчэннем дазваляе [illegible] нашых соўгасаў. Наш новы соўгас не будзе гігантам. Яго паказчыкі: ворыва—974 га, лугу—500 га, пашы—180 га, свіней 2000 галоў, буйнай рагатай жывёлы 450—500 галоў, коней 100—110, трактароў—7.

Зоатэхнічная і ветэрынарная работа. Зусім правільна рэзкая ацэнка, дадзеная пленумамі ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б становішчу зоатэхнічнай справы. Яна ў поўнай меры датычыць і тых соўгасаў, якія, хоць і насычаны спецыялістамі, але работу арганізавалі слаба, са спазненнем, або зусім не праводзілі элементарных зоатэхнічных мерапрыемстваў, [illegible] практычных вывадаў з іх не рабілі.

Такім з'явіўся і соўгас «Кухцічы». Напрыклад, [illegible] маток, узважванне [illegible], аналіз малака і т. д. і т. п.

або зусім не праводзілася, або несістэматычна, хоць былі на гэта два малодшыя і адзін старшы зоатэхнікі.

Цяпер па ініцыятыве палітаддзела выпрацаваны календарны парадак зоатэхнічных работ, ліквідуецца загрузка спецыялістаў канцылярскай работай. Уведзены намі парадак з'яўляецца толькі пачаткам, толькі першай часткай работы, бо практыка сігналізуе небяспеку фармальнага падыходу да зоатэхнікі: зрабіў аналіз малака, вывеў табліцу, аддаў куды належыць, і так—да новага аналіза, узважыў цялят ці парасят, запісаў у табліцу, і на гэтым кропка. Такога падыходу не павінна быць.

Рэзультат [illegible] зоатэхнічнага [illegible] павінен служыць сігналам для [illegible] ненармальнасцей у рабоце. [illegible] узважванне цялят паказвае, што [illegible] на асобы ўлік, наладзіць спецыяльнае кармленне, [illegible] паказчыкаў у наступную дэкаду. Толькі так трэба глядзець на [illegible].

Ламаючы фармалізм у зоатэхнічнай рабоце, [illegible] не дабіўся поўнага поспеху ў тым, каб зоатэхнічныя [illegible] і практычна выкарыстоўваліся ў соўгасе. А [illegible] да канца гэту задачу—значыць не задаволіць патрабаванні, якія станці[illegible] [illegible] жывёлагадоўлі. Зоатэхнік—інжэнер жывёлагадоўлі—не павінен ператва[illegible] [illegible] тэхнікі, каб лягчэй можна было выканаць задачу, пастаўленую партыяй перад усёй краінай: дабіцца бліскучых перамог у жывёлагадоўлі.

На [illegible] кім яшчэ ўзроўні і ветэрынарная работа. Аб прафілактыцы за[illegible], а ў рэзультаце рабочы дзень трацяцца на лячэнне усе[illegible] [illegible] захварэўшай жывелы. І не выпадкова, што ас[illegible] [illegible], чумы ці іншай заразы, але [illegible] ўдзельная вага паратыфа. [illegible].

У [illegible] Неабходна увесці амбулаторныя кнігі з [illegible] аптэку, устанавіць спецыяльны [illegible] [illegible] равана на прафілактыку: агляд стада, кармоў і інш.

Галоўным памочнікам ветперсанала ў барацьбе з эпідэміямі, [illegible] з'яўляецца жывёлагадоўчая брыгада. Яна павінна добра [illegible] зоаветмінімумам. Таму задача зооветперсанала соўгасаў—стаць у [illegible] тан галіне актыўным арганізатарам вучобы сярод членаў жывёлагадоўчай брыгады.

[illegible] НКСоўгасаў аб заработнай [illegible] нную зарплату [illegible] брыгадзіраў і [illegible] мум і [illegible] тэхнікай жывёлагадоўлі. Гэта [illegible] дапаможа членам брыгады хутчэй [illegible] тэхнікай [illegible].

Практыка паказвае, што [illegible] дае большы эфект і лепшыя поспяхі, [illegible] і т. д.

Асаблівую увагу трэба удзяліць павышэнню кваліфікацыі самых спецыялістаў. Без сур'ёзнай работы над сабой спецыяліст безспрэчна асуджан на рэгрэс.

Цягавай сілы у соўгасах недастаткова, хоць і маюць яны ў сваім распараджэнні вялікі трактарны парк. Не спыняючыся на радзе пы-

таннямў, звязаных з конскім пагалоўем, укажам на усім вядомы срода[illegible]дак выкарыстання быкоў і ялавых кароў. Трэба проста сказаць, што кіраўнікі гаспадарак недаацэньваюць звязаныя з гэтым магчымасці, і зусім бесклапотна адносяцца да іх партыйныя арганізацыі.

Нядаўна мы пачалі абучаць рагатую жывёлу для транспартных мэт, што выклікала з боку многіх, нават партыйцаў, насмешкі. Аднак, мы разлічваем, што праз месяц-паўтара усе ўнутраныя перавозкі будзем праводзіць толькі на буйной рагатай жывёле.

Сувязь з калгасамі. Стада калгасных тавар[illegible] ферм, асабліва свіное, можа паляпшацца ў значнай меры за лік соўгасаў. Продажа парасят па нарадах і абмен свінаматак [illegible] соўгас [illegible] узнаўленне,—вось шлях, па якім [illegible] дапамога калгасным фермам. Соўгас «Кухцічы» гэту работу яшчэ [illegible] пачаў. Поўнасцю ўкамплектавана [illegible] калгасная ферма і [illegible] яшчэ некалькі. Свінагадоўчы соўгас «Кухцічы» [illegible] у раёне. Там большасць калгасных св[illegible] ферм, якія маюць [illegible] пародзістую жывёлу, атрымоўваюць з соўгаса [illegible] у парадку абмену на адпаведную колькасць [illegible].

Шэфства соўгаса над калгаснымі жывёлагадоўчымі фермамі дапаможа росту жывёлагадоўлі [illegible].

Павышэнне матар'яльна культурнага ўзроўню рабочых соўгасаў. Соўгас «Кухцічы» мае [illegible] рабочых [illegible] [illegible] [illegible] [illegible].

[illegible] культурнага ўзроўню рабочых. [illegible] рад мерапрыемстваў, [illegible] соўгас [illegible] у гэтым годзе [illegible] 0,8 да 0,15 га, [illegible] насенне. [illegible] ма[illegible]лочных кароў. На [illegible] па 200—300 рублёў авансу [illegible] год [illegible] адчынен дзіцячы сад, школа, пошта і [illegible]каса

Немалаважную ролю адыгралі льготы, устаноўленыя для сезонных рабочых, як вядучай прафесіі, [illegible] 5 год. У параўнанні з іншымі [illegible] яны [illegible] норму прадуктаў і промтавараў, дадатковыя адпачынкі і шэраг іншых льгот.

Ініцыятарам гэтага важнейшага мерапрыемства быў соўгас «Кухцічы». Асобым рашэннем ЦП РЖС [illegible] рабочым усіх соўгасаў БССР выкарыстаць вопыт «Кухцічаў», выходзячы з мясцовых умоў. Зараз ужо ў дзесятках соўгасаў БССР [illegible] перавагі для рабочых вядучых прафесій і рабочых з вялікім стажам

Партарганізацыя соўгаса «Кухцічы» мае 17 членаў і кандыдатаў і 5 спачуваючых. Яна падзелена на дзве першасныя арганізацыі —палявога цэха і свінафермы, на чале якіх стаяць парторгі. Поўнасцю партарганізацыі кіруюцца палітаддзелам, праз парторгаў.

Акрамя звычайнага кола партабавязкаў, кожны партыец атрымлівае пастаянна на 10 дзён з указаннем даручэнняў, якія ён павінен выканаць. Партнарады [illegible] вялікую карысць, калі правільна пастаўлен кантроль і дапамога паасобным таварышам. Яны вучаць як трэба працаваць, уцягваюць усю арганізацыю ў планавую, канкрэтную работу.

* * *

За чарговымі сельска-гаспадарчымі кампаніямі не забываем агульных палітычных пытанняў. Даклад аб апошніх падзеях у Германіі выклікаў вялікую зацікаўленасць рабочых. Штодзённа, за 20—30 мінут да пачатку работы, дзяжурны палітаддзелец інфармуе аб палітычных навінах, увязваючы іх з чарговымі работамі соўгаса. Вось чаму датэрміновае выкананне соўгасам гадавога плана хлебаздачы расцэньвалася кожным рабочым соўгаса, як палітычная перамога.

За год вырас партыйны актыў рабочых, узмацнілася партарганізацыя, расце комсамол. У рэзультаце паспяхова прайшла уборка, уважлівей сочаць за якасцю работы.

Гістарычныя словы т. Сталіна на XVII з'ездзе аб тым, што: «Справу жывёлагадоўлі павінны узяць у свае рукі уся партыя, усе нашы работнікі, партыйныя і беспартыйныя, маючы на ўвазе, што праблема жывёлагадоўлі з'яўляецца зараз такой-жа першачарговай праблемай, якой была учора ўжо вырашаная з поспехам праблема зернавая», не толькі сталі агульнавядомы, але і практычна ператвараюцца ў жыццё.

Аднак, галоўная работа яшчэ ўперадзе, і мы апраўдаем словы правадыра:

«Совецкія людзі, браўшыя не адну сур'ёзную перашкоду на шляху да мэты, змогуць узяць і гэту перашкоду».

Жывёлаводы соўгасаў БССР павінны даць і дадуць бальшэвіцкія паказчыкі па ўзнаўленню стада, стварэнню ўстойлівай кармавой базы і войдуць у перадавыя шарэнгі соўгасаў БССР

В. Надаль

Аб палітыцы совецкага гандлю

Совецкі гандаль—гэта гандаль без прыватнікаў, без капіталістаў

> «Мы дабіліся таго, што за апошні [illegible] з [illegible]звароту прыватнага гандляра, купца, пасрэдніка [illegible]» (І. Сталін).

Совецкі гандаль—гэта гандаль, поўнасцю арганізаваны і арганізуемы совецкай дзяржаваю. [illegible] цыя працуюць па планах, [illegible] зацыям урад зацвярджае не толькі планы, [illegible] Гэты гандаль поўнасцю [illegible] гасны, арганізуемы прол[illegible] метадамі. Тут дзейнічае не [illegible] кольці эканамічнае уздзеянне [illegible] знаходзяцца ў распараджэнні дзяржавы. Дзярж[illegible] на калгасны гандаль праз сістэму дзяржаўных цэнт[illegible]ных загатовак, [illegible] аб'ём калгаснага [illegible] і кааператыўнага камерцыйна[illegible] вень калгасных цэн і няўхільнае [illegible] на калгасны гандаль, выкарыстоў[illegible] загатоўцаў, застаўляючы іх [illegible] нах, зацверджаных дзяржавай.

Совецкі гандаль—гэта гандаль, які развіваецца на аснове спаборніцтва паасобных [illegible] пад кіраўніцтвам дзяржавы і яе кантролем. Пытанне аб [illegible] у першую чаргу ў залежнасці ад таго, [illegible] забяспечвае найбольш быстрае і [illegible] прасоўванне тавараў спажыўцу.

Рэзка ўзрастаюць магчымасці адваротнага ўздзеяння тавараабароту на развіццё прамысловасці ў параўнанні з усімі папярэднімі тэмпамі развіцця тавараабароту ў нашай краіне.

У рашэннях 17 партыйнай канферэнцыі спецыяльна запісана:

> «Разгортванне тавараабароту—перш за усе розніцы і праводзенне прынцыпа гаспадарчага разліку ва ўсёй гаспадарчай рабоце з'яўляецца важнейшым стымулам для выяўлення наяўных у нашай гаспадарцы атрыманых і далёка яшчэ нявыкарыстаных рэзерваў».

Совецкі гандаль—такі гандаль, які ліквідуе ўсякія астаткі метадаў гандлёвай работы, характэрных і уласцівых у той ці іншай форме капіталістычнаму гандлю.

Совецкі гандаль—гандаль поўнасцю пастаўлены на службу вытворчасці, садзейнічаючы ўзмацненню соцыялістычных адносін да працы і развіццю соцыялістычных форм арганізацыі працы.

Усе гэтыя задачы найбольш выразна сфармуляваны ў прамове тав. Сталіна на XVII партз'ездзе:

> «Каб эканамічнае жыццё краіны магло забіць ключом, а прамысловасць і сельская гаспадарка мелі стымул к далейшаму росту сваей прадукцыі, трэба мець яшчэ адну умову, а іменна,—разгорнуты таваразварот паміж горадам і вёскай, паміж раенамі і абласцямі краіны, паміж рознымі галінамі народнай гаспадаркі. Неабходна, каб краіна была пакрыта багатай сеткай гандлёвых баз, магазінаў, крам. Неабходна, каб па каналах гэтых баз, магазінаў, крам безупынна цыркулявалі тавары ад месц вытворчасці да спажыўца. Неабходна, каб у гэту справу былі ўцягнуты і дзяржаўная гандлёвая сець, і мясцовая прамысловасць, і калгасы, і аднаасобныя сяляне.
>
> Гэта і называецца ў нас разгорнутым совецкім гандлем, гандлем без капіталістаў, гандлем без спекулянтаў».

Якія-ж асаблівасці совецкага гандлю ў другой пяцігодцы?

Першая—мяняецца расстаноўка прамысловасці і адпаведна з гэтым па-новаму ўстаюць цэлы рад задач гандлю.

Побач з узмацненнем мясцовай прамысловасці мяняецца само размяшчэнне лёгкай і харчовай прамысловасці, якія набліжаюцца да крыніц сыравіны і раенаў спажывання.

Набліжэнне прадпрыемстваў да раенаў сыравіны і спажывання стварае асабліва спрыяючыя умовы для ажыццяўлення адваротнага ўздзеяння на паасобныя прадпрыемствы, для прыстасаблення іх вытворчасці да канкрэтных патрэб данага раена, данай групы спажыўцоў.

Другая—агромны рост рэсурсаў у краіне, пры адначасовым росце культурнага ўзроўню вядзе к таму, што вырастае попыт на тавары больш высокай якасці і рознастайнага асартымента.

Трэцяя—совецкі гандаль у другой пяцігодцы будзе развівацца ў абстаноўцы няўхільнага зніжэння цэн, што таксама спрыяе павышаным патрабаванням к асартыменту і якасці тавараў.

Чацвертая—гандаль будзе развівацца на аснове спалучэння двух форм: закрытай і адкрытай, пры няўхільным і сістэматычным росце адкрытага гандлю.

Пятая—рост заможнасці калгаснай вёскі мяняе старыя ўяўленні аб попыце горада і вёскі. Той факт, што к канцу другой пяцігодкі жыццевы ўзровень калгасніка будзе вышэй жыццевага ўзроўню заможнай сялянскай гаспадаркі 1927 г., гаворыць сам за сябе, гаворыць аб росце магчымасцей калгаснага сялянства задавальняць свае бытавыя патрэбнасці.

Правільная арганізацыя совецкага гандлю немагчыма без штодзеннай разгорнутай барацьбы на два фронты: супроць праваапартуністычных спроб падмяніць совецкі гандаль так званым чыстым гандлем, арганічна не звязаным з усімі працэсамі арганізацыі соцыялістычнай вытворчасці і супроць левацкіх спроб пераскочыць праз этапы совецкага гандлю.

Мы маем зараз дзве формы снабжэння, гандлёвага абслугоўвання закрытую і адкрытую. На 1 студзеня гг. створана 2 442 орсы, якімі ахоплена 16.429.300 рабочых, служачых і членаў іх сямействаў.

Рашучае значэнне ў сістэме снабжэння рабочых вядучых галін гаспадаркі маюць орсы, што відаць хоць-бы з таго, што па НКПС орсы ахопліваюць 100 проц. усіх рабочых, па цяжкай прамысловасці Саюза —да 70 проц. усіх рабочых, па лёгкай прамысловасці—45 проц.

На працягу ўсёй другой пяцігодкі будуць існаваць абедзве формы снабжэння—закрытая і адкрытая. Суадносіны паміж імі, натуральна, будуць мяняцца. Пры захаванні ў асноўным колькасці прадуктаў, адпускаемых праз закрытую форму снабжэння мы будзем мець паралельна узмоцнены рост адкрытага гандлю, які ахоплівае адзін прадукт за другім, адну область за другою. Калі ў пачатку другой пяцігодкі пераважную ролю адыгрывалі закрытыя формы снабжэння, то ў другой палове пяцігодкі такая роля будзе належаць бясспрэчна адкрытым формам гандлю.

Увесь прырост дзяржаўных рэсурсаў ад загатовак, ад пашырэння [illegible] будзе ў пераважнай сваёй частцы йменна на разгортванне адкрытага гандлю.

Орсы стварылі прадпасылкі для аслаблення ўраўнілаўкі ўнутры прадпрыемства. Але закрытая сістэма снабжэння не зможа забяспечыць поўную адпаведнасць грашовага заработку з нормамі снабжэння. Тым часам задача правільнай арганізацыі гандлю ў сучасны момант заключаецца ў тым, каб задаволіць патрэбнасці рабочых з заработкам у 200—250 руб. у месяц, а таксама рабочых і спецыялістаў з заработкам у 500—700 руб. у месяц. Таму важным дадаткам да нармаванага снабжэння з'яўляецца адкрыты гандаль, які стымулюе зацікаўленасць рабочага ў росце прадукцыйнасці працы, у павышэнні сваёй кваліфікацыі, у пераходзе з ніжэйшага разрада ў вышэйшы.

Якім чынам будзе ажыццёўлен пераход ад двух форм арганізацыі гандлю—адкрытай і закрытай—да адзінага, поўнасцю адкрытага, разгорнутага гандлю?

Зараз можна гаварыць толькі аб асноўных контурах. З двух канцоў трэба падыходзіць да ліквідацыі цэнтралізаванага размеркавання: узмоцнена разгортваць адкрыты гандаль (гэта і намечана ў плане на 1934 г.: удзельная вага адкрытага гандлю павялічваецца да 25 проц. у агульным таваразвароце); адначасова павялічыць рэсурсы снабжэння закрытай сеці не за лік павелічэння водпуску дзяржаўных фондаў паасобным орсам і ЗРК (гэтыя рэсурсы застануцца нязменнымі), а за лік росту таварнасці ўласнай гаспадаркі, і, што асабліва важна, за лік пашырэння загатовак фабрыкамі, заводамі, спажывукааперацыяй.

Даволі сказаць, што к канцу другой пяцігодкі паступленне мяса з [illegible] гаспадарак павінна павялічыцца ў 8 раз; малака і малочных прадуктаў—у 3 разы; бульбы—у 2 разы; гародніны—у 3 разы. Калі пры гэтым улічыць тэмпы росту калгаснага гандлю, то зусім відавочны становяцца крыніцы пашырэння гандлю орсаў.

Адкрыты гандаль адрозніваецца ад закрытага больш высокімі цэнамі і адменай абмежавання водпуску паасобных тавараў у адны рукі.

Такая бюракратызацыя кантролю не толькі не дае правільнага ўяўлення аб захаванні ўстаноўленых цэн, але яшчэ горш, завуалёўвае падчас надта дрэнную, безгаспадарчую работу гандлёвага апарата орса.

Не сакрэт, што ў радзе звенняў гандлёва-снабжэнчага апарата ёсць імкненне павысіць цэны на тавары, каб пакрыць вялікія выдаткі і безгаспадарчую дзейнасць, што, зразумела, нельга ўлавіць, калі правяраць цэны толькі па балансах.

Кантроль за цэнамі перш за ўсё павінен быць канкрэтным, масавым. Прафесіянальныя арганізацыі як у цэнтры, так і на перыферыі павінны накіраваць сваю кантрольную работу перш за ўсё на ўчастак дзейнасці кааперацыйна-гандлёвых арганізацый.

> «Прафработнікі павінны з усёй рэзкасцю, з усёй вострасцю і напорыстасцю ўзяцца за тую зброю, якую ім даў XVII з'езд партыі,—за масавы кантроль выканання дырэктыў партыі і ўрада, накіраваных на палепшанне дабрабыту працоўных, на паспяховае прадаўжэнне соцыялістычнага будаўніцтва.
>
> Асноўным зместам усёй кантрольнай работы як камісіі партыйнага кантроля, так і масавых арганізацый—прафсаюзаў, камсамола і друку—павінны быць пытанні абслугоўвання мас, пытанні снабжэння, гандлю, вытворчасці і якасці тавараў шырокага спажывання» (Кагановіч).

Трэба прызнаць, што ў гэтай галіне прафсаюзныя арганізацыі зрабілі надзвычай мала. Грубейшыя факты аблічвання спажыўца, прадажа тавару нізкай якасці па цэнах першага гатунку часта адбываюцца ўваччу саміх прафсаюзных арганізацый, але канкрэтныя віноўнікі доўга застаюцца непакаранымі.

Для прыкладу, у прафкамітэце Асінторфа (былы сакратар Осіпцоў) не выводзілася абмерванне і аблічванне спажыўца. Дзяржаўная інспекцыя цэн выявіла, што вагі і іншыя вымерныя прылады былі ў самым безгаспадарчым стане. Пра гэтыя факты добра ведаў прафком, але пытанне не ўзняў і нават не знайшоў часу абгаварыць матар'ялы інспекцыі на прафкамітэце.

Са скажэннямі палітыкі совецкага гандлю і цэн патрэбна бязлітасная барацьба. Каапэрацыйна-гандлёвы апарат павінен быць рашуча ачышчан ад жульніцкіх і пераражджэнскіх элементаў, зацясаўшыхся за совецкі прылавак. Канкрэтных віноўнікаў трэба прыцягваць на аснове дырэктыў партыі і ўрада да суровай адказнасці.

Узорная пастаноўка совецкага гандлю, далейшае паляпшэнне снабжэння працоўных — участак вострай класавай барацьбы. Таму на гэты ўчастак павінна быць мабілізавана рэвалюцыйная пільнасць і энергія большэвікоў, у першую чаргу працуючых у таваралраводзячай сеці.

П. Ечальчык

За высокую якасць работы грамадскіх абаронных арганізацый

Пастановы XVII з'езда ВКП(б) з'яўляюцца разгорнутай праграмай барацьбы за пабудову бяскласавага соцыялістычнага грамадства і канкрэтнай праграмай арганізацыйнай перабудовы работы партыйных арганізацый, усіх органаў пролетарскай дыктатуры і масавых грамадскіх арганізацый для выканання другой пяцігодкі і далейшага ўмацавання абароназдольнасці нашай краіны.

Тав. Сталін у сваім дакладзе на XVII з'ездзе сказаў зусім выразна, што мы павінны прыняць усе меры к таму, каб аградзіць нашу краіну ад нечаканасці і быць гатовымі да яе абароны ад нападу.

Гэтым асабліва падкрэсліваецца агромністая адказнасць нашых грамадскіх абаронных арганізацый (Асоавіяхім, Чырвоны крыж) за сапраўднае разгортванне абароннай работы сярод рабочых, калгаснікаў і ўсіх працоўных, за ўцягненне новых членаў і стварэнне новых пярвічных арганізацый.

Грамадскія абаронныя арганізацыі дасягнулі за апошні год значных поспехаў у справе ахвату шырокіх працоўных мас абароннай работай. Паказчыкі гэтага і шырокае разгортванне стралковага спорта (падрыхтоўка варашылаўскіх стралкоў), арганізацыя аэраклубаў, ударных абаронных брыгад, выконваючых промфінплан на 100—135 проц. (заводы «Большэвік», «Варашылава», фабрыка «Окцябр», Менск, Гомель, Віцебск і інш.), барацьба за моцнага каня (асоарганізацыі Оршаншчыны), рост фізічнага выхавання мас—120 000 здаўшых норму на значок ГПА; арганізацыя санітарна-абароннай работы, санпастоў на прадпрыемствах, у калгасах, саўгасах, якія паказалі ўзоры барацьбы за чыстую сталоўку, чысты завод, рабочую кватэру і т. д. (гомельскі хлебазавод, калгасы «Чырвоны сцяг» і «Інтэрнацыянал»—Уздзенскага раёна). Санпасты раду харчовых прадпрыемстваў праводзяць штодзённа агляд санітарнага становішча паўфабрыкатаў, сыравіны, гатовай прадукцыі і т. п. (Менск, Бабруйск). Бясспрэчна, што вялікае ажыўленне ў масавую гігіена-санітарную работу павінен унесці значок ГСА «Гатоў да санітарнай абароны».

Гэтыя паасобныя факты гавораць аб тым, што абаронныя арганізацыі зрабілі многа для выхавання новага соцыялістычнага чалавека.

Але на фоне гэтых поспехаў ярка вырысоўваецца і наша якаснае адставанне ад запатрабаванняў працоўных і росту нашай тэхнікі, асабліва ў соцыялістычным сектары вёскі. У паасобных раёнах пярвічныя арганізацыі АСО яшчэ не разгарнулі ніякай работы (калгасы «Чырвоны

сцяг», «Леніна», вінзавод «Гарадок», калгас «Чырвоны востраў», «Зара Беларусі»—Кармянскі раён, Плешчаніцы, Лельчыцы і т. д.).

Працоўнае насельніцтва Жыткавіцкага, Лельчыцкага, Суражскага і іншых раёнаў ахоплена членствам АСО, «Чырвонага крыжа» толькі на 6—8 проц. Зусім няма пярвічных арганізацый «Чырвонага крыжа» у Гарадоцкім, Тураўскім, Суражскім раёнах.

У БССР толькі 350 фізкультурных вясковых гурткоў. Значна адстае фізкультурны рух у галіне спартыўнай тэхнікі. Фізкультурныя арганізацыі недастаткова ўважлівы да ваенна-прыкладных раздзелаў комплекса ГПА. Не выканана задача арганізацыі ў калгасах і саўгасах 720 гурткоў фізкультуры, пабудовы спортпляцовак і асабліва пасылкі спортінвентара на вёску. Асабліва дрэнна ўключылася ў гэту работу тавараправодзячая сетка Белаб'яднання культтавараў (БАКТ). Таварыства «Дынамо» не ўлічвае ўзросшых культурных запатрабаванняў вёскі і на справе звужвае асартымент спартыўнага інвентара, які завозіцца ў сельпо.

Значная большасць райсоветаў АСО, «Чырвонага крыжа», фізкультарганізацыі не забяспечваюць выканання пастаўленых партыяй задач. У райсоветах АСО і «Чырвонага крыжа» шмат выпадкаў растрат і раскрадвання сродкаў гэтых арганізацыі (Слуцк, Віцебск, Орша, Чэрыкаў, Жыткавічы, Шклоў і інш.). Да гэтага часу не ліквідавана цякучасць кіруючага складу і ў першую чаргу старшынь райсоветаў АСО і райкамітэтаў «Чырвонага крыжа».

Кармянскі, Лельчыцкі, Дрысенскі, Жыткавіцкі і інш. раённыя советы АСО, фізкультарганізацыі «Чырвонага крыжа» не прыступілі яшчэ да перабудовы сваей работы па сутнасці: перанясенне цэнтра работы ў пярвічную арганізацыю—калгас, саўгас, цэх, брыгаду.

Перавыбары ў пярвічных арганізацыях Асоавіяхіма з асаблівай востраю ставяць асноўную задачу—узмацніць пярвічныя цэхавыя калгасныя і саўгасныя арганізацыі, бо ў пярвічнай арганізацыі АСО рабочы і калгаснік авалодваюць азбукай ваеннай справы. Нашы грамадскія абаронныя арганізацыі павінны зразумець, што сутнасць перабудовы заключаецца перш за ўсё ў тым, каб забяспечыць якасць усей работы і узняць яе на больш высокую ступень, паставіўшы ў цэнтр увагі радавога члена АСО, даўшы кожнаму практычную работу (стралковыя гурткі, хіматрады, авіягурткі, школы снайпераў, ПВА і т. д.).

Нашы пярвічныя арганізацыі абавязаны неадрыўна ўвязваць абаронную работу з вытворчай і на справе апраўдаць словы тав. Варашылава:

> «Асоавіяхімаўскія арганізацыі вядуць агромнейшую работу па выхаванню новага соцыялістычнага чалавека, дысцыплінаванага, фізічна загартаванага, культурнага, узорнага вытворцы».

Выхаваць члена грамадскай арганізацыі можна толькі на практычнай рабоце, а не колькасцю пастаноў, пратаколаў і т. д. Пярвічная арганізацыя будзе жыццездольнай тады, калі кіраўнікі будуць абапірацца на нізавых актывістаў, на іх энтузіязм і ўдзяляць даволі ўвагі перавыбарам пярвічных арганізацый, як гэта зрабіла Чауская партарганізацыя. Чаускі райком партыі на паседжанні бюро абгаварыў ход перавыбараў па асобных сельсоветах і находу выправіў недахопы, прыцягнуўшы да партадказнасці вінаватых у зрыве гэтага важнейшага мерапрыемства.

Перавыбары пярвічнай арганізацыі і райсоветаў праведзены толькі у 16 раёнах, астатнія раёны адстаюць. У Віцебску перавыбары праведзены ў 129 пярвічных арганізацыях з 248, ва Уллачах пераабрана 7 пярвічных арганізацый з 53, у Шклове, Лезне перавыбары не пачыналіся.

Рад пераабраных пярвічных арганізацый бяздзейнічае. Напрыклад, асоарганізацыя калгаса «1 мая», Сушанскага с-с., Лепельскага раёна заняткаў не праводзіць, хоць і прашоў ужо месяц з часу яе перавыбараў.

Адсюль відаць, што райсоветы не зразумелі сутнасці перабудовы, неабходнасці канкрэтнай работы і ўмацавання пярвічнай арганізацыі. Не паказваюць узору ў перабудове і цэнтральныя ўстановы, як ЦС АСО, ВСФК, ЦК «Чырвонага крыжа».

Цэнтральная фігура ў апараце—інструктар. Ён павінен добра ведаць сваю работу, карыстацца аўтарытэтам і быць сапраўдным арганізатарам мас. Аднак, апараты грамадскіх устаноў не укамплектаваны, пры іх няма ні аднаго грамадскага інструктара. Трэба проста сказаць, што работнікі цэнтральных устаноў кіруюць паперкамі, а не жывымі людзьмі. Таму не выпадкова бяздзейнасць асоарганізацыі у раёнах Пешчаніцкім, Лельчыцкім, Жыткавіцкім, Лагойскім і т. д.

Бюракратычныя адносіны да запатрабаванняў раёнаў, калі на працягу 2—3 тыдняў ім не адказваюць (ЦС АСО, ЦК «Чырвонага крыжа»), сведчыць аб тым, што кіруючыя арганізацыі пакуль што займаюцца толькі гутаркамі аб перабудове работы.

Цэнтральныя раённыя апараты ланных абаронных арганізацый павінны нарэшце зрабіць пералом у галіне кіраўніцтва абароннай работай у раёнах і на вёсцы, павінны ўясніць, што асоавіяхімаўскія і астатнія грамадскія арганізацыі на вёсцы становяцца вернымі памочнікамі палітаддзелаў у барацьбе за большэвіцкія калгасы, за соцыялістычнае перавыхаванне шырокіх мас калгаснікаў, баявымі арганізатарамі падрыхтоўкі працоўных мас да абароны соцыялістычнай радзімы.

Практычная абаронная работа на вёсцы павінна ўвязвацца з палітычна-гаспадарчымі задачамі партыі і інтарэсамі МТС соўгасаў і калгасаў. Возьмем падрыхтоўку варашылаўскіх стралкоў. Яна можа і павінна быць увязана з арганізацыяй вартавых каманд па ахове соцыялістычнай уласнасці. Узоры у гэтай справе паказваюць калгасы «Чырвоны Захад» Заслаўскага раёна і «Парыжская комуна», Оршанскага раёна. У гэтых калгасах на чале вартавых каманд стаяць лепшыя ўдарнікі асоавіяхімаўцы. Ліквідацыя ваенна-хімічнай і ПВА няграматнасці сярод працоўных павінна увязвацца з арганізацыяй хімічных атрадаў па барацьбе са шкоднікамі ў сельскай гаспадарцы і т. д.

Хіматрад з'яўляецца формай канкрэтнай абароннай работы. Працуючы ў ім, калгаснікі павышаюць свае аграхімічныя веды. Атрад навучае іх як трэба захоўваць і карыстацца мінеральнымі ўгнаеннямі, як весці барацьбу са шкоднікамі сельскай гаспадаркі. Асабліва вялікае значэнне хіматрадаў зараз, калі падыходзіць прыёмка ўраджаю. Яны могуць і павінны весці сістэматычную работу па барацьбе з амбарнымі шкоднікамі.

Рабоце хіматрэда дапамогуць хаты-лабараторыі, якія павінны быць ва ўсіх калгасах. Гэта новая арганізацыйная форма дапамагае калгаснікам аўладаць тэхнікай сельскагаспадарчай вытворчасці, павысіць ураджайнасць соцыялістычных палёў. Вынікі работы хат-лабараторый вялікія. Яны «гавораць аб тым, што гэта пачынанне, безумоўна, свое-

часовае, што справа гэта патрэбная і верная, дык давайце-ж усе разам па-большэвіцку біцца за ператварэнне хат-лабараторый у сапраўдныя ачагі **агракультуры на вёсцы» (Постышэў).**

Хіматрады павінны сваю работу спалучаць з работай хат-лабараторый. Зусім ясна, што асоавіяхімаўскія арганізацыі павінны змагацца за стварэнне калгасных хат-лабараторый. Вялікая адказнасць цэнтральнага і раённага советаў АСО: яны павінны дапамагчы хатам-лабараторыям **арганізаваць тэхнічную базу для іх работы і т. п.**

У БССР зараз каля 60 такіх хат-лабараторый. Задача кожнага хімічнага атрада **арганізаваць хату-лабараторыю ў сваім калгасе.**

У разгортванні канкрэтнай абароннай работы многа павінны зрабіць хаты-чытальні. Сваю палітасветную работу яны павінны ўвязаць з арганізацыяй вайсковага гуртка, кутка нагляднай літаратуры, плакатаў **і т. д.**

Не менш важнай і канкрэтнай з'яўляецца задача арганізацыі шырокай **сеці ваенізаваных стаень.**

Партыя і ўрад усклалі на АСО грамадскі кантроль і штодзенны клопат аб кані. Кожны кіраўнік і член АСО на справе павінны паказаць **узоры вырошчвання, зберажэння і догляду каня.**

> «Асабліва востра стаіць зараз пытанне аб кані... Конь у нашай краіне зараз і ў далейшым вельмі неабходзен і патрэбен, як ён быў патрэбен і раней, калі ў нас было мала трактароў. Конь не **толькі не процістаіць трактару, не канкуруе з ім, але, наадварот,** яго ва многім дапаўняе, яму дапамагае... Агромнае значэнне мае конь для арміі... Гэтай справай неабходна заняцца неадкладна і **як след, па-большэвіцку» (Варашылаў, выступленне на XVII партз'ездзе).**

Задача кожнай першычнай арганізацыі АСО змагацца за моцнага і здаровага каня, здольнага да працы і абароны краіны. Тым часам гэтыя пытанні не занялі належнага месца ў рабоце асоавіяхімаўскіх **арганізацый МТС, калгасаў і соўгасаў.**

Было-б, вядома, няправільна думаць, што ў барацьбе за каня няма добрых узораў работы. Даволі назваць аршанскую асоавіяхімаўскую арганізацыю са старшынёй т. **Жэромскім,** якая пры актыўнай дапамозе сакратара райкома партыі т. **Соскіна,** старшыні РВК т. **Міцькова,** здолела на працягу года правесці вялікую работу ў калгасах і калгасных стайнях па паляпшэнню догляду за канём, ахапіўшы усе калгасы. Па гэтай перадавой арганізацыі БССР павінны раўняцца усе астатнія.

Канкрэтная абаронная работа ў прамысловасці павінна праходзіць пад лозунгам: ударнік абароны—ударнік вытворчасці. Задача грамадскіх абаронных арганізацый—стварыць на фабрыках і заводах ударныя абаронныя брыгады, якія-б увязалі выкананне промфінплана з абароннай работай: скажам, вывучэнне рабочымі аўтамотасправы з рамонтам трактароў, машын, матораў і т. д.; хіматрады на скураных **заводах вывучаюць хімічны працэс апрацоўкі скуры.**

Прыкладам разгортвання абароннай работы можа служыць завод «Варашылава» (Менск), які ахапіў членствам асотаварыства 90 проц. рабочых, падрыхтаваў 168 варашылаўскіх стралкоў, пабудаваў цір і т. д. Добрыя паказчыкі таго, што ўдарнікі абароны з'яўляюцца ўдарнікамі вытворчасці, падае ўдарна-абаронная брыгада стругалёў 2-га хромавага завода «Большэвік» (брыгадзір **Бенгес).** Брыгада выканала промфінплан на 135.6 проц., 6 рабочых з агульнага ліку 11 здалі ужо

норму на варашылаўскага стралка. Ударная абаронная брыгада 40 м-м свідравальных станков завода «Варашылава», на чале якой стаіць комсамолец брыгадзір т. Давідзюк, выканала промфінплан на 104 проц., з 16 рабочых брыгады варашылаўскімі стралкамі з'яўляюцца 14 чалавек. На фабрыцы «Októбр» абаронная брыгада тав. Ліндэ выканала промфінплан на 101,3 проц., мае 5 варашылаўскіх стралкоў, а брыгада Фішкіна (не абаронная) не мае ні аднаго варашылаўскага стралка, промфінплан выканала на 92 проц.

Асоарганізацыі павінны разгарнуць соцспаборніцтва паміж брыгадамі, каб перанесці добрыя колькасныя і якасныя паказчыкі на вытворчасці і ў абароннай рабоце, вопыт лепшых брыгад на усе прадпрыемствы, заводы і фабрыкі. Іменна ў такой форме павінна спалучацца абаронная работа з ударнай работай на вытворчасці.

Нельга абыйсці і такое пытанне, як арганізацыя і наладжванне сістэматычнай работы ў вучэбных пунктах, лагерах АСО, дзе ў значнай меры ўдзельнічаюць «Чырвоны крыж» і ВСФК, бо «Чырвоная армія па сучаснаму становішчу,—гаворыць т. Варашылаў—мае патрэбу ў культурным, граматным байцу-ўдарніку». Гэтага культурнага байца-ўдарніка павінны падрыхтаваць перш за ўсе вучэбныя пункты і лагеры АСО. Падрыхтоўка і перападрыхтоўка кадраў—адна з важнейшых задач Асоавіяхіма.

Аб вельмі нізкай якасці работы вучэбных пунктаў сведчаць такія факты. Пры праверцы усваення праграмы, пройдзенай Сялінчанскім вучэбным пунктам (Гарадок,—начальнік і палітрук т. Ульянаў), аказалася, што большасць не усвоіла ні ваенных, ні палітычных дысцыплін. Прапрацаваўшы даклад т. Молатава на XVII з'ездзе, не кажучы ўжо аб сутнасці самаго даклада, слухачы не маглі адказаць, хто такі т. Молатаў, хто такі т. Варашылаў. На пытанне для чаго служыць ствольная каробка, адказалі: «для злучэння ложы з іншымі часткамі вінтоўкі». Няма тут і памину аб санрабоце чырвонакрыжнай арганізацыі, аб здачы норм ГПА.

Палітычна-масавай работы на пунктах не праводзіцца. Вучпункты паасобных раёнаў (Карманскі) у час збораў былі засмечаны класава-варожымі элементамі (Ялміненко—сын кулака, Каплан—сын лішэнца і інш.). Гэта лішні раз сведчыць аб няўмелым падборы кіраўнікоў вучпунктамі, аб страце паасобнымі кіраўнікамі вучпунктаў класавай пільнасці.

Агромнай важнасці задача стаіць перад палітрукамі вучпунктаў і лагераў. Ад палітрука, які пастаўлен партарганізацыяй для палітмасавай работы, для павышэння марксісцка-ленінскіх ведаў на пунктах і ў лагерах, мы абавязаны патрабаваць высокаякаснага выкладання марксісцка-ленінскай тэорыі.

Даклад т. Сталіна, прамова т. Варашылава, рашэнні XVII з'езда і пастановы апошніх пленумаў ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б павінны стаць асноўнымі матар'яламі палітычнай работы з дапрызыўнікамі, з усімі членамі грамадскіх арганізацый. Палітзаняткі і пазашкольная работа на пунктах павінны даць працоўнай моладзі сур'ёзнае, бальшэвіцкае, ленінска-сталінскае выхаванне. Толькі пры добрым усваенні рашэнняў з'езда, даклада т. Сталіна, пастаноў пленумаў можна дабіцца поспехаў у ваеннай і палітычнай падрыхтоўцы членаў грамадскіх арганізацый. Гэта вялікая задача ўскладаецца на палітрука.

Прычыны нізкай якасці ваеннай і палітычнай падрыхтоўкі ў менскім, бабруйскім і інш. лагерах—нездавальняючая падрыхтоўка

і слабы падбор кадраў, недастатковая дысцыплінаванасць, слабое кіраўніцтва Цэнтральнага і раённых советаў АСО лагерамі.

Партыйна-палітычная работа ў большасці лагераў пастаўлена была нездавальняюча, якасць палітзаняткаў нізкая (Смалявічы, Менск, Бабруйск, Магілеў), зусім не прапрацавалі паасобных відаў баявой падрыхтоўкі.

Лагерная вучоба закончана. Задача АСО—улічыць памылкі лагернай вучобы і ўзорна падрыхтоўвацца да новага навучальнага года. Перш за ўсё арганізаваць на вучпунктах правільны падбор кадраў, стварыць курсы для кіраўнікоў вучпунктаў, каб забяспечыць высокую якасць вучобы.

Асноўнае прызначэнне вучэбных пунктаў і лагераў—стаць цэнтрамі ваенна-масавай і палітычнай работы.

Толькі пры такой пастаноўцы работы на вучпунктах мы не будзем чуць скарг на адсутнасць кадраў, актыва і т. д., бо тут тысячамі праходзіць моладзь, якую магчыма і трэба выхаваць як будучых актывістаў АСО, ударнікаў вытворчасці, ударнікаў абароны.

Вялікая задача АСО і ў галіне авіяцыйнай работы (арганізацыя планерных школ, авіямадэльных гурткоў, аэраклубаў і т. д.). Асабліву важнасць набывае аэраклуб, які павінен стаць сапраўды масавай грамадскай арганізацыяй, выхоўваць авіяцыйныя кадры без адрыву ад вытворчасці, уцягваючы моладзь у авіяцыйны спорт. Аэраклубу штодзенна павінны дапамагаць комсамол і профсаюзы. На жаль, профсаюзы усе яшчэ стаяць у баку ад гэтай работы. Менскі, віцебскі, гомельскі і інш. аэраклубы не разгарнулі сваю работу як належыць, не вышлі з арганізацыйнага перыяда.

Нельга забываць аб вялікім значэнні авіяцыі ў сельскай гаспадарцы: барацьба са шкоднікамі палеў, сяўба, ахова лясоў, служба сувязі ў калгасах і соўгасах і т. д. Роля авіяцыі ў гэтай галіне падкрэслівае вялікую важнасць нашых аэраклубаў, не гаворачы ўжо аб неабходнасці авіякадраў для абароны. Нашы аэраклубы гэта пакуль яшчэ новая, маладая арганізацыя. Далейшая іх работа залежыць, безумоўна, ад дапамогі мясцовых партыйных і комсамольскіх арганізацый.

Нашы лётнікі, героі Совецкага саюза, кінулі заклік: «Моладзь—на самалёты!» У сваёй адозве яны пісалі:

> «У рады асоавіяхіма, яго клубы, планерныя і авіямадэльныя гурткі клічам мы нашу бадзёрую, жыццярадасную совецкую моладзь, клічам мы ударнікаў соцыялістычнай будоўлі і абароны нашай слаўнай радзімы».

Тав. Ворашылаў у сваім загадзе ад 18 жніўня 1933 г. паставіў задачу:

> «Кожнай школе, кожнаму піонер-атраду—авіямадэльны гурток, кожнаму заводу, кожнай фабрыцы—гурток планерыстаў, кожнаму прамысловаму цэнтру—аэраклуб».

Гэтыя ўказанні мы павінны рэалізаваць поўнасцю.

Заклік лётнікаў павінны падхапіць комсамол, члены АСО і профсаюзаў і стаць першымі у радах барацьбітоў за яго выкананне, уцягваючы моладзь—ударнікаў соцбудаўніцтва—у планерныя і авіямадэльныя гурткі, членаў АСО—у аэраклубы. Ні адной заводскай, калгаснай, соўгаснай, школьнай пярвічнай арганізацыі АСО—без авіяпланерных гурткоў—вос лепшы адказ нашым лётнікам—героям Совецкага саюза.

* * *

Паспяховае вырашэнне задач далейшага развіцця фізкультурнага руху ў галіне масавасці і якасці будзе залежаць ад перабудовы арганізацыйнай работы. Задача фізкультурных арганізацый—дабіцца масавага фізкультурнага руху на вёсцы, разгортвання работы па масаваму ахвату рабочых МТС, соўгасаў і калгасаў комплексам ГПА, падрыхтаваўшы для гэтага адпаведную матэр'яльную базу. Фізкультурным арганізацыям вёскі павінны прыйсці на дапамогу рабочыя калектывы горада і ўзяць над імі шэфства.

Зразумела, што ўся работа па разгортванню фізкультурнага руху на вёсцы павінна быць сканцэнтравана пры МТС і соўгасах. ВСФК абавязан забяспечыць фізкультурныя арганізацыі вёскі інструктарамі. Нам патрэбна масавая падрыхтоўка інструктароў. Праз школы і курсы мы здолеем падрыхтаваць 100—150 чал. Ці даволі гэтага для ахвату працоўных фізкультурай? Безумоўна не. Задачу масавай падрыхтоўкі фізкультурных кадраў зможам вырашыць толькі тады, калі створым на базе існуючых фізкультурных калектываў добраахвотныя таварыствы і арганізуем міжсаюзныя тэрытарыяльныя клубы, ахапіўшы імі ў асноўным значкістаў ГПА.

Падводзячы вынікі вучэбнай фізкультурнай работы, трэба адзначыць, што ў асноўным фізічнае выхаванне ў школе значна палепшылася. Фізічная культура—адна з састаўных частак камуністычнага выхавання. Перабудова вучэбнай фізкультработы на аснове нарматыўных паказчыкаў непарыўна звязала у адзіную сістэму савецкую фізкультуру з комплексам ГПА.

Аднак, у радзе школ не здавальняе якасць выкладання. Інструктарскі склад у большасці нізкай кваліфікацыі, дрэнна рыхтуецца да лекцый, працуе без плана. Асабліва гэта адносіцца да сельскіх раёнаў (Гарадок, Ельск, Сенно).

Другі недахоп -гэта тое, што ў большасці школ няма спартыўных залаў, самага элементарнага інвентара, абсталяванне дрэннае. Таму заняткі праходзяць аднабакова і нецікава, што, безумоўна, адбіваецца на паспяховасці дзяцей.

Мінулы навучальны год у асноўным быў годам завяршэння перабудовы фізічнай культуры у школе на базе нарматыўных паказчыкаў. Прыкладам такой перабудовы з'яўляюцца: школа імя «Комінтэрна» (Гомель), 25 школа (Менск), 9 школа (Полацк), 1 ФЗД (Дзяржынск) і інш.

У гэтых школах ўзорна праходзяць лекцыі фізкультуры, усе школьнікі ахоплены нарматыўнымі паказчыкамі.

У гомельскай чыгуначнай школе зімовыя нормы здалі 1300 вучняў, у 4-й менскай—1200 вучняў. І так амаль ва ўсіх гарадах.

Горш справа ў сельскіх раёнах, дзе няма адпаведных фізкультурных кадраў. Работа ў вясковых школах праводзіцца нездавальняюча, і часта групаводамі, якія не маюць спецыяльнай адукацыі.

Фізкультурныя кадры ў сістэме масавай школы адно з найбольш хворых месц. Па рэспубліцы налічваецца 134 інструктары. Якасць іх часта не адпавядае запатрабаванням.

Не толькі Наркамасветы, але і ВСФК слаба кіруюць справай фізічнага выхавання ў школе. Нядзіва, што і раёны не цікавяцца фізкультработай і нават яе ігнаруюць. Заг. оршанскага раёна т. Шэйніна амаль нічога не зрабіла, каб палепшыць пастаноўку фізкультуры ў школах. У першым паўгоддзі сарвала фізкультуру па 6 школах, не

прадаставіўшы ім зал і патрэбнага спартыўнага інвентара. Таксама і магілеўскі, віцебскі райана думаюць, што фізкультработа ў школах ёсць справа выключна советаў фізкультуры.

Трэба прама сказаць, што школе не ўдзяляюць яшчэ патрэбнай увагі, не [illegible] кадраў, асабліва для сельскіх раёнаў. Курсы, якія праводзяць Наркамасветы, не забяспечаць поўнасцю патрэбы: на 1934—1935 г. патрэбна 345 інструктароў, а падрыхтавана толькі 182.

Задача Наркамасветы і ВСФК забяспечыць бесперабойную работу вучэбнай фізкультуры, арганізаваць кароткатэрміновыя 6-ці месячныя курсы па падрыхтоўцы інструктароў, даць школам неабходнае памяшканне, абсталяванне і інвентар, каб падняць заняткі на вышэйшую ступень, зрабіць іх цікавымі, павысіць паспяховасць вучняў.

Масавы ахват фізкультурнай работай ускладае на Вышэйшы совет фізкультуры і райсоветы вялікія абавязкі ў барацьбе за якасць фізкультурнай вучобы, бо заняткі праводзяцца яшчэ ячна нездавальняюча, асабліва ў калгасных і саўгасных гуртках (Гарадок, Плешчаніцы).

Толькі высокаякасная пастаноўка фізкультурнай вучобы забяспечыць шырокі масавы ахват комплексам ГПА першай ступені. Тым часам на вясну мы маем здаўшых нормы за летні перыяд 2[illegible]00 чал. пры кантрольнай лічбе 3[illegible]2. Здача норм ГПА 2-й ступені прад'яўляе кожнаму фізкультурніку і вучню надзвычайна высокія фізічныя патрабаванні, адпавядаць якім можна толькі пры добрай арганізацыі вучобы. Патрэбна значная колькасць інструктароў-трэнераў, ведаючых тэорыю, практыку і методыку выкладання. А з гэтымі кадрамі ў нас асабліва дрэнна. Вось чаму на значок другой ступені здалі норму толькі 6 чалавек.

Палепшыўшы сувязь з масамі, шырока разгарнуўшы работу па комплексу ГПА 1 і 2-й ступені і ўцягваючы новых членаў у фізкультурныя арганізацыі, мы зможам падрыхтаваць інструктароў-трэнераў, сістэматычна павышаць іх кваліфікацыю.

Якасць фізкультурнай работы залежыць і ад стану спартыўных пляцовак, забеспячэння спартыўнага інвентара і інш. Нельга не адзначыць вялікую ініцыятыву палітаддзелаў Хоцімскай і Слуцкай МТС: у калгасах сваёй зоны яны арганізавалі 20 спартыўных пляцовак.

* * *

Праведзеныя ў большасці раёнаў канферэнцыі «Чырвонага крыжа» ясна паказалі, што перабудова работы праведзена не па сутнасці. Змянілася толькі структура апаратаў гаркомаў і райкомаў «Чырвонага крыжа». Большая частка работнікаў не адпавядала свайму прызначэнню.

Старшыня Лепельскага райкома «Чырвонага крыжа» член партыі т. Евелева прыслана з Масквы для ўзмацнення чырвонакрыжнай работы і, хаця ў раёне ўжо 10 месяцаў, Евелева не толькі не ўзмацніла работы, а паказала поўную бяздзейнасць, ні разу не выехала ў раён, не ведае колькі пярвічных арганізацый, колькі членаў у раёне. Або Заслаўскі раён. Старшыня член партыі тав. Рашал на працягу двух год не толькі не наладзіла работу «Чырвонага крыжа», але поўнасцю яе разваліла. Здарылася гэта таму, што ні ЦК «Чырвонага крыжа», ні РК КП(б)Б, ні РВК не ўдзялілі патрэбнай увагі падбору людзей і іх рабоце.

Трэба прама сказаць, што ЦК «Чырвонага крыжа» не здолеў скарыстаць у Суражскім, Бабруйскім, Горацкім і інш. раенях канферэнцый для таго, каб паставіць чырвонакрыжную работу на належную вышыню, стварыць новыя пярвічныя арганізацыі і разгарнуць санітарна-абаронную работу.

Інструктары ЦК «Чырвонага крыжа» Герман, Якубоўскі, Грэбнева і іншыя, замест таго, каб да перавыбараў райкамітэтаў стварыць пярвічныя арганізацыі, выбраць цэхгрупоргаў, ачысціць таварыства ад чуждых элементаў і т. д., абмежаваліся тым, што прысутнічалі на самой канферэнцыі. Ясна, што такая «перабудова» інструктароў не дала патрэбнага зруху ў рабоце чырвонакрыжных арганізацый. Інструктары абышлі асноўнае звяно—пярвічную арганізацыю на прадпрыемствах, у калгасах, соўгасах, не забяспечылі канкрэтнага кіраўніцтва і жывой дапамогі ў яе рабоце.

Было-б, вядома, няправільна думаць, што раённыя канферэнцыі ўсюды прайшлі дрэнна і не далі пераломў ў рабоце чырвонакрыжнай арганізацыі. Райканферэнцыя ў Полаччыне прайшла арганізавана. Колькасць членаў таварыства «Чырвонага крыжа» вырасла з 2005 чал. у 1933 г. да 4025 чал. у 1934 г. 139 сан. пастоў правялі значную работу ў час веснавой сяўбы. Узорна працуе пярвічная арганізацыя Дамінікоўскага с.-с., Полацкага раёна (старшыня Ганчароў), якая налічвае 223 членаў. Створан гурток ваенна-санітарных ведаў на 25 чал. 7 членаў пярвічнай арганізацыі на добра скончылі курсы начальнікаў санпастоў і накіраваны ў калгасы: т. Ляхаў—у калгас «Беларуская веска», т. Філіпенка—«Адказ інтэрвентам», Жукоўская «Карла Маркса» і т. д. На гэтай пярвічнай арганізацыі павінны раўняцца ўсе арганізацыі Полаччыны.

Значную работу праводзіць чырвонакрыжная арганізацыя Дуброўны. Фабрыка «Дняпроўская мануфактура» мае тры чырвонакрыжныя ўдарныя брыгады, якія з месяца ў месяц выконваюць свой промфінплан, стварыла на вёсцы 72 санпасты, падрыхтавала звыш задання 16 сясцёр запасу і т. д.

Значна аслабла работа чырвонакрыжнай арганізацыі ў Менску. Пры злітці горкамітэта «Чырвонага крыжа» з ЦК была магчымасць зрабіць менскую арганізацыю узорнай, бо добра пастаўлена была работа ў радзе прадпрыемстваў («Кастрычнік», «Крупская», хлебзавод і інш.), аднак яе не замацавалі.

Нельга не адзначыць слабасць кіраўніцтва большасці ГК і РК «Чырвонага крыжа» ваенна-санітарнай падрыхтоўкай кадраў. Якасць выкладання нездавальняючая. Лектары (урачы) прыходзяць часта без падрыхтоўкі, а часам нават зрываюць заняткі (Гомель, Віцебск, Менск). Нездавальняюча працуе ПВА. Медсанкаманды ўкамплектаваны дрэнна, большасць начальнікаў не маюць ніякай падрыхтоўкі.

Удзяліць асобную ўвагу перабудове нізавых арганізацый і канкрэтнай ваенна-санітарнай рабоце—вось задача РК «Чырвонага крыжа». У якасці інспектароў па кадрах і медыка-санітарнай рабоце трэба абавязкова прыцягнуць урачоў. Урачы-спецыялісты павінны дапамагаць у рабоце інструктароў і разам з імі несці адказнасць за падрыхтоўку кадраў і аздараўленчую работу. Гэта не значыць, што яны павінны быць платнымі, трэба шырока прыцягваць актыў урачоў і грамадскіх інструктароў да практычнай работы камітэта.

Дэзінфекцыя свірнаў і тары калгасаў і калгаснікаў—задача чырвонакрыжнай арганізацыі. Яна дапаможа лепшаму зберажэнню ўра-

джаю і дасць рэальны эфект у набыцці калгаснікамі і рабочымі МТС ваенна-санітарных ведаў.

Не менш важная работа—**арганізаваць у аборы, стайні, на свінарніку, санітарныя пасты,** сістэматычна правяраць чыстату калодзеаў і падачу вады жывёле, шырока разгарнуўшы соцспаборніцтва паміж вытворчымі брыгадамі калгасаў на лепшае выкананне гэтых задач.

Зразумела, што вышэйпаказаным ахоплена далёка не ўся работа чырвонакрыжнай арганізацыі. Барацьба за высокую якасць харчовай прамысловасці, за чысты цэх, завод, фабрыку, барацьба з эпідэміямі, **сістэматычная падрыхтоўка кадраў сясцёр, санітараў і арганізацыя іх па вытворчаму** прынцыпу, наладжванне камандзірскай вучобы, шырокі ўдзел у рабоце ГСА, арганізацыя медыцынскіх каманд—усё гэта патрабуе падбору вытрыманых і добра ведаючых санітарную справу выкладчыкаў, павышэння дысцыпліны на курсах, укаранення сацыялістычных метадаў работы, палепшання кіраўніцтва ЦК «Чырвонага крыжа» падрыхтоўкаю ваенна-санітарных кадраў. Вакол гэтых задач павінна быць перабудавана чырвонакрыжная работа.

Грамадскія арганізацыі ў бліжэйшы час павінны дабіцца **масавага ахвату членствам і канкрэтнай абароннай работай усіх працоўных горада і вёскі.**

МТС і саўгасы павінны стаць цэнтрамі асоавіяхімаўскай, фізкультурнай, чырвонакрыжнай работы на вёсцы. Пры ўсіх палітаддзелах МТС трэба вылучыць упаўнаважаных райсоветаў АСО, якія забяспечылі-б сапраўднае разгортванне асоавіяхімаўскай работы і кіраўніцтва **ёю ў зоне дзейнасці МТС.**

Упаўнаважаныя АСО працуюць пад непасрэдным кіраўніцтвам палітаддзела МТС, увязваючы **сваю работу з партыйна-комсамольскімі** і прафсаюзнымі арганізацыямі, штодзённа інфармуючы палітаддзел аб становішчы і практычнай рабоце асоавіяхімаўскай арганізацыі. Задача ўпаўнаважанага стварыць ва ўсіх калгасах зоны МТС пярвічныя **арганізацыі, канкрэтна і аператыўна імі кіраваць**

Асаблівая ўвага павінна быць звернута на падбор і падрыхтоўку кадраў з комсамольцаў, рабочых МТС, актывістаў, калгаснікаў для пярвічных арганізацый. Для гэтага калгасныя партарганізатары павінны узмацніць партыйнае кіраўніцтва пярвічнымі грамадскімі арганізацыямі. Ад партарганізатараў палітаддзелы МТС і соўгасаў павінны патрабаваць пры справаздачы аб рабоце партарганізацый таксама і **справаздачы аб рабоце грамадскіх абаронных арганізацый.**

В. І. Ленін не раз указваў, што поспех усякай справы залежыць галоўным чынам ад падбору людзей і праверкі выканання. Гэтага яшчэ не зразумелі нашы грамадскія арганізацыі. Узяць такое важнае пытанне, як падрыхтоўка кадраў. ЦК КП(б)Б прапанаваў ЦС АСО арганізаваць курсы па падрыхтоўцы інструктараў, старшынь советаў і т. д. Гэта работа яшчэ не разгорнута. Праблема кадраў для нашых грамадскіх арганізацый—актуальнейшае пытанне, без якога нельга **вырашыць пастаўленыя перад імі задачы.**

Райкомы партыі і палітаддзелы павінны **забяспечыць партыйнае** кіраўніцтва грамадскімі абароннымі арганізацыямі. Не выпадкова ЦК КП(б)Б ускладаў адказнасць за кіраўніцтва іх работай на намеснікаў сакратароў РК КП(б)Б і намеснікаў начпалітаддзелаў МТС. Аднак, увага партыйных і нават прафсаюзных арганізацый да асоавіяхіма аслаблена. Рад РК КП(б)Б, асабліва пагранічных раёнаў, што зусім недапушчальна, не прыступіў практычна да рэалізацыі рашэнняў ЦК КП(б)Б (Дрыса, Жыткавічы, Быхаў, Лагойск, Плешчаніцы і інш.) матывуючы

тым, што заняты былі сяўбой. Яны, відаць, не разумеюць, што абаронная работа можа і павінна ўвязвацца з гаспадарча-палітычнымі задачамі, аб важнасці і карысці чаго мы гаварылі.

Комсамол Лельчыц, Плешчаніц, Гарадка, Кармы яшчэ не ўзяўся энергічна за разгортванне абароннай работы, асабліва падрыхтоўкі да ваенна-тэхнічнага экзамена, не вылучыў намеснікаў старшынь райсаветаў АСО па рабоце сярод моладзі.

У цеснай сувязі комсамола, профсаюзаў з АСО, ВСФК, «Чырвоным крыжам», у дапамозе апошнім арганізаваць вучобу, палітычную работу, гурткі і т. д.—зарука таго, што будзе выканана задача, пастаўленая т. **Кагановічам: «Комсамол павінен стаць душой і сэрцам АСО».**

У нас ёсць узорныя паказчыкі разгортвання комсамолам абароннай работы, ахвату ваенна-тэхнічным экзаменам рабочай моладзі ударнікаў абароны і вытворчасці. Разгорнутым паходам за аўладанне ваенна-тэхнічнымі ведамі мы даб'емся таго, што будзем мець дысцыплінаванага варашылаўскага стралка, фізічна развітага, культурнага ўдарніка вытворчасці. Узначаліць моладзь у барацьбе за аўладанне ваенна-тэхнічнымі ведамі—значыць не толькі прызнаць іх неабходнасць, не толькі прыймаць пастановы аб важнасці гэтай справы. Задача можа быць выканана тады, калі комсамольскія, профсаюзныя і абаронныя арганізацыі будуць разглядаць ваенна-тэхнічны экзамен, **як адну з асноўных форм масавай работы сярод моладзі.**

Здавалася-б, што для большэвіков проста немыслима стаць у баку ад такой вялікай масавай арганізацыі, як АСО, «Чырвоны крыж». Аднак, не ўсе члены партыі, комсамольцы і члены профсаюзаў прымаюць актыўны ўдзел у рабоце АСО. Так, напр., у Клімавіцкім раёне ахоплена членствам АСО 8 проц. партыйцаў і 5 проц. комсамольцаў. **100 проц. ахват партыйцаў, комсамольцаў, членаў профсаюзаў членствам АСО—вось баявы лозунг для ўсіх арганізацый.**

Нізавы раённы і нават цэнтральны друк мала ўвагі ўдзяляе рабоце добраахвотных арганізацый. На старонках газет не асвятляецца ход выканання рашэння ЦК аб перавыбарах пярвічных арганізацый, нізавы друк не дапамагае на канкрэтных паказчыках абароннай работы разгортваць барацьбу за ўмацаванне нізавых пярвічных арганізацый.

Друк павінен стаць сапраўдным арганізатарам і прапагандыстам разгортвання абароннай работы сярод рабочых, калгаснікаў і ўсіх працоўных. На яго старонках павінна асвятляцца работа лепшых ударнікаў, абаронных брыгад, цэхаў, фабрык, заводаў, калгасаў, удзел рабочых у грамадскіх абаронных арганізацыях, у барацьбе за выкананне промфінплана, за выкананне лозунга т. Сталіна зрабіць калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі.

Задача рабселькораў—стаць актыўнымі барацьбітамі за канкрэтную абаронную работу, быць першымі ў радах здаўшых норму на варашылаўскага стралка, значок ГПА і ГСА.

Пастановы ЦК КП(б)Б аб рабоце грамадскіх абаронных арганізацый з'яўляюцца праграмай іх работы. Партыйныя, комсамольскія і профсаюзныя арганізацыі абавязаны забяспечыць выкананне рашэнняў ЦК КП(б)Б.

Грабенчык і Цукерман

Аб комунальна-жыллёвай гаспадарцы гор. Віцебска

Віцебск — адзін з буйнейшых індустрыяльна-культурных цэнтраў БССР, з вельмі развітай прамысловасцю (металаапрацоўчай, дрэваапрацоўчай, скураабутковай, тэкстыльнай, швэйнай, трыкатажнай, харчовай, перапрацоўчай — шчаціны камбінат) — па колькасці насельніцтва з'яўляецца другім горадам у БССР пасля Менска.

У Віцебску за апошнія гады праведзена параўнаўча вялікая работа па паляпшэнню комунальна-жыллёвай гаспадаркі. Пабудаваны дзесяткі буйных 3—4 павярховых жылых дамоў, пашыраецца і рэканструюецца водаправод, трамвай. Горад набыў добры выгляд, большасць акраін, дзе раней было брудна і цёмна, зараз забудаваны буйнымі прадпрыемствамі, асветлены і злучаны з горадам трамвайным рухам.

За апошні час віцебскія арганізацыі правялі масавую работу. Працоўныя горада прынялі ўдзел у суботніках па ачыстцы двароў, плошчаў, заводскіх тэрыторый і іх азеляненню. Аднак работа гэта не была як след арганізавана і дала недастатковы эфект.

На комунальна-жыллёвую гаспадарку Віцебска ў 1934 г. асігнавана 6.919 тыс. руб., у тым ліку: на жылбудаўніцтва—3.054 тыс. руб., на рамонт жылфонда 857 тыс. руб. На комунальную гаспадарку асігнавана 3 млн. руб., з якіх: на водаправод—800 тыс. руб., на трамвай—900 тыс. руб., на брукаванне 200 тыс. руб. і на заканчэнне будаўніцтва лазні—144 тыс. руб.

Такія значныя капіталаўкладанні ў комунальна-жыллёвую гаспадарку і добрабыт горада самі па сабе павінны былі вызначыць ролю, месца і значэнне гэтага адказнейшага ўчастка соцбудаўніцтва ва ўсёй працы совецкіх і партыйных арганізацый Віцебска. Аднак, аналізуючы работу горсовета, гаркамгаса, жылкааперацыі, трэба адзначыць, што ў іх не было адзінага чоткага, аперацыйнага кіраўніцтва гэтым участкам і правядзеннем у жыццё ўсей праграмы капіталаўкладанняў.

Па сутнасці, гаркамгас павярхоўна кіруе комунальнай гаспадаркай, а часам яго кіраўніцтва і зусім не адчуваецца. Кіраўнікі гаркамгаса пераважна заняты тым, што выконваюць заданні розных арганізацый у падшукванні кватэр, вельмі часта не ўлічваючы рэальныя мажлівасці і на ўшчэрб захаванню жылфонда. Толькі за апошні час атрымана заяўка на падшуканне звыш 150 кватэр. Некаторыя віцебскія арганізацыі ўзялі сабе за правіла займаць жылую плошчу пад установы. Напрыклад, буйны дом, спецыяльна прыстасаваны пад кватэры і заняты дзесяткі год жыхарамі, па даручэнню горсовета перадаецца чыгунцы пад канцэлярыю.

Такім чынам, замест таго, каб пашырыць жылфонд як за кошт новага будаўніцтва, так і за кошт ушчыльнення жылплошчы, зай-

маемай установамі, у Віцебску робяць якраз наадварот. З такою практыкай трэба раз і на заўсёды пакончыць.

Планаванне капіталаўкладанняў, мерапрыемствы па комунальна-жыллёвай гаспадарцы і добрабыту горсовет і горплан праводзяць вельмі часта без удзелу гаркамгаса і вельмі часта не ў адпаведнасці з зацверджанымі СНК БССР аб'ектамі. Замест таго, каб прыняць усе меры для павелічэння асігнаванняў на комунальна-жыллёвую гаспадарку, горсовет і горплан скарачаюць іх. Напрыклад, суму ў 450 тыс. руб., выдзеленую СНК БССР для заканчэння двух комунальных дамоў (№№ 6 і 7), якія, да рэчы кажучы, будуюцца ўжо трэці год, горплан скараціў да 409 тыс. руб. Замест зацверджаных СНК 75 тыс. руб. на рамонт выканкомаўскіх жылых дамоў (жылфонда) горплан прыняў толькі 15 тыс. руб., з асігнаваных на рамонт мастоў і дрэнажныя работы 55 тыс. руб. горплан прыняў 41 тыс. руб. Горсовет запраектазаў новы аб'ект, які зусім не ўваходзіў у тытульны спіс,—перанос Полацкага базара, на што патрабуецца каля 165 тыс. руб., г. зн.—усе сродкі, асігнаваныя для Віцебска на брукаванне вуліц. Дзесяткі тысяч руб., адпушчаных на добрабыт горада, выкарыстаны не па прамому прызначэнню.

Практычнымі пытаннямі комунальна-жыллёвай гаспадаркі і добрабыту горсовет займаўся вельмі недастаткова, што відаць з пратаколаў прэзідыума. За апошнія 3 месяцы горсовет не абгаварваў такіх важнейшых пытанняў, як будаўніцтва гарадскога водаправода і трамвая, будаўніцтва 24-кватэрнага дома, лазні (пачата ў 1930 г.), дома спецыялістаў, зялёнага будаўніцтва, ачысткі горада, становішча жылкааперацыі, комунальна-жыллёвага фонда, выканання вытворчай праграмы комунальнымі прадпрыемствамі.

Цікава пералічыць «комунальныя» пытанні, якія разглядаліся прэзідыумам горсовета:

1. Аб прадастаўленні складскіх памяшканняў Белтрэсту.
2. Аб прадажы безгаспадарчых домаўладанняў.
3. Аб аслабаненні для патрэб ашчадкасы № 32 памяшкання на Пляцы волі.
4. Аб пашырэнні кіно «Спартак», для чаго трэба перасяліць некалькі сямей.
5. Аб рамонце кватэры мастака Пэна.
6. Аб прадстаўленні памяшкання ЗРК завода імя «Лекерта».

Комунальна-жыллёвая гаспадарка і добрабыт горада не карысталіся ўвагай віцебскага горсовета. Самі кіруючыя работнікі комунальнай гаспадаркі не здолелі паставіць у кіруючых гарадскіх арганізацыях цэлага раду прынцыповых пытанняў, не перабудавалі сваю работу ў адпаведнасці з пастановамі XVII партз'езда, не мабілізаваліся на выкананне важнейшых задач, не наблізілі сваё кіраўніцтва непасрэдна да вытворчасці, не арганізавалі сур'ёзна і па-дзелавому выкананне праграмы капіталаўкладанняў 1934 г. і промфінплана комунальных прадпрыемстваў.

Паасобныя кіруючыя комунальныя работнікі разважаюць так: «Для работы ў камгасе не складзены неабходныя ўмовы. Камгас займаецца толькі кватэрамі і з'яўляецца па сутнасці старшым кварт'ерам горсовета і іншых арганізацый, а комунальнай гаспадаркай няма часу займацца».

Такія разважанні не вытрымліваюць ніякай крытыкі і сведчаць толькі аб тым, што самі кіруючыя работнікі комунальнай гаспадаркі не зразумелі сваіх зусім ясных задач, не здолелі ўхапіцца за асноў-

чае, рашаючае звяно ў комунальна-жыллевым будаўніцтве. Нельга казаць, што комунальныя работнікі Віцебска не здольны кіраваць комунальнай гаспадаркай, але ясна адно: кіраўніцтва ў свае рукі яны ішчэ не ўзялі і займаюцца ўсім чым хочаце, толькі не комунальнай гаспадаркай.

Ход будаўніцтва важнейшых жыллёвых аб'ектаў ні ў якім разе не гарантуе таго, што ўся праграма капіталаўкладанняў 1934 г. будзе поўнасцю асвоена. Вельмі марудна ідзе будаўніцтва дома спецыялістаў, хоць асноўнымі матар'яламі ён забяспечан параўнаўча нядрэнна. Недапушчальным тэмпам ужо тры гады будуюцца шосты і сёмы 24-кватэрныя дамы і чацверты комунальны. Прычым даецца ўстаноўка закончыць у гэтым годзе толькі чацверты і шосты дамы, а сёмы давесці да крышы. Гэта рашэнне супярэчыць пастанове ЦК аб тым, каб гэтыя дамы поўнасцю закончыць селета. Непаваротлівасць і апартуністычная самасупакоенасць Вітбуда на чале з дырэктарам т. Шолахавым спрыяюць такім чарапашым тэмпам. Даволі сказаць, што Вітбуд не меў часу заняцца такім пытаннем, як набор рабочай сілы для гэтай будоўлі.

Гісторыя віцебскай лазні ў свой час даволі асвятлялася. Лазня будуецца ўжо чатыры гады. За гэты час будаўнічыя арганізацыі не раз перараблялі заяўкі на неабходныя для заканчэння лазні сродкі. Спачатку гэтага года была дана заяўка на 144 тыс. руб., а зараз складзена новая на 470 тыс. руб. Гэтыя павярхоўныя, неабгрунтаваныя заяўкі штампаваліся мясцовымі арганізацыямі. Праект лазні часта мяняўся, перарабляліся ўжо закончаныя ўнутраныя работы: ламалі сцены, вокны, высекалі новыя дзверы і т. д. Зараз работа фактычна прыпынена, бо асігнаванні 144 тыс. руб. ужо скарыстаны. Зацягваць будаўніцтва лазні было-б злачынствам. Неабходна адшукаць дадатковыя асігнаванні і будматар'ялы, галоўным чынам цэмент, каб ужо ў гэтым годзе ўвесці лазню ў эксплаатацыю.

Будаўніцтва водаправода мае агромнае значэнне для аздараўлення гор. Віцебска. Аднак, работы недапушчальна зацягваюцца віцебскім аддзяленнем Комунбуда. Рэканструкцыя старой вадакачкі—цэментоўка зборнага калодзезя, перанос насоснай станцыі ў новае памяшканне, бурэнне новай 6-й скважыны, будаўніцтва новага рэзервуара на 450 куб. м., паглыбленне 3-й скважыны—ідзе марудна. Няма гарантыі ў тым, што гэтыя работы будуць выкананы ва ўстаноўлены ўрадам тэрмін. Будаўніцтва ўжо зараз адчувае востры недахоп у чыгунных трубах, у абсталяванні (кампрэсар, цэнтрабежныя насосы) і часткова ў цэменце. Акрамя таго, работа можа затрымацца ў сувязі з тым, што Наркомлегпром не выканаў пастанову ўрада БССР аб водпуску на пашырэнне віцебскага водаправода 350 тыс. руб. Увод у эксплаатацыю новага водаправода на Маркаўшчыне затрымліваецца. Няма труб неабходных размераў і цэнтрабежных насосаў. Будаўніцтва новай воданапорнай башні поўнасцю забяспечана асноўнымі будматар'яламі, але пасоўваецца надзвычай павольна.

Рэканструкцыя віцебскага трамвая, у межах адпушчаных 900 тыс. руб. праходзіць больш-менш здавальняюча. Узяты тэмп у пракладцы шырокакалейнага пуці на Маркаўшчыну і Грамадзянскую вул. можа забяспечыць своечасовае выкананне гэтага аб'екта. Кіраўніцтва трамвая павінна ўлічыць сезоннасць работы і максімальна фарсіраваць яе, каб скончыць у бліжэйшы час. Нядобраякасны рамонт вагонаў, побач з парушэннем працоўнай дысцыпліны сярод рабочых і служачых трамвая, вядуць к пастаянным буйным аварыям. Харак-

тэрна, што за 1 паўгоддзе розным адміністрацыйна-судовым спагнанням падвяргалася да 45 проц. усіх рабочых і служачых. Кіраўніцтва трамвая яшчэ не пачынала асваення сродкаў, асігнаваных на барацьбу з блукаючымі токамі.

Згодна плану капіталаўкладанняў Наркамгаса, на добрабыт горада выдзелена 293 тыс. руб., з іх: на брукаванне—165 тысяч і на зялёнае будаўніцтва—38 тыс. Сродкі на зялёнае будаўніцтва асвоены са значным павелічэннем кошту работ, прычым вельмі часта на аб'екты, не прадугледжаныя планам. Але галоўнае ў тым, што зялёныя насаджэнні Віцебска амаль не ахоўваюцца. Пабудаваны ў гэтым годзе садзік не агароджан і напалову ўжо папсован. Старыя сады таксама не ўпарадкаваны, лінейныя насаджэнні псуюцца.

Зусім недастаткова зялёнае будаўніцтва на прадпрыемствах. Цэхі фабрыкі «КІМ» «упрыгожаны» захудалымі, пакрытымі брудам і пылам, на тры чвэрці палсаванымі вазонамі. Гэта нішто іншае, як апашленне найважнейшага мерапрыемства ў галіне стварэння больш здаровых і культурных умоў для работы на фабрыках і заводах. Дырэктары не пераймалі вопыт буйнейшых перадавых прадпрыемстваў Ленінграда, Масквы, Харкава, Урала, тэрыторыі якіх засаджаны кветкамі, вазонамі, клумбамі, алеямі і т. д. Гаркамгас не клапоціцца аб развіцці пітомніка, аранжэрэйнай гаспадаркі.

Адпушчаныя на брукаванне сродкі скарыстоўваюцца толькі на адзін аб'ект —перанос Палацкага рынка. У сувязі з гэтым фактычна сарваны ўсе работы па рамонту гарадскіх вуліц. Тым часам, значная частка бруку і тратуараў разбіта, не кажучы ўжо аб тым, што каля 70 проц. вуліц горада Віцебска зусім не брукавана. Санітарны стан, ачыстка горада, работа асенізацыйнага абоза яўна нездавальняючы. Гаркамгас і жылкааперацыя не адчуваюць ніякай адказнасці за гэту справу.

Работа жылкааперацыі не карыстаецца ўвагай горсовета і гаркамгаса. Горжылсаюзам фактычна ніхто не кіруе. Горжылсаюз мае 17 жактаў. Старшыні жактаў, кіраўнікі дамамі вельмі часта мяняюцца. Фактычна праўленні жактаў сталі праходнымі дварамі для кіруючага складу гэтых жактаў. Напрыклад: у жакце № 27 за 1934 г. змянілася 4 старшыні, у жактах 1,10 і 16—па 3 старшыні, у жактах 14 і 30—па 5 старшынь.

Работнікі жылкааперацыі падбіраюцца несур'ёзна, павярхоўна, не замацоўваюцца на рабоце. Не улічваюцца пры гэтым складанасць і адказнасць работы жылкааперацыі і кіраўніцтва каласальным жылым фондам, перададзеным дзяржаваю жылкааперацыі (168 тыс. кв. мтр., 1316 домаўладанняў).

Жылкааперацыя дрэнна спраўляецца з прыцягненнем сродкаў насельніцтва ў жылбудаўніцтва. План паснакапленняў па жыллева-арэнднай кааперацыі за 1 паўгоддзе выканан толькі на 68 проц., па жыллева-будаўнічай кааперацыі на 30 проц., а па дадатковых паях—на 8,1 проц.

Паміж гаркамгасам і горжылсаюзам не было кантакта і ўзаемнага разумення. Доўгі час вяліся спрэчкі аб парадку падначаленасці адзін другому. Работнікі жылкааперацыі мараць аб поўнай самастойнасці: «Мы—кааперацыйная арганізацыя, і гаркамгас не мае права ўмешвацца ў нашу работу». Тым часам, гаркамгас павінен быў сістэматычна весці сумесную работу з жылсаюзам і дапамагаць яму (зразумела ўнікаючы дробязнай непатрэбнай апекі) у частцы забяспечання

нармальнай і здавальняючай эксплаатацыі, рамонту і ўтрымання жылфонда ў парадку.

Рамонт жыллёвага фонда жылкааперацыі праходзіць яўна нездавальняюча як па колькасных, так і асабліва па якасных паказчыках. Са 143 аб'ектаў капітальнага рамонту работа праводзіцца толькі па 73, скончана 27 аб'ектаў. Большасць работ нядобраякасная: вокны, дзверы, падлога зроблены з сырога матар'ялу, сцены атынкоўваюцца абы толькі замазаць, у адрамантаваным доме «забыліся» папраўіць дах. Зусім зразумела, што пры дзіравым даху ніякі рамонт не паможа. Тым часам, для рамонту даху патрэбна нямнога матар'ялу. Гаркамгас і асабліва жылкааперацыя павінны праявіць больш ініцыятывы і дзелавога падходу да рамонту, мабілізуючы мясцовыя рэсурсы будматар'ялаў.

Горжылсаюз і жакты не вядуць сістэматычнай арганізацыйна-масавай работы сярод сваіх жыхароў з тым, каб яны самі прымалі ўдзел у бягучым і дробным рамонце сваіх кватэр, вялі штодзенны кантроль за ўтрыманнем жылфонда.

Гаспадарчыя арганізацыі фабрык і заводаў не цікавяцца справамі рамонту кватэр сваіх рабочых, у першую чаргу ўдарнікаў. Набудаваныя параўнаўча нядаўна комунальныя жылыя дамы маюць запушчаны выгляд. З выдзеленых СНК БССР на рамонт комунальнага жылфонда 75 тыс. руб. фактычна скарыстана 15 тыс., астатнія пераразмеркаваны горпланам. Неабходна тэрмінова адновіць усе асігнаванні на рамонт комунальнага жылфонда й поўнасцю іх асвоіць.

Гаркамгас не лічыць сваім абавязкам наглядаць за станам прыватна-ўласніцкага жылфонда, удзельная вага якога вельмі значна і складае па Віцебску амаль тры чверці ўсяго фонда: з 800 тыс. кв. мтр. на долю прыватна-ўласніцкага фонда прыпадае 580 тыс. кв. мтр.

Гарадскі інжынэр павінен праводзіць сталы тэхнічны кантроль за ходам усяго будаўніцтва па гор. Віцебску, даваць заключэнні на праекты, кансультаваць і аказваць тэхнічную дапамогу гэтаму будаўніцтву ў пытаннях выбару пляцовак, выходзячы з перспектыў планіроўкі і развіцця горада. Па сутнасці-ж ён абмяжоўваецца канстатацыяй ужо адбыўшыхся фактаў у галіне комунальна-жыллёвага будаўніцтва, не з'яўляецца тэхнічным вокам горсовета. Буйнейшыя аб'екты будуюцца ў месцах, дзе ніколі не будзе развівацца будаўніцтва. Два 24-кватэрныя дамы будуюцца на Смаленскім шасэ, на нізкім забалочаным месцы. Такі архітэктурна багата аформлены будынак, як дом спецыялістаў, будуецца на самым краі абрыва. Новы водаправод пабудован у нізкім забалочаным месцы, дзе нават і ў летні час стаіць вада.



Выкананне праграмы комунальнымі прадпрыемствамі Віцебска за першае паўгоддзе характарызуецца наступнымі паказчыкамі:

Трамвай—па пасажыра-перавозках план выканан на 91,8 проц., сабекошт павышан супроць плана на 10 проц., план накапленняў у сувязі з ростам сабекошту і частковым невыкананнем плана пасажыра перавозак выканан усяго на 87 проц., план груза-перавозак— на 143 проц.

Водаправод—па водпуску вады план выканан на 104 проц., сабекошт узрос на 1,3 проц., адпускная цана зніжана на 6,3 проц., план накаплення выканан усяго на 91,7 проц.

Лазні—план па колькасці памывак выканан на 90 проц., сабекошт узрос на 11,9 проц., план накаплення выканан на 53,8 проц.

Аналіз колькасных і якасных паказчыкаў работы асноўных комунальных прадпрыемстваў характарызуе іх дрэнную работу.

Кіраўнікі комунальных прадпрыемстваў несур'ёзна падышлі да выканання плана накаплення, забываючы, што зрыў яго ёсць адначасова зрыў плана комунальнага будаўніцтва. Комунальнае будаўніцтва і дабрабыт горада фінансуюцца гарфо без уліку сезоннасці асноўных работ у комунальнай гаспадарцы, дапускаюцца перабоі ў забяспечанні гэтых работ сродкамі.

Гаркамгас і падначаленыя яму установы не ўдзяляюць ніякай увагі соўгасу «Думіна»—асноўнай базе харчовага снабжэння рабочых і служачых комунальнай гаспадаркі. За ўвесь час сельска-гаспадарчых работ соўгас не наведаў амаль ніхто з кіруючых комунальных работнікаў.

Жывёлагадоўля і полеводства ў соўгасе не на належнай вышыні, фінансавае становішча напружанае.

Адным з найбольш рашучых рычагоў узмацнення увагі ўсёй грамадскасці да комунальна-жыллевага будаўніцтва, палепшання комунальна-жыллевай гаспадаркі з'яўляецца конкурс саветаў. Гаркамгас і горжылсаюз уключыліся ў гэты конкурс фармальна і па сутнасці нічога не зрабілі для мабілізацыі і актывізацыі на яго аснове ўсіх кіруемых комунальнай гаспадаркай арганізацый, на выкананне праграмы капіталаўкладанняў 1934 г., на значнае палепшанне добрабыту, горада, на ўцягненне ўсёй грамадскасці ў справу рамонту і будаўніцтва жыллёвага фонда.

З усяго вышэйсказанага відаць, што віцебскія кіруючыя арганізацыі вельмі мала займаліся комунальна-жыллевай гаспадаркай. А з гэтага яны павінны зрабіць адпаведныя практычныя вывады.

Неадкладна ўзяць пад свой непасрэдны кантроль і кіраўніцтва работу гаркомгаса і жыллевай каапераціі, дабіцца карэннага пералому ў справе комунальна-жыллевага будаўніцтва і добрабыту горада з тым, каб забяспечыць поўнае выкананне плана будаўніцтва, рамонту жылых дамоў і кватэр, палепшання добрабыту горада.

Партыйныя, савецкія і профсаюзныя арганізацыі асаблівую ўвагу павінны звярнуць на неадкладнае заканчэнне рамонту жылых дамоў і кватэр рабочых і працоўных горада, прыцягнуць да гэтай справы прадпрыемствы і гаспадарчыя арганізацыі, мабілізаваць усе мясцовыя і ўнутраныя рэсурсы, неабходныя будматар'ялы, каб да наступлення замаразкаў закончыць рамонт кватэр і дамоў.

Масава-растлумачальнай работай на прадпрыемствах і ўстановах прыцягнуць саміх жыхароў да актыўнага ўдзелу ў рамонце кватэр і правядзенні дробнага ўнутранага рамонту (пабелка, выклейка шпалерамі і т. п.) у жактаўскіх і комунальных дамах сіламі і сродкамі саміх жыхароў.

Усё адмоўнае, што мы адзначылі ў кіраўніцтве комунальна-жыллёвай гаспадаркі і добрабыту гор. Віцебска, у той ці іншай меры можна знайсці і ў іншых гарадах БССР. Таму горсоветы ўсіх гарадоў БССР павінны неадкладна па-дзелавому пераключыцца на ліквідацыю прарываў і недахопаў з тым, каб план новага будаўніцтва і рамонту

комунальных і жыллёвых будынкаў, добрабыту гарадоў быў поўнасцю выканан.

Уключыўшыся ў паход імя VII з'езда советаў СССР, на аснове спаборніцтва паміж горсоветамі і гарадамі трэба павесці барацьбу за права рапартаваць з'ездам советаў БССР і СССР аб паспяховым і датэрміновым заканчэнні планавых заданняў партыі і ўрада па ўсіх паказчыках, у тым ліку і па добрабыту гарадоў, комунальна-жыллёваму будаўніцтву, рамонту жылфонда.

Горсоветы і гаркамгасы павінны па-сапраўднаму ўзяцца за паляпшэнне комунальнай гаспадаркі. У гэтым—адна з найбольш адказных гаспадарча-палітычных задач горсоветаў.

Ф. Вайновіч

Датэрмінова і высокай якасці здамо лён і пяньку дзяржаве

Большэвіцкая барацьба ўсёй КП(б)Б пад кіраўніцтвам свайго ЦК за ажыццяўленне рашэнняў XVII партз'езда і ўказанняў тав. Сталіна аб далейшым уздыме сельскай гаспадаркі забяспечыла паспяховае правядзенне вясенняй пасеўкампаніі і гэтым самым—добры ўраджай як зернавых, так і тэхнічных культур.

Поспехі пасеўнай і прапалачнай кампаній стварылі ўмовы для мабілізацыі шырокіх мас калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў на далейшае паспяховае завяршэнне ўсіх працэсаў сельска-гаспадарчых работ і гаспадарча-палітычных кампаній: своечасовую і добраякасную ўборку і абмалот ураджаю, выкананне абавязацельстваў перад пралетарскай дзяржавай і т. д.

Зараз БССР праводзіць адну з адказнейшых гаспадарча-палітычных кампаній—першапачатковай апрацоўкі і выканання плана здачы (продажы) дзяржаве тэхнічных культур—лёну і канапель.

Калі з уборкай і малацьбою зернавых культур завяршаецца працэс барацьбы за добраякасны ўраджай, забяспечваюцца хлебанастаўкі, то ўборка і абмалот тэхнічных культур (лёну і канапель) толькі падрыхтоўваюць іх да больш адказнага працэса—першапачатковай апрацоўкі, ад якой цалкам залежыць паспяховае і своечасовае выкананне кантрактацыйных дагавароў і плана здачы (продажы) дзяржаве высокаякаснага валакна. Таму ўсе РК і ГК КП(б)Б, палітаддзелы і дырэктары МТС, савецкія зямельныя і загатоўчыя арганізацыі, праўленні калгасаў павінны ўлічыць урокі і недахопы мінулага году і арганізаваць першапачатковую апрацоўку лёну і канапель так, каб на справе забяспечыць своечасовае выкананне плана здачы (продажы) дзяржаве высокаякаснай льнапенькапрадукцыі і на аснове соцспаборніцтва арганізаваць барацьбу калгасаў і аднаасобнікаў за датэрміновае выкананне плана.

22 жніўня пастановай ЦК КП(б)Б і СНК БССР зацверджан план загатовак прадукцыі лёну і канапель на 1934 г. Згодна гэтай пастанове, планам загатовак прадукцыі лёну і канапель лічыцца фактычная кантрактацыя, г. зн., што ўся прадукцыя валакна, пянькі і насення лёну і канапель, закантрактаваная як па колькасці, так і якасці калгасамі і працоўнымі аднаасобнікамі, падлягае здачы (продажы) дзяржаве. Такім чынам, дагавор па кантрактацыі з'яўляецца непарушным.

Згодна рашэнню ЦК КП(б)Б і СНК БССР асноўнай задачай у апрацоўцы і загатоўках прадукцыі лёну і канапель з'яўляецца большэвіцкая барацьба за высокую якасць прадукцыі, за апрацоўку без страт, за датэрміновае выкананне плана здачы прадукцыі дзяржаве.

ЦК КП(б)Б і СНК адзначылі, што галоўнай прычынай невыканання плана загатовак у мінулым годзе па БССР з'яўлялася тое, што цэлы рад раёнаў (Мсціслаў, Лезна, Гарадок, Сураж і т. д.) з прычыны недаацэнкі партыйнымі і савецкімі арганізацыямі важнасці своечасовай уборкі і першапачатковай апрацоўкі лёну і пянькі, недапушчальна зацягнулі тэрміны цераблення, абмалоту, расцілу і пад'ёму з асцілішч, што прывяло к велізарным стратам. ЦК і СНК з усёй сур'ёзнасцю папярэджваюць усе партыйныя, савецкія загатоўчыя арганізацыі і палітаддзелы МТС аб недапушчальнасці ў ільназагатоўках паўтарэння памылак мінулага года.

ЦК і Соўнаркомам ускладзена, побач з зямельнымі і загатоўчымі арганізацыямі, персанальная адказнасць на сакратароў райкомаў, старшынь РВК, сельсоветаў і калгасаў за стан пераапрацоўкі і загатоўкі лёну і пянькі.

Кожная раённая партарганізацыя, палітаддзел МТС, савецкія і загатоўчыя органы абавязаны шырока растлумачыць калгаснікам і працоўным аднаасобнікам, што барацьба за лён і пяньку, пачаўшыся з веснавой сяўбы, павінна па-большэвіцку прадаўжацца пры ўсіх астатніх вытворчых працэсах. Растлумачыць кантрактантам—калгаснікам і працоўным аднаасобнікам—усе ільготы і выгады, якія дае дзяржава за лён і пяньку, што абавязацельствы будуць лічыцца выкананымі толькі пры ўмове здачы дзяржаве прадукцыі не ніжэй прадугледжанай дагаворам якасці.

Ільнавалакно і ільнатрасту кантрактанты павінны здаць не ніжэй сярэдняга нумара, або не ніжэй законтрактаванага сорту пянькі і пяньковай трасты. Процант чыстаты насення лёну і канапель павінен быць не ніжэй прынятага на сябе кантрактантам па дагавору. На загатоўчым пункце разлік за ільнавалакно і трасту будзе рабіцца ў кілонумарах, за валакно і трасту пянькі—у кілосортах, за насенне лёну і канапель—у кілосортах чыстаты.

Калі акажацца, што здатчык выканаў свой план колькасна але ніжэй законтрактаванай якасці, ён павінен недаданыя кілонумары пакрыць дадатковай колькасцю. Напрыклад, пры плане 10 кгр. 10 нумара (100 кілонумароў) кантрактант здаў 10 кгр. 8 нумара (80 кілонумароў), то ён павінен 20 недавыкананых кілонумароў пакрыць здачай 5 кгр. 4 нумара, або 2 кгр. 10 нумара і т. д.

Такі-ж самы парадак і здачы пянькі, з тою толькі розніцай, што тут трэба выходзіць з каштоўнасці зданай прадукцыі. Напрыклад, трэба здаць 40 кгр. розных сартоў пянькі на суму 21 руб. 20 кап., здана-ж 40 кгр. горшай якасці на суму 19 руб. 20 кап., значыць давядзецца здаць прадукцыі яшчэ на 2 рублі. Таксама і з выкананнем плана здачы насення лёну і канапель. Кожны кантрактант па дагавору павінен здаць насенне лёну не ніжэй 90 проц. чыстаты, а канапель не ніжэй 94 проц., інакш робіцца скідка на засмечанасць. Насенне лёну ніжэй 80 проц. і канапель ніжэй 85 проц. у загатоўку зусім не будзе прымацца.

Добры ўраджай гэтага года дае поўную магчымасць здаць прадукцыю лёну і пянькі высокай якасці і патрэбнай кандыцыі.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР у пастанове ад 22 жніўня адзначылі, што пры добрым ураджаі лёну БССР мае ўсе магчымасці здаць ільнавалакно сярэднім нумарам 10. За гэта павінны змагацца партыйныя арганізацыі і загатоўчыя органы ўсіх раёнаў.

За зданыя (прададзеныя) дзяржаве лішкі сваёй прадукцыі, якасцю вышэй дагаворнай, кантрактант (калгас, аднаасобнік) атрымае больш

хлеба, харчовых прадуктаў і промтавараў. За зданыя ільнавалакно і трасту звыш плана (пры выкананні свайго сярэдняга нумара) атрымае хлеба, харчовых прадуктаў і промтавараў на 50 проц. больш нормы. Выканаўшы план здачы ільнавалакна і трасты якасцю вышэй на поўнумара, пры абавязковым выкананні колькасці, атрымае хлеба, харчовых тавараў і промтавараў больш нормы на 10 проц. на ўсю зданую колькасць і т. д., аб чым сказана ў адпаведных інструкцыях.

Хлеб, харчовыя прадукты і 80 проц. промтавараў за зданую ільнапрадукцыю размяркоўваюцца паміж калгаснікамі ў адпаведнасці з затрачанымі імі на работу з ільном працаднямі. У мінулую загатоўчую кампанію фонды стымулявання загатовак лёну размяркоўваліся ў многіх раёнах сярод усіх калгаснікаў, уключаючы і тых, якія не прымалі ўдзелу ў рабоце з ільном. Частку гэтых фондаў, галоўным чынам хлеб, старшыні калгасаў адразу-ж прадавалі «Закупхлебу». Гэту практыку разбазарвання хлеба, прызначанага калгаснікам за іх работу з ільном, трэба ліквідаваць самым рашучым чынам, а вінаватых прыцягваць да адказнасці, як за зрыў дырэктыў партыі і ўрада, памятаючы, што фонды стымулявання маюць рашаючае значэнне для загатовак.

Арганізацыйна-масавая і палітычная работа сярод калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў у кампанію загатовак лёну мае агромнае значэнне. Практыка мінулага года паказала, што змест арганізацыйна-масавай работы са здатчыкамі лёну зводзіўся ў цэлым радзе раёнаў да пустой траскатні і залішняга шуму. Склікаліся розныя злёты, канферэнцыі, выносіліся вялікія пастановы, але гэтым справа канчалася (Лёзна, Мсціслаў). Недастаткова быў наладжан жывы інструктаж, не было паказу як апрацоўваць лён, якім чынам дабіцца высокай якасці.

Арганізацыйна-масавая і палітычная работа, побач з накіраванасцю на разгром кулацкага сабатажа і недаацэнкі выканання дзяржаўнага плана загатовак прадукцыі лёну і каноплі, павінна быць насычана вытворчым зместам і перанесена к месту работы асноўнай масы калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў—на сушыльна-мяльны і трапальны пункт.

Паказаць тэхніку перапрацоўкі лёну, лепшыя формы арганізацыі працы лепш за ўсё можна на самой вытворчасці. Гэтым павінны заняцца жывыя людзі, спецыялісты з Заготлёна, райзагаў і аграномы.

Вялікае значэнне ў загатоўках лёну і пянькі мае культурна арганізаваны прыёмачны пункт і база. Заготпункт і базы павінны не толькі добрасумленна і чэсна прымаць лён і каноплі, своечасова разлічвацца са здатчыкамі, але і арганізаваць культурнае абслугоўванне здатчыкаў: устанавіць радыё, вывесіць на відным месцы газету, лепшыя ўзоры лёну і пянькі, зданыя перадавымі калгасамі і аднаасобнікамі, вывесіць на дошку ганьбы ўзоры дрэннай якасці лёну нядобрасумленных калгаснікаў і аднаасобнікаў, на відным месцы павінны быць вывешаны загатоўчыя цэны і нормы тавараў стымулявання, дошкі чырвоныя і чорныя, дошка ходу загатовак па сельсаветах і т. д.

Паказ лепшых і горшых калгаснікаў і аднаасобнікаў праз раённы друк, праз сценгазету заготпункта і базы мае каласальнае значэнне. Таму сувязь заготпункта ў перыяд загатовак з мясцовым друкам павінна быць самай цеснай. Вялікае значэнне таксама мае пасылка Заготлёнам або райзагам паведамленняў кантрактантам, якія адстаюць у загатоўках і здаюць дрэнную якасць, разам з узорамі іх лёну і ўзорамі лёну лепшых перадавых калгасаў і працоўных аднаасобнікаў.

Загатоўчы пункт павінен з усёй сур'ёзнасцю падыйсці да прыёмкі прадукцыі, не дапускаць зніжэння, або павышэння яе фактычнай якасці. За абман ільназдатчыкаў, за недабраякасную адгрузку прадукцыі дзяржаўнай прамысловасці вінаватыя будуць прыцягвацца да суровай адказнасці

Вопыт загатовак у мінулым годзе паказаў, што пры недастатковай класавай пільнасці кіраўнікоў (Заготлён, райзагі, ільназаводы) у загатоўчы апарат пралезлі здраднікі, жулікі, кулакі і іх агенты (Бешанковічы, Талачын, Крычаў, Б.-Кашалёва і інш.), якія займаліся чыстым шкодніцтвам, зрываючы план загатовак: падраблялі прыёмачныя квіткі, выдавалі кулакам на перапрацоўку прадукцыю, затрымлівалі выдачу здатчыкам фондаў стымулявання, разбазаравалі гэтыя фонды і т. д.

Задача партыйных і савецкіх арганізацый—яшчэ раз праверыць апарат загатоўчых органаў і ачысціць яго ад жулікаў, былых гандляроў, кулакоў і іх агентаў, стварыць надзейны, бальшавіцкі, працаздольны і кваліфікаваны апарат, здольны вырашыць важнейшую задачу.

На 1/X загатоўлена 15,3 проц. ільнавалакна.

Ужо першыя дні паказваюць недастатковую раскачку і тэмпы загатовак. Кіраўніцтва арганізацый такіх рашаючых ільнаводных раёнаў, як Дубровенскі, Бялыніцкі, Мсціслаўскі і раду інш., не ўлічылі леташніх памылак і дапускаюць іх паўторным чынам у пытаннях пярвічнай перапрацоўкі, якая па сутнасці вырашае справу загатовак. План загатоўкі лёну на 1/X выканалі ад 1,7 да 10,7 проц. Гомельскі, [illegible], Віцебскі, Глускі і рад іншых раёнаў яшчэ не прыступілі да загатоўкі ільнавалакна, тады як Сенненскі, Оршанскі, Дрысенскі, Лёзненскі, Полацкі загатовілі валакна лёну і трасты ў пераводзе на валакно ад 26 да 57,7 проц.

План загатовак ільнанасення на 20-IX выканалі Менскі, Чырвона-Слабодскі, Сенненскі, Оршанскі раёны—ад 100,1 да 108,3 проц. Мсціслаўскі, Шклоўскі, Клічаўскі, Чырвонапольскі—толькі ад 59,2 да 67,0 проц. Падобны гэтаму малюнак з рассцілам і пад'ёмам са сцелішч ільнатрасты. Адсюль відаць, што не ўсе раёны па-бальшавіцку ўключыліся ў барацьбу за выкананне плана здачы дзяржаве тэхкультур, не мабілізавалі шырокія масы калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў на барацьбу за высокаякаснае ільнавалакно, за своечасовае і датэрміновае выкананне плана здачы (продажы) дзяржаве прадукцыі лёну і канапель.

Паасобныя загатоўчыя арганізацыі недастаткова ўважліва аднесліся да ачысткі складскіх памяшканняў, не зрабілі патрэбнай дэзінфекцыі (Бялыніцкі, Уздзенскі, Менскі і інш. раёны), чым дапусцілі заражэнне ільнанасення кляшчом—шкоднікам, які знішчае сотні тон высокаякаснага насення. Трэба неадкладна павесці барацьбу з кляшчом як на загатскладах, так і ў калгасах, у аднаасобным сектары, бо вельмі часта заражанае насенне прывозяць здатчыкі са сваіх складаў. Ачысткай і дэзінфекцыяй складаў трэба заняцца самым рашучым чынам. Заражанае насенне трэба зараз-жа ачысціць ад кляшча; перавеяць на звычайнай веялцы, прасушыць, пералапаціць.

Нельга забываць, што ў загатоўках лёну і пянькі сустрэнецца не мала цяжкасцей. Класавы вораг—кулак і яго агенты—больш чым на іншых участках работы будзе аказваць нам супраціўленне, сабатаж, шкодніцтва, скарыстоўваць адсталыя і несвядомыя элементы з асяроддзя калгаснікаў і аднаасобнікаў, каб лягчэй было зрываць нашы поспехі ў апрацоўцы і загатоўцы тэхкультур.

Мабілізуючы шырокія масы калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў на датэрміновую здачу лёну і пянькі, ведучы рашучую барацьбу з апартуністычнай недаацэнкай гэтай важнейшай у БССР кампаніі з боку пасобных партыйных, савецкіх работнікаў і загатоўчага апарата, ведучы бязлітасную барацьбу з кулацкім сабатажам,—датэрмінова загатовім лён высокай якасці. Усе умовы для гэтага ёсць. Справа толькі ва ўмелай арганізацыі і расстаноўцы людзей, арганізацыі працы ў калгасных брыгадах, на сушыльна-мяльным пункце, ва ўмелым спалучэнні арганізацыйных мерапрыемстваў з практычнымі задачамі

Ф Нольдэ

Закупкі хлеба трэба правесці арганізавана

Беларусь к 5 верасня, за 40 дзён, выканала дзяржаўны гадавы план хлебанарыхтовак. Леташні план быў выкананы толькі ў першых чыслах студзеня.

Атрымана буйная перамога.

> «Рабочы клас, калгаснікі і працоўныя аднаасобнікі Беларускай рэспублікі ўправе ганарыцца тым, што яны за такі кароткі час спраўдзілі рашучы пералом у сельскай гаспадарцы і выканалі свае абавязацельствы перад дзяржавай датэрмінова. Гэта з'яўляецца найбольш яркім пацверджаннем таго, што сельская гаспадарка Беларусі ўцвярдзілася на шляху магутнага ўздыму і росквіту» (Гікало).

Рашэннем ЦК ВКП(б) і СНК Саюза ССР дазволена закупка хлеба. Гэта пастанова дазваляе спажывецкай кааперацыі і Заготзярно прыступіць да закупкі хлеба ў паасобных калгасах, у калгаснікаў і аднаасобнікаў, выканаўшых свае абавязацельствы перад дзяржавай па хлебапастаўках, звароту ссуд, не чакаючы выканання гэтых абавязацельстваў усёй областцю, або раёнам, сельсоветам у цэлым.

На аснове гэтай пастановы спажывецкая кааперацыя і Заготзярно ў Беларусі разгарнулі закупку хлеба. На 25 верасня закуплена 8,376 тон, з іх спажывецкай кааперацыяй 7,206 і Заготзярно 1,170 тон.

Калгаснікі, аднаасобнікі сустрэлі гэтую пастанову з гарачым адабрэннем, бо [illegible] ужо поўнасцю закончылі выкананне гадавога плана хлебапаставак дзяржаве і зварот ссуд. У раёнах, дзе ў цэлым гадавога плана хлебаздачы яшчэ не выканалі, таксама нямала калгасаў, калгаснікаў і аднаасобных гаспадарак, выканаўшых свае абавязацельствы перад дзяржавай.

Добры ўраджай у гэтым годзе на калгасных і аднаасобных палях Беларусі дае магчымасць калгасам, калгаснікам і аднаасобнікам прадаць дзяржаве значную колькасць таварнага хлеба, які застаецца пасля выканання абавязацельстваў, і набыць сель[illegible] машыны, аўтамашыны, цвікі, жалеза, аконнае шкло, [illegible] фоны, ма[illegible] якія ві[illegible]

Аднак, не гледзячы на спр[illegible] закупкі хлеба ва ўсіх раенах, першыя дні паказваюць, што [illegible] аў хлебазакупкам з самага пачатку не ўдзелена сур'ёзная увага раёнными п[illegible]

Паспяхова разгортваюць работу: Менскі раён, закупіўшы на 25 верасня 451 тону, Оршанскі 661, Капыльскі 395, Жлобінскі 450, Рагачоўскі—300, Любанскі—301 і інш. Адстаюць, закупіўшы ўсяго ад 6 да 60 тон хлеба, Лепельскі, Шклоўскі, Асіповіцкі, Клічаўскі, Мсціслаўскі, Слуцкі, Касцюковіцкі раёны, Чырвонапольскі і Лельчыцкі фактычна яшчэ не прыступілі да закупкі хлеба.

Гэта паказвае, што паасобныя раённыя арганізацыі спадзяюцца на самацёк у хлебазакупках.

«Правда» 22 верасня пісала:

> «Закупка хлеба—справа вялікая, і не толькі гаспадарчая, але і палітычная. Толькі безнадзейны апартуніст можа думаць, што хлебазакупкі можна цалкам перадаверыць кааперацыі або апарату Заготзярно. Не, за поспех хлебазакупак адказваюць перш за ўсе мясцовыя партыйныя арганізацыі і выканкомы саветаў. Яны павінны прымусіць кааперацыю працаваць як след, яны павінны дапамагчы кааперацыі і Заготзярну па-бальшэвіцку правесці закупкі хлеба».

Гэтыя указанні цэнтральнага органа нашай партыі павінны знайсці практычнае праламленне ў рабоце раённых партыйных арганізацый і РВК.

> «Трэба не толькі ўсебакова растлумачыць калгаснікам і аднаасобнікам выгаднасць для іх продажы хлеба дзяржаве, г. зн. не толькі правесці агітацыйную работу, але і забяспечыць закупку хлеба ў кожным данным раёне поўнаю сумай арганізацыйных мерапрыемстваў» («Правда» ад 22 верасня 1934 г.).

Закупку хлеба неабходна правесці арганізавана і ні ў якім разе не разлічваць на самацёк. Работнікі сістэмы спажыўкааперацыі, а асабліва Заготзярно, павінны памятаць, што закупаць хлеб трудней, чым прымаць яго па хлебапастаўках. Некаторыя работнікі пунктаў разважаюць, што яны з гэтай работай, як і з хлебапрыёмкай, лёгка справяцца без уліку асаблівасцей закупкі хлеба непасрэдна ў калгасах, у аднаасобнікаў і калгаснікаў.

Загадчыкі пунктаў разам з закупшчыкамі павінны безадкладна прыступіць да закупкі хлеба непасрэдна ў калгаснікаў і аднаасобнікаў, усебакова растлумачыўшы ім выгаднасць продажы хлеба дзяржаве.

> «Неабходна памятаць, што хлебазакупкі з'яўляюцца праверкай нашага умення арганізаваць масы на барацьбу за выкананне важнейшых дзяржаўных заданняў» (Гікало, арт. у «Правде»).

Спажыўкааперацыя павінна забяспечыць крамы неабходнымі таварамі, умець знайсці прадаўца хлеба, у час прыйсці да яго, а не чакаць яго ў прыёмачных пунктах спажыўкааперацыі і Заготзярна.

Некаторыя аднаасобнікі і нават калгаснікі, карыстаючыся патураннем мясцовых улад, ударыліся ў спекуляцыю—незаконны гандаль хлебам. З падобнаю з'явай неабходна з усей строгасцю весці барацьбу.

Трэба растлумачыць калгаснікам і аднаасобнікам, што калгасны гандаль хлебам на базарах і чыгуначных станцыях дазваляецца толькі спецыяльнай пастановаю ўрада пасля выканання рэспубліканскага плана не толькі хлебапаставак, але і засыпкі насенных, фуражных і страхавых фондаў.

Калгаснікам і аднаасобнікам, выканаўшым свае абавязацельствы перад дзяржавай, прадастаўляецца поўная магчымасць законным шля-

хам прадаваць свой хлеб спажыўкааперацыі і Заготзярну і за выручаныя грошы купляць неабходныя тавары па сходных цэнах.

Спажыўкааперацыя і Заготзярно павінны шырока растлумачыць калгаснікам і аднаасобнікам, што прадаўшы дзяржаве хлеб атаварвацца дэфіцытнымі промтаварамі. Яны павінны шырока папулярызаваць колькасць і асартымент тавараў, якія мае права закупіць у кааперацыі калгас, калгаснік, аднаасобнік за прададзены хлеб.

Кожны калгас, калгаснік і аднаасобнік за прададзены спажыўкааперацыі ці Заготзярну хлеб мае права купіць промтавараў у сярэднім на суму у тры разы большую кошту прададзенага хлеба. Напрыклад, калі прадана хлеба на тры рублі, то можна купіць дэфіцытных промтавараў з фонда стымулявання хлебазакупак на 9 руб., калі хлеба прадана на пяць руб., то промтавараў будзе на 15 рублёў і т. д.

Для пакупкі такіх прадметаў, як веласіпед, патэфон, двухствольнае ружжо, кішэнны гадзіннік, трэба прадаць хлеба не менш, як на адну пятую іх кошту, а па астатніх таварах —у сярэднім на адну трэцюю.

У гэтым годзе павялічваецца цана цэнтнера закупленай пшаніцы на 92 к., а цэнтнера жыта на 61 к. На астатнія культуры застаюцца цэны мінулага года. Цэны дыферэнцыяваны у залежнасці ад умоў кожнага раёна.

Акрамя стымулявання калгасаў, калгаснікаў і аднаасобнікаў дэфіцытнымі промтаварамі пры продажы хлеба дзяржаве, урад склаў умовы зацікаўленасці для самых работнікаў загатоўчых арганізацый і цалкам раённых арганізацый у паспяховым выкананні планаў закупкі хлеба.

На аснове рашэння ўрада, з кожнага закупленага пуда хлеба адлічваецца паўтара фунта для снабжэння і прэміявання работнікаў сельпо і закупшчыкаў з Заготзярна. Акрамя таго, паўтара фунта ідзе для свабоднай продажы кааперацыяй у раённых цэнтрах і чыгуначных станцыях. У распараджэнне райвыканкома адлічваецца тры процанты ад колькасці закупленага хлеба па раёну. Гэтыя адлічэнні павінны служыць стымулам сапраўднай большэвіцкай барацьбы за паспяховае разгортванне закупкі хлеба ва ўсіх раёнах рэспублікі.

Адлічэнні на прэміяванне работнікаў сельпо і Заготзярна павінны быць шырока папулярызаваны сярод работнікаў гэтых сістэм для максімальнага разгортвання соцспаборніцтва паміж спажыўсістэмай і Заготзярно, паміж сельпо і закупачным пунктам Заготзярна на паспяховае правядзенне закупкі хлеба.

Як раённыя партыйныя арганізацыі і савецкія органы, так і райканторы Заготзярна і спажывецкая кааперацыя павінны арганізаваць справу так, каб кожны калгаснік і аднаасобнік прадалі свае лішкі хлеба поўнасцю дзяржаве. Ні ў якім разе нельга дапусціць спроб голага адміністравання і імкнення закупіць хлеб выключна за кошт калгаснага фонда.

Побач з паспяховым разгортваннем закупкі хлеба неабходна звярнуць сур'ёзную ўвагу на яго якасць, бо кандыцыі пры прыёмцы закупленага хлеба застаюцца тыя-ж, што і пры прыёмцы зярна па абавязковых пастаўках, за выключэннем скідкі натурай, як гэта прымянялася пры здачы зярна па хлебапастаўках.

Зярно, заражанае клешчам, прымаецца, але пры продажы такога хлеба дзяржаве неабходна арганізаваць ачыстку яго непасрэдна на месцы. Калі паасобныя прадаўцы не маюць такіх магчымасцей, то ачышчаць зярно трэба сіламі прадаўца на тых зернаачышчальных

машынах, якія ёсць на пунктах кааперацыі і Заготзярна, з давядзеннем кляшча з 3-й ці 2-й ступені да 1-й.

Шырока праводзячы аргмасавую работу, спажыўкааперацыя павінна сустрэць паток хлеба неабходнымі таварамі шырокага спажывання. Тым часам у Слуцкім і ў іншых раёнах адпушчаныя на стымуляванне хлебазакупак тавары няправільна запланаваны і размеркаваны, не ўсюды здавальняюць устаноўленаму асартыменту.

Рашэннем СНК СССР на раёнуапаўнаважаных камітэта загатовак ускладаецца непасрэднае, жывое, штодзеннае кіраўніцтва закупкам хлеба. Раённыя ўпаўнаважаныя адказваюць за закупку хлеба не менш, чым загатоўчыя арганізацыі. Яны павінны сачыць, каб прадаўцы хлеба забяспечаны былі таварамі ў бліжэйшых крамах спажыўкааперацыі, у поўнай адпаведнасці з рашэннем урада.

Не ўсе пункты Заготзярна прыступілі да закупкі хлеба. Яны неахвотна бяруцца за гэтую работу, бо думаюць, што не справяцца з ёю, не маючы для закупкі хлеба такой разгорнутай сеці як у кааперацыі. Некаторыя раённыя арганізацыі не даюць адпору гэтай трусасці і нават садзейнічаюць ей. Напрыклад, Віцебск не даў задання па хлебазакупках на верасень пунктам Заготзярна.

Сістэма Белзаготзярно павінна ўдзельнічаць у закупцы хлеба нароўні са спажыўкааперацыяй. З гэтай работай яна ўпаўне можа справіцца, калі яе пункты скарыстаюць лепшых прыёмшчыкаў хлеба, якія аслабаніліся цяпер ад работы ў сувязі з заканчэннем хлебапаставак, а раённыя арганізацыі дапамогуць пунктам Заготзярна як людзьмі, так і сваім штодзенным аператыўным кіраўніцтвам.

Справу закупкі хлеба ва ўсіх раёнах трэба арганізаваць так, каб на аснове масавай работы і сацспаборніцтва сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў і паміж загатоўчымі арганізацыямі забяспечыць найлепшае выкананне задання партыі і ўрада па закупцы хлеба.

Н. Багуслаўскі

Бібліятэчная справа ў БССР на новым этапе

Да Октябрскай рэвалюцыі на тэрыторыі Беларусі было не больш дзесятка бібліятэк, створаных [illegible] у асноўным на сродкі ад платы за чытанне, у наемных памяшканнях. Буйнейшыя бібліятэкі у Менску, Магілеве, Віцебску мелі ў той час па 2—3 сотні чытачоў, у асноўным жыхароў горада, вучняў прыватных гімназій, чыноўнікаў, купцоў, духавенства і інш. маемых груп насельніцтва. Рабочыя і працоўныя сяляне амаль не карысталіся бібліятэкамі. Даволі высокая плата за чытанне пры нізкім узроўні зарплаты рабочага не давала яму такой магчымасці.

Галоўнае, што перашкаджала карыстацца кнігай,—гэта амаль суцэльная няграматнасць працоўнага насельніцтва Беларусі. Самадзяржаўе не асабліва клапацілася аб культурнасці сваіх «верных падданых», бо «працаваць у саматужнай прамысловасці або батраком у пана мог з поспехам і няграматны». Аднак яно клапацілася аб тым, каб бібліятэкі выконвалі палітыку царызма. У масавых, так званых «народных», бібліятэках даваліся кнігі на рускай мове па асобаму спіску міністэрства.

Кніг на беларускай мове—роднай мове большай часткі насельніцтва не было. Не мелі шырокага распаўсюджання і кнігі на мовах іншых нацыянальнасцей Беларусі.

Толькі пры дыктатуры пролетарыята бібліятэчная справа набывае шырокі размах, абслугоўваючы ў першую чаргу працоўныя масы горада і вёскі. Ажыццяўляецца заклік Леніна — змагацца «за агульнае павышэнне культуры», за тое, каб «чалавек на справе карыстаўся уменнем чытаць і пісаць, каб меў што чытаць, каб ён меў газеты і прапагандысцкія брашуры, каб яны правільна размяркоўваліся і даходзілі к народу».

Рабочы клас Беларусі пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў на чале з яе Цэнтральным камітэтам за першыя гады мірнага гаспадарчага і культурнага будаўніцтва (1921—1928) разгарнуў шырокую сець бібліятэк ў горадзе і вёсцы. К пачатку першай пяцігодкі у БССР было ўжо 275 масавых бібліятэк, 453 хаты-чытальні.

У рэзультаце першай пяцігодкі Савецкая Беларусь пры братняй дапамозе Савецкага саюза ператварылася [illegible] ную, у адну з перадавых савецкіх рэспублік.

За гады першай пяцігодкі пабудавана 40 новых прадпрыемстваў [illegible] скага краю.

На базе гістарычных перамог соцыялістычнай эканомікі, індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі дасягнуты грандыёзныя поспехі і ў культурным будаўніцтве. Беларусь—лепшы прыклад таго, што: «перыяд дыктатуры пролетарыята і будаўніцтва соцыялізма ў СССР ёсць перыяд росквіту нацыянальнай культуры, соцыялістычнай па зместу і нацыянальнай па форме».

Ужо ў 1932 годзе была атрымана рашучая перамога: БССР стала краінай суцэльнай граматнасці.

Увядзенне ўсеагульнага абавязковага пачатковага навучання, абавязковай політэхнічнай асветы на базе 7-годкі для ўсіх дзяцей абодвага пола да 17 год нязмерна падняло агульны культурны ўзровень працоўных БССР.

План соцыялістычнага будаўніцтва ў 2 пяцігодцы паставіў перад працоўнымі задачу—дапоўніць пафас будаўніцтва пафасам асваення новай тэхнікі. Патрэбнасць кнігі стала неад'емнаю часткай быту рабочага і калгасніка. Вырасла зацікаўленасць тэхнічнаю кнігай.

Вывучэнне інтарэсаў чытача, праведзенае на заводах «Большэвік» і «Мяснікова», гаворыць аб тым, што каля 90 проц. старых рабочых чыталі М. Горкага, Л. Талстога, Д. Беднага, амаль кожны чытаў штонебудзь з Леніна і Сталіна, прапрацаваў матар'ялы XVII партыйнага з'езда. Рабочыя знаёмы таксама з творчасцю сучасных беларускіх пісьменнікаў. Ад 30 да 70 проц. рабочай моладзі чыталі творы Купалы, Коласа, Крапівы, Александровіча. Рабочы аўтаматычнага цэха фабрыкі «Пролетарская перамога» (Барысаў) аб сабе гаворыць: «Чытаю кнігі даўно. За апошні час прачытаў: «Жалезны паток» Серафімовіча, ранейшыя творы Маякоўскага, на беларускай мове—Гудзінера «Чалавек з вінтоўкай» (пераклад з яўрэйскай) і Кузьміча «Крылл » (пераклад з украінскай). Ва ўласную бібліятэку набыў творы Горкага, Ясенскага. З беларускіх пісьменнікаў люблю чытаць Коласа, вершы Александровіча».

Ва ўмовах соцыялістычнай фабрыкі рабочы пачынае жыць заможным жыццём.

У БССР за гады 1-ай пяцігодкі выдана каля 13 млн. кніг масавага карыстання, 88 назваў газет з гадавым тыражом 127.220 тыс. (акрамя заводскіх і палітаддзельскіх шматтыражак), 10 назваў часопісаў з тыражом 1.202 тысячы, 2.000 назваў кніг у 14,5 млн. экземпляраў выпускае штогод ДВБ. Літаратура РСФСР, Украіны і іншых брацкіх рэспублік распаўсюджваецца ў вялікай колькасці, каб задаволіць разнастайны попыт на кнігу шматнацыянальнага працоўнага насельніцтва Савецкай Беларусі.

К пачатку 1934 г. у Беларусі налічвалася 1.444 хаты-чытальні, 773 масавыя бібліятэчкі, дзесяткі бібліятэк ВНУ і навуковых установ. У бібліятэках Беларусі сканцэнтравана каля 4,5 млн. томаў. Адной толькі сеццю масавых бібліятэк сістэмы АНА і профсаюзаў абслугоўваецца 270—300 тысяч чытачоў.

У 1932 г., у новым будынку, пачала работу Цэнтральная Дзяржаўная бібліятэка і Бібліяграфічны інстытут імя Леніна. Бібліятэка налічвае ўжо 1.300 тысяч томаў, тысячы чытачоў праходзяць за дзень праз розныя яе габінеты і чытальні. Па прыстасаванасці будынка, каштоўнаму фонду і размаху работы яна з'яўляецца адной з лепшых бібліятэк у СССР.

Бібліятэчная справа ў БССР пастаўлена ўсё-ж нездавальняюча. У рашэнні ЦК КП(б)Б ад 19/VIII—1933 г. указана, што Наркамасветы

у кіраўніцтве бібліятэчнай справай дапусціў паўчэнні самацёк. У бібліятэкі пралезлі класава-варожыя пролетарыяту людзі, якім РВК і горсоветы даручылі бібліятэчную справу. Пад выглядам ачысткі бібліятэк ад класава-варожай пролетарыяту літаратуры гэтыя людзі здавалі ў макулатуру творы класікаў марксізма-ленінізма, мастацкую літаратуру і інш. каштоўныя кнігі (Лёзна, Сураж, Орша). Такая «чыстка» нанесла агромную шкоду. Рад буйных масавых бібліятэк страцілі дзесяткі тысяч, а некаторыя да палові свайго кніжнага фонда (Віцебск, Орша, Гомель).

ЦК КП(б)Б даў суровую ацэнку кіраўніцтву Наркамасветы гэтым участкам, папярэдзіўшы гаркомы, райкомы КП(б)Б і асабліва загадчыкаў АНА, што адказнасць за бібліятэчную работу ў раёнах у першую чаргу нясуць яны.

Ацэнка, даная ў пастанове саюзнага ЦВК ад 27/III—1934 г. становішчу бібліятэчнай справы ў СССР поўнасцю адносіцца і да Беларусі. Сетка бібліятэк БССР далёка не здавальняе ўзросшых запатрабаванняў на кнігу. Бібліятэкі ўсё яшчэ нездавальняюча выконваюць сваю задачу прапаганды комунізма, даведзення да мас чарговых задач і лозунгаў партыі.

Кніжныя фонды ў радзе бібліятэк за апошнія гады слаба папаўняліся і значна састарэлі. Нярэдка бібліятэкі не мелі патрэбных сродкаў на папаўненне літаратурай. Мсціслаўскай раённай бібліятэцы, пачынаючы з 1929 г., па 1933 г. уключна, адпускалася ўсяго 400 руб. у год на папаўненне. Гэтых грошай ледзь хапала на перыядычны друк.

У Клічаўскім раёне сродкі, адпушчаныя на папаўненне новай літаратурай бібліятэк, хат-чытальнь за 1933 год не былі выкарыстаны і на палову. Гомельская гарадская раённая бібліятэка атрымала ў 1933 годзе ўсяго 1000 руб. Нядзіўна, калі ў раённых бібліятэках Лоеўскага, Буда-Кашалеўскага, Лагойскага і інш. раёнаў не было поўнага збору твораў Леніна, Маркса, Энгельса, Сталіна і іншай актуальнай літаратуры.

Бібліятэчныя работнікі па сваёй кваліфікацыі не забяспечваюць ідэйна вытрыманага кіраўніцтва даручанай ім справай.

З матар'ялаў абследвання, праведзенага культпропам ЦК у 1933 г., відаць, што ў профсаюзных бібліятэках комуністаў 8 проц., комсамольцаў 14 проц., выхадцаў з рабочых 36 проц.; у 23 бібліятэках сістэмы АНА—партыйцаў 3 чал., комсамольцаў 7 чал., выхадцаў з рабочых 7 чал., 20 проц. іншых па паходжанню. Новыя кадры бібліятэкараў маюць слабую як агульную палітычную, так і спецыяльную падрыхтоўку: 60 проц. з ніжэйшай асветай і толькі 12 проц. са спецыяльнай. Перападрыхтоўкай кадраў зусім не займаліся. Бібліятэчнае аддзяленне пры Магілеўскім палітасветтэхнікуме камплектавалася людзьмі з асветай за пачатковую школу і выпускала кадры бібліятэкараў, якія дрэнна спраўляліся са сваімі задачамі. Кніжныя фонды многіх бібліятэк раскрадваліся, «зачытваліся».

У бібліятэцы фабрыкі «Герой працы» (Гомель) з 20—25 тысяч томаў засталося толькі 6 тысяч. Падобныя факты адзначаны ў мінскім клубе будаўнікоў, у Заслаўі, Петрыкаве і іншых раёнах.

ЦВК СССР указаў, што такі стан бібліятэчнай справы асабліва нецярпім ва ўмовах буйнага развіцця прамысловасці, перабудовы на соцыялістычны лад сельскай гаспадаркі і безупыннага росту культуры сярод працоўных мас.

У студзені гг. створана бібліятэчнае кіраўніцтва НКА, як орган дзяржаўнага кантроля над усімі бібліятэкамі, які кіруе камплектаваннем, вывучае і арганізуе падрыхтоўку бібліятэкараў, вядзе ўлік бібліятэчнай работы і т. д.

Пры наркаматах асветы ствараюцца советы па бібліятэчнай справе. Гэтым самым вырашаецца важнейшае пытанне аб усталяванні агульных асноў і каардынаванні работы бібліятэк.

Пры неаслабнай увазе ЦК КП(б)Б за гэты час значна палепшылася бібліятэчная справа ў БССР. Бюджэт масавых бібліятэк сістэмы АНА вырас на 102 проц. супроць 1933 г., галоўным чынам па асігнаваннях на новую літаратуру. Значна вырасла матар'яльная база 83 важнейшых бібліятэк, адчынены 2 новыя буйныя бібліятэкі ў рабочых цэнтрах: Нова-Барысаве і Крычаве.

Рашэннем беларускага ўрада з 1 студзеня 1934 года павышана заработная плата бібліятэчным работнікам, нароўні з настаўнікамі настаўлена іх снабжэнне.

Падрыхтавана праз курсы 42 чал. і перападрыхтавана, з адрывам і без адрыву ад вытворчасці, 49 чалавек.

Пры Менскай дзяржаўнай бібліятэцы імя Леніна арганізавана метадычная група з кваліфікаваных работнікаў у дапамогу масавым бібліятэкам. Кожны месяц выходзіць спецыяльны крытыка-бібліяграфічны бюлетэнь беларускай кніжнай прадукцыі. Завочным навучаннем за бібліятэчны тэхнікум і ВНУ ахоплена ўжо 30 бібліятэкараў.

Упершыню ў 22 раёнах шырока практыкуецца міжбібліятэчны абанемент з бясплатнай перасылкаю кніг у 2 канцы. Па ініцыятыве палітаддзелаў МТС і БАКТ'а сярод калгаснікаў распаўсюджана каля 1000 калгасных бібліятэчак з гатовымі бібліятэчнымі шафамі.

Менскі бібліятэчны калектар камплектуе 292 бібліятэк у 51 раёне.

Аднак усё гэта толькі першыя крокі на шляху рэалізацыі пастановы ЦВК СССР ад 27/III—34 года.

СНК і ЦВК БССР у развіццё пастановы саюзнага ўрада вынеслі рашэнне, якое павінна стаць набыткам кожнага бібліятэчнага работніка, кожнага актывіста, чытача, кожнага працоўнага Беларусі. Яно служыць тою праграмаю дзеяння, вакол якой павінны быць мабілізаваны ўсе звенні бібліятэчнай справы, пачынаючы ад чырвонакутніка кнiганошы і да работнікаў бібліятэчнага кіраўніцтва.

Згодна гэтаму рашэнню, за другую пяцігодку кніжны фонд у масавых бібліятэках павінен вырасці не менш як у 3 разы, а на вёсцы не менш як у 5 раз.

У кожным раёне, МТС, соўгасе, буйным прадпрыемстве, павінна быць бібліятэка. Ужо ў 1934 годзе намечана адкрыць 30 новых базавых бібліятэчак пры МТС і 15 пры буйных соўгасах, над якімі павінны ўзяць шэфства бібліятэчныя работнікі гарадоў, асабліва буйных палітасветных бібліятэк, інструктаваць іх у пытаннях камплектавання, мабілізаваць грамадскасць гарадоў для дапамогі ім кнігамі і іншым.

Комсамольскія арганізацыі ў сваю чаргу павінны вылучыць лепшых, добра граматных комсамольцаў для работы ў бібліятэках МТС, соўгасаў, узяць на сябе арганізацыю кнiганоства ў паасобныя калгасы, брыгады, населеныя пункты; вылучыць ад ячэек комсамольцаў для работы ў перасоўках.

Буйны недахоп масавых бібліятэк—слабое выкарыстанне кніжных фондаў.

Ленін, аддаючы бібліятэчнай справе выключную увагу, гаварыў, што трэба

> «бачыць гордасць і славу публічнай бібліятэкі не ў тым, колькі ў ёй рэдкасцей, колькі якіх-небудзь выданняў XVI века або рукапісаў X века, а ў тым, як шырока абарачваюцца кнігі ў народзе, колькі прыцягнута новых чытачоў, як быстра задавальняецца любое патрабаванне на кнігу, колькі кніг раздана на дом, колькі дзяцей прыцягнута к чытанню і карыстанню бібліятэкай».

У пастанове ЦВК СССР указана:

> «Усе бібліятэкі масавага абслугоўвання, незалежна ад таго, якім арганізацыям яны належаць, не павінны, як правіла, адмаўляць працоўным у абанеменце, а таксама ў спраўках па пытаннях чытання».

Вось чаму трэба рашуча і канчаткова знішчыць перашкоды, якія затрымліваюць прасоўванне кнігі. У Нова-Барысаве бібліятэка АНА мае 800 кніг і не можа абслужыць рабочых, тым часам у гэтым-жа памяшканні ёсць другая бібліятэка з 4000 кніг, якія амаль не выкарыстоўваюцца, бо бібліятэкар выдае кнігі толькі рабочым «свайго саюза». У масавых бібліятэках пры чыстцы стварыліся так званыя «закрытыя фонды», многія кнігі трапілі туды няправільна, іх трэба вярнуць для выдачы чытачу.

Платнасць за чытанне, як яўная, так і скрытая ў выглядзе залогаў, што да апошняга часу практыкуецца ў такіх бібліятэках як цэнтральная магілеўская і оршанская, дзе залогі дасягаюць 5 руб. з чытача, трэба расцэньваць як грубае парушэнне палітыкі партыі. Бібліятэкі не павінны браць залогу з чытачоў, якія стала пражываюць у дадзенай мясцовасці.

Сур'ёзную увагу трэба звярнуць на правільную пастаноўку ахвы і ўліку кніжнай маёмасці і так наладзіць бібліятэчную тэхніку, каб у бібліятэцы можна было-б у любы час адшукаць патрэбную кнігу, каб не было мёртвых душ чытачоў, якія [illegible] кнігі, вырываюць лісты, злосна псуюць кнігі. Бібліятэчныя работнікі павінны весці ў першую чаргу праз грамадскасць выхаваўчую работу сярод чытачоў, прыцягваючы злосных да суровай адказнасці.

У час падрыхтоўкі да з'езда пісьменнікаў Беларусі рад бібліятэк Мінска, Барысава і іншых гарадоў арганізавалі канферэнцыі чытачоў, уцягнулі ў работу гэтых канферэнцый пісьменнікаў, арганізавалі сярод рабочых збор рэцэнзій на паасобныя мастацкія выданні, выпусцілі рэкамендацыйныя спісы на кнігі, [illegible] лепшых узораў пралетарскай літаратуры, і г. д.

У гэтых бібліятэках значна павялічылася наведванне новых чытачоў. Вопыт канферэнцый чытачоў, як адна з важнейшых форм масавай работы, павінен быць перанесен ва ўсе бібліятэкі і праводзіцца не кампанейскі, а сістэматычна.

Усесаюзны з'езд пісьменнікаў паставіў перад бібліятэкамі [illegible] палепшыць абслугоўванне [illegible]. Разам з прапагандай матар'ялаў з'езда бібліятэкі павінны [illegible] масавыя формы работы з чытачом, якія практыкаваліся [illegible] падрыхтоўкі да з'езда, палепшыць сувязь бібліятэк з пісьменнікамі [illegible]

Бібліятэкі павінны [illegible] літаратуры, за сур'ёзную прапрацоўку мастацкіх твораў на тэха-

фах крытыкі, за эбор водзываў, за кансультацыі, правядзенне конкурсаў на лепшага чытача мастацкай літаратуры, мабілізаваць чытачоў на барацьбу за чыстату мовы ў нашым друку, накіроўваць іх зацікаўленасць на самастойную творчую работу ў галіне мастацкай літаратуры.

Да мерапрыемстваў лепшага выкарыстання кніжных фондаў трэба аднесці таксама і арганізацыю чытальняў пры кожнай бібліятэцы і патрэбнай у іх утульнасцю прыстасаваць расклад работы бібліятэк да патрэб паасобных катэгорый чытачоў—рабочых і калгаснікаў.

ЦК ВКП(б) у сваёй пастанове аб самаадукацыі прапанаваў наркаматам асветы арганізаваць у бібліятэках дапамогу тым, хто займаецца самаадукацыяй. Рад бібліятэк пачаў гэту работу.

Загадчык рэчыцкай раённай бібліятэкі піша:

> «Прапрацавалі пастанову ЦК ВКП(б) аб самаадукацыі. Падабралі літаратуру, наглядныя дапаможнікі, прыцягнулі ў бібліятэкі настаўнікаў, інжынера, урача, фатографа, агранома ў якасці кансультантаў.
>
> Знайшлі чалавека, які ведае нямецкую і англійскую мовы. Зараз мы ўжо маем 40 чалавек сталых наведвальнікаў, якія займаюцца ў нас самаадукацыяй, не лічачы тых, якія прыходзяць у нашу бібліятэку слухаць групавыя кансультацыі.
>
> Правялі ўлік завочнікаў і самавучак. Завербавалі 14 чалавек, якія скончылі вячэрнюю рабочую школу і хочуць спецыялізавацца па матэматыцы і грамадазнаўчым навукам.
>
> Каб выявіць усіх, хто хоча займацца самаадукацыяй, правялі па цэхах розных прадпрыемстваў гутаркі, выступалі на канферэнцыі завочнікаў, на пленуме райпрофсовета.
>
> Усё гэта адразу дало рэзультаты. Пачаўся прыток новых чытачоў з вёскі, што пацягнула за сабой арганізацыю ў раёне міжбібліятэчнага абанемента. Па просьбе чытачоў настаўнік 10-годкі т. Шчэрбак прачытаў лекцыю на тэму: «Сутнасць хрысціянства і яўрэйскай пасхі». Прысутнічала 80 чалавек. Чытальны зал не мог эмясціць усіх жадаючых паслухаць.
>
> Зараз рыхтуем лекцыю «Аб светабудове». Гэта тэма высунута масавым чытачом».

Падобнага роду пачынанні ёсць і ў іншых бібліятэках. Віцебская бібліятэка арганізавала габінет самаадукацыі, бібліятэка мінскага завода «Большэвік» аказвае дапамогу 16 самавучкам, завода «Мяснікова»—10 чалавекам і т. д.

Дапамагаюць самаадукацыі пакуль нязначная колькасць бібліятэк. Добры вопыт перадавых не выкарыстоўваецца. Аддзелы народнай асветы і грамадскія арганізацыі мала гэтым цікавяцца.

Рашэнне ЦК ВКП(б) аб самаадукацыі павінна быць поўнасцю рэалізавана кожнай бібліятэкай. Гарадскія і раённыя аддзелы народнай асветы абавязаны ў бліжэйшы час забяспечыць бібліятэкі неабходнай літаратурай—у першую чаргу стабільнымі падручнікамі сярэдняй і вышэйшай школы. Райкомы партыі, секцыі навуковых работнікаў, саюз работнікаў асветы ў парадку грамадскай нагрузкі павінны вылучыць кваліфікаваных таварышоў у дапамогу самавучкам чытачам для сістэматычных кансультацый, лекцый і дакладаў.

Важнейшы ўчастак бібліятэчнай справы—дзіцячыя школьныя бібліятэкі. У Беларусі налічваецца 6 дзіцячых самастойных бібліятэчак. Пры 84 бібліятэках ёсць дзіцячыя аддзяленні. Сярэднія школы маюць

бібліятэчны фонд у 900 тысяч томаў. Аднак вялікая колькасць дзяцей не чытае ў бібліятэках з-за адсутнасці ў іх «цікавых кніг» і з прычыны іх слабой работы.

Дзеці вымушаны браць кнігі ў таварышоў і чытаць, як гэта паказалі матар'ялы абследвання ў менскіх школах, творы Чарскай, Шэрлока Холмса, Нат-Пінкертона і інш.

Вельмі паказальна, што школьнікі мала ведаюць такіх пісьменнікаў, як Гайдэр, Паўстоўскі, Безбародаў, Кажэўнікаў, творамі якіх ганарыцца сучасная дзіцячая літаратура. Гэтых кніг няма ў большасці палітасветных, дзіцячых і школьных бібліятэк.

Школа наша мае ўжо вялікія поспехі ў палепшанні ўсёй сваёй работы. У барацьбе за веды, за павышэнне культурнага ўзроўню школьнікаў вялікую ролю павінны адыграць дзіцячыя бібліятэкі, стаць цэнтрамі кіраўніцтва пазашкольным чытаннем.

Трэба сказаць, што ні АНА, ні дырэктары школ як след не цікавяцца гэтай справай і часта даручаюць яе мала падрыхтаваным настаўнікам у парадку дадатковай стаўкі.

Справа даходзіць часта да кур'езаў. У Полацку малапісьменны бібліятэкар рэкамендаваў дзяўчынцы 11 год кнігу Зарэцкага «Хмары жыцця», хлопчыку 10 год—кнігу Цішкі Гартнага «Сокі цаліны», хлопчыку 4 класа—кнігу Мурашкі «Сын» і т. п.

Абслугоўванне дзяцей кнігай у бліжэйшы час павінна быць рэзка палепшана. Загадчыкі аддзелаў народнай асветы абавязаны перш за ўсё поўнасцю і рацыянальна выкарыстоўваць сродкі на папаўненне літаратурай дзіцячых бібліятэк, узмацніць іх кваліфікаванымі работнікамі, даручаючы кіраўніцтва чытаннем у школах вопытным выкладчыкам.

Намечаныя Наркамасветы кароткатэрміновыя курсы павышэння кваліфікацыі школьных бібліятэкараў, арганізацыя новых дзіцячых бібліятэк, стварэнне узорных школьных бібліятэк ёсць мерапрыемствы, якія павінны, пры мабілізацыі грамадскасці і ў першую чаргу настаўнікаў масавай школы, выцягнуць з прарыву гэты важнейшы ўчастак комуністычнага выхавання.

Правядзенне ленінскай нацыянальнай палітыкі немысліма без абслугоўвання кнігай і газетай працоўных на роднай мове. Вось чаму асабліва нецярпіма недаацэнка важнасці прасоўвання кніг на мовах нацыянальных меншасцей, што мае месца сярод бібліятэчных работнікаў. У БССР—7 яўрэйскіх бібліятэк, 4 польскія, 1 латышская, 53 польскія хаты-чытальні, 21 яўрэйская, 2 літоўскія, 2 нямецкія, 4 украінскія і 2 іншыя.

Амаль ва ўсіх буйных раённых і гарадскіх бібліятэках ёсць нацыянальныя аддзелы. У Цэнтральнай дзяржаўнай бібліятэцы нацыянальныя аддзелы кніг па сваёй магутнасці і значэнню выходзяць за межы БССР.

Але, не гледзячы на ўсё гэта, папаўненне бібліятэк літаратурай на мовах нацыянальных меншасцей пастаўлена горш, чым папаўненне рускай і беларускай кнігай.

Слабая работа з кніжным фондам, адсутнасць масавых мерапрыемстваў па прасоўванню кнігі, вярбоўцы чытачоў—асноўныя прычыны кепскага абслугоўвання нацыянальных меншасцей БССР на іх роднай мове. Вопыт канферэнцыі чытачоў-яўрэяў (бібліятэка клуба імя Сталіна), арганізацыя кніганосства па месцу жыхарства яўрэяў (барысаўская бібліятэка) і прапаганда кнігі—вось формы масавай работы, якія павінны быць падхоплены ўсімі бібліятэкарамі.

Улічваючы агромнае значэнне бібліятэк для перавыхавання шырокіх мас працоўных, партыя і ўрад сваімі рашэннямі за апошні час стварылі ўмовы быстрэйшай ліквідацыі адставання бібліятэчнай справы ад іншых участкаў соцыялістычнага будаўніцтва. Але не заўсёды гэтыя пастановы праводзяцца ў жыццё раённымі арганізацыямі, аб чым сведчаць факты, ускрытыя Наркамасветы.

У Клімавіцкай раённай бібліятэцы не было належнай літаратуры, тым часам як з 10 тысяч рублеў, адпушчаных ў 1934 г., выкарыстана к 1 ліпеня толькі 1 тысяча, ды і то на зарплату. У Магілеўскім раёне на цэлы рад месяцаў затрымлівалася выплата зарплаты бібліятэчным работнікам, бюджэт раённай гарадской бібліятэкі з 30 тысяч быў зніжан да 17 тысяч і выкарыстан гарадскім советам не па прамому прызначэнню. Тым часам у цэнтральнай бібліятэцы амаль няма польскай літаратуры, на 2400 чытачоў-дзяцей прыпадае 2000 кніг.

Не глядзячы на катэгарычную забарону займаць без раўнацэннай замены бібліятэчныя памяшканні пад іншыя установы, Лагойскі РВК сваім рашэннем перадаў у ліпені гэтага года памяшканне раённай бібліятэкі пад канцэлярыі, згрудзіўшы бібліятэку ў адзін невялічкі пакоік.

Работнікі Узденскага РВК самавольна скарацілі бюджэт бібліятэкі з 3000 да 1000 руб. РВК выселіў бібліятэку з памяшкання, і яна ўжо 5 месяцаў фактычна не працуе.

У Крупскім раёне па тры месяцы не выдаецца зарплата загадчыку бібліятэкі. У Талачынскім, Магілеўскім і Касцюковіцкім—не выконваюцца дырэктывы СНК БССР аб павышэнні заработнай платы бібліятэчным работнікам.

Гэтыя факты бяздушных адносін да бібліятэк, нежадання праводзіць у жыццё пастановы ЦВК СССР патрабуюць умяшання адпаведных органаў.

Бібліятэчныя работнікі Беларусі па-баявому павінны мабілізавацца на выкананне пастаўленых перад імі задач, каб ператварыць нашу рэспубліку і ў галіне пастаноўкі бібліятэчнай справы ў адну з перадавых у Совецкім саюзе.

КАНСУЛЬТАЦЫІ

Фашызм у Германіі [1])

Капіталістычны свет шчыльна падыходзіць к новаму туру рэвалюцый і войн. У рэзультаце зацяжнога эканамічнага крызіса ўсе больш абвастраюцца супярэчнасці як унутры капіталістычных краін, так і паміж імі.

Усе больш абвастраюцца супярэчнасці паміж пралетарыятам і буржуазіяй. Усе больш абвастраюцца супярэчнасці ў лагеры самой буржуазіі як у межах адной дзяржавы, так і розных дзяржаў. Усе больш абвастраюцца супярэчнасці паміж метраполіямі і калоніямі.

Рост магутнасці Савецкага саюза і рост рэвалюцыйнага руху мас у капіталістычных краінах штурхае буржуазію на мабілізацыю ўсіх сіл для барацьбы супроць кампартыі і рабочага класа сваей краіны і супроць Совецкага саюза.

Германія і Далекі Усход—вузлавыя пункты, дзе супярэчнасці капіталістычнай сістэмы дасягнулі найбольшай вастрасці. Абвастрэнне класавай барацьбы ў краіне, шпаркае нарастанне рэвалюцыйнага крызіса, знешнее становішча Германіі прымусілі нямецкую буржуазію перайсці ад метада прыкрытай дыктатуры к метаду адкрытай тэрарыстычнай дыктатуры найбольш рэакцыйнай часткі фінансавага капітала—к фашызму.

Асноўная мэта фашызма—разгром кампартыі, разгром рэвалюцыйнага руху, «крыжовы паход» супроць Совецкага саюза

Усе рэвалюцыйныя сілы мабілізуюцца супроць фашызма. Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ствараецца адзіны фронт барацьбы з фашызмам. У Германіі народныя масы не хочуць жыць пад ботам Гітлера. Перамога фашызма у Германіі ёсць прыкмет слабасці буржуазіі, якая ўжо не ў сілах панаваць старымі метадамі.

Ідэя штурма спее ў масах германскага пралетарыята, якія кампартыя Германіі мабілізуе на штурм фашызма, на барацьбу за совецкую Германію.

1. Як узнік фашызм у Германіі і як ён прышоў к уладзе

Фашызм з'яўляецца прадуктам манапалістычнага капіталізма ва ўмовах, калі пралетарская рэвалюцыя ўжо перамагла на адной шостай зямнога шара, калі пагроза пралетарскай рэвалюцыі навісла над астатнімі капіталістычнымі краінамі. Глыбокая расхістанасць капіталістычнай сістэмы, усё больш мацнеючы рэвалюцыйны рух вымушаюць буржуазію перайсці к адкрытаму шалёнаму наступленню на

[1]) [illegible]

рабочы клас. Шляхам разгрому рэвалюцыйнага руху, вайны і інтэрвенцыі яна шукае выхад з тупіка.

З асаблівай сілай праяўляецца гэта нямецкім фашызмам, які стаў на чале ўлады у перыяд канца крушэння частковай стабілізацыі капіталізма, у рэзультаце найглыбейшага эканамічнага крызіса, які узрушыў увесь капіталістычны свет і Германію ў асаблівасці, бо ў Германіі крызіс ускладняўся яе глыбокай залежнасцю ад версальскага дагавора.

Цэнтралізацыя капітала набыла нябачаныя памеры. Адсюль, з аднаго боку,—падрыхтоўка фашысцкай цэнтралізацыі дзяржаўнай улады, а з другога—небывалы рост армії дэкласаваных элементаў, гарматнага мяса для фашысцкіх авантур.

Вынік крызіса—жудаснае абнішчанне рабочага класа і працоўнага сялянства. Права на працу стала прывілеяй, якую фашызм скарыстоўвае, каб унесці раскол у рады рабочых.

Соцыял-дэмакратыя ўсёй сваёй здрадніцкай дзейнасцю падрыхтавала прыход к уладзе Гітлера. Першы рэакцыйны атрад, узначалены афіцэрамі франтавікамі, з якога пазней склалася асноўная група штурмавікоў, створан быў не Гітлерам, не Грынгам, не Рэмам і не Штрасерам, а Носке—крывавым псом соцыял-дэмакратыі, як яго назвалі рабочыя. Першыя атрады будучых узброеных сіл фашызма ствараліся паліцэй-прэзідэнтамі, соцыял-дэмакратамі ва ўсіх частках Германіі. Супрацоўніцтва з буржуазіяй, падначальванне інтарэсаў рабочага класа інтарэсам буржуазіі прапагандавалася соцыял-дэмакратычнымі правадырамі на працягу паўтара дзесятка год.

У цэнтры сваей увагі соцыял-дэмакратыя заўсёды ставіла задачу—абліваць патокамі гразі і паклепу бацькаўшчыну пролетарыяў і працоўных—Совецкую краіну. Соцыял-дэмакратычны друк з «Форвердсам» на чале з дня на дзень займаўся траўляй рэспублікі Советаў, распаўсюджваючы аб ёй самыя бязглуздыя выдумкі. Гэтым соцыял-дэмакратыя спрабавала скампраметаваць у вачах рабочых ідэю дыктатуры пролетарыята. Соцыял-дэмакратычныя тэарэтыкі ўсе свае сілы аддавалі барацьбе супроць пролетарскай дыктатуры, выступаючы на розныя лады за класавы мір з буржуазіяй і за актыўную дапамогу капіталізму (тэорыя «гаспадарчай дэмакратыі» Гільфердынга і т. д.). Адначасова соцыял-дэмакратычныя тэарэтыкі, як верныя псы капіталізма, стараліся аблагародзіць панаванне фінансавага капітала, абвяшчаючы яго прыдзвер'ем у соцыялізм, некаторыя-ж тэарэтыкі запэўнівалі, што ён прадстаўляе сабою соцыялістычны лад, а таму ўсякая барацьба супроць капіталізма прадстаўляецца нечым злачынным.

Гэта здрадніцкая прапаганда стаўшай на чале ўлады соцыял-дэмакратыі суправаджалася арганізаваным тэрорам соцыял-дэмакратычных паліцэй-прэзідэнтаў супроць усякіх стачак, супроць усякіх выступленняў рабочых. Такім чынам была разгромлена рэвалюцыйная вайна пролетарыята ў 1918—23 гг., былі забіты лепшыя кіраўнікі германскага пролетарыята—Карл Лібкнехт, Роза Люксембург і інш. Рабочы клас Германіі быў глыбока расколат і губляў бітву за бітвай, не гледзячы на яго гатоўнасць весці барацьбу. Соцыял-дэмакратыя на працягу паўтара дзесятка год з'яўлялася асноўнай і рашучай апорай капіталізма. Над магілай прэзідэнта соцыял-дэмакрата Эберта прадстаўнікі германскага капіталізма адкрыта гаварылі аб яго агромных заслугах, аб тым, што ён выратаваў краіну ад большэвіцкай небяспекі. Соцыял-дэмакратычныя правадыры самі прызнавалі, што яны выра-

тавалі нямецкі капіталізм, што яны выратавалі буржуазную дзяржаву. За апошнія гады да фашысцкага перавароту парламентарызм паступова абмяжоўваўся, прэзідэнту даваліся выключныя паўнамоцтвы. Наступленне супроць рабочага класа, сялянства і працоўных мас краіны набывала гіганцкія памеры. Скасоўваліся ўсе заваёвы, прынятыя ў час рэволюцыі пад націскам рэволюцыйных мас. На фабрыках і заводах устанаўляецца сістэма тэрора, ізаляцыі рэволюцыйных рабочых, выкідваньня з фабрык комуністычных элементаў, абмяжоўваецца права беспрацоўных на дапамогу. Паступова праводзіцца ўся тая сістэма мерапрыемстваў, якія пазней былі ў разгорнутым, поўным выглядзе прыменены фашысцкім урадам.

Але нават гэта адкрытае наступленне супроць рабочага класа апраўдвалася соцыял-дэмакратыяй. Соцыял-дэмакраты заклікалі рабочы клас падтрымліваць буржуазію, галасаваць за прадстаўніка нямецкіх памешчыкаў і буйнага капіталіста—Гіндэнбурга. З гэтай мэтаю яны стварылі славутую здрадніцкую тэорыю «меншага зла», г. зн., што з двух зол Гітлер—Гіндэнбург трэба выбіраць «меншае» і падтрымліваць яго. Тэорыя «меншага» зла была «абгрунтавана» процістаўленнем парламентарызма, дэмакратыі, фашызму. А раз Гіндэнбург «за дэмакратыю», значыць ён «супроць» фашызма.

Так соцыял-дэмакратыя змагалася за перадачу ўлады Гіндэнбургу, за плячыма якога стаяў узброены нямецкі фашызм. Так падтрымліваўся дыктатарскі ўрад Брунінга, пазней Фон-Папена, пазней Шлейхера,—урады, якія ужывалі дыктатарскія метады, уводзілі тэрор супроць рабочага класа, стараліся перакласці ўвесь цяжар крызіса на плечы працоўных мас. Толькі падобная палітыка магла паступова падрыхтаваць магчымасць адкрытага тэрора, магчымасць панаваньня самай рэакцыйнай, самай шавіністычнай партыі фінансавага капітала, якою з'яўляецца фашысцкая партыя ў Германіі. Яе першыя групы сфармаваліся ўжо ў 1920 годзе. Яны вербаваліся галоўным чынам з унцер-афіцэраў і афіцэраў, якія вярнуліся з сусветнай вайны глыбока расчараванымі.

Нямецкае юнкерства, пазбаўленае свайго прывілеяванага, выключнага становішча, якое яно займала ў старой вільгельмаўскай Германіі, марыла вярнуць Германіі яе былую велич, вярнуць яе ў разрад буйнейшай імперыялістычнай ваеннай дзяржавы. Яно шукала сабе аднадумцаў сярод той масы унцер-афіцэраў і часткова салдат, якія ў выніку вайны згубілі ўсякую прафесію, не маглі знайсці сабе месца ў пасляваеннай Германіі. Поўныя шалёнай ненавісці к рабочаму класу, к пролетарскай рэволюцыі, яны вялі прапаганду сярод дэкласаваных элементаў, якія гублялі глебу пад нагамі, абяцаючы ім усякія багацці: нібы пры «вялікай Германіі» кожны галавы абыватель будзе жыць у здаволенасці і дастатку, што ніякія «небяспечныя элементы» не будуць трывожыць яго сыты супакой. Адначасова яны ўбівалі ў галаву гэтаму дэкласаванаму абывацелю, што ён—«дробны чалавек» пакутуе, зруйнован іменна ў выніку ваеннага паражэння Германіі, віноўнікамі чаго з'яўляюцца рэволюцыянеры: «чырвоныя», «марксісты». З-за «марксістаў», гэта значыць комуністаў, ён страціў глебу пад нагамі.

Усе гэтыя элементы, якія згрупаваліся ў саюз франтавікоў, у брыгады Эрхарта, у «стальны шлем», паклалі пачатак нацыянал-соцыялістычнай нямецкай партыі. Фактычна гэтыя арганізацыі падтрымлівалі Веймарскім соцыял-дэмакратычным урадам у барацьбе супроць рабочага руху. Нямецкі фінансавы капітал стварае сабе такім чынам

масавую апору ў гэтых фашысцкіх арганізацыях. На гэта яго штурхае таксама глыбокае расчараванне шырокіх мас у соцыял-дэмакратыі, якая ў рэзультаце не магла ўжо дастаткова забяспечыць, пры усім сваім жаданні, дыктатуры магнатаў капітала.

У час цяжкіх крызісаў у Германіі 20—21—23 гг. фашысцкія арганізацыі скарыстоўваюцца ужо як дапаможныя у барацьбе супроць пролетарыята. У 1923 г. нацыянал-соцыялісцкі рух ужо субсідуецца буйнымі капіталістамі—Тіссенам, Клекнерам, Шахтам і іншымі капіталамі германскай індустрыі—кіраўнікам германскіх фінансаў. Праграма нацыянал-соцыялісцкай партыі павінна скрыць яе асноўную ролю—партыі фінансавага капітала. Яе асноўная прапаганда вядзецца супроць Версальскага і Сан-Жэрменскага мірных дагавораў, за «раўнапраўе» германскага народу з іншымі нацыямі. Пад флагам барацьбы за раўнапраўе нямецкага народу ўжо выстаўляюцца патрабаванні ўзброення і ствараюцца фактычна неафіцыяльныя зачаткі новай арміі (па Версальскаму дагавору Германіі забаронена ўзбройвацца, меш больш ста тысяч салдат).

Гэта новая армія павінна забяспечыць поўны разгром рэволюцыйнага руху у Германіі, яна павінна разбурыць ачаг сусветнай «комуністычнай заразы»—СССР, яна павінна служыць зброяй рэвізіі за Версальскі дагавор. Калі першыя дзве задачы могуць выклікаць толькі спачуванне сярод усіх імперыялістаў, то апошняя задача абвастрае яшчэ больш канфлікт паміж фашызаванай Германіяй і краінамі-пераможцамі, у асаблівасці - Францыяй. Гітлер заяўляе, што мы «не адмаўляемся ні ад аднаго немца ні ў Паўднёвай Германіі, ні ў Эльзас-Латарынгіі, ні у Паўднёвым Тыролі, ні ў Польшчы, ні ў калоніі Лігі нацый Аўстрыі, ні у дзяржавах—наследніках старой Аўстрыі».

Будучы па сутнасці партыяй буйнага фінансавага капітала, фашысты, у мэтах стварэння масавай апоры, усяляк карысталіся да свайго прыходу к уладзе соцыяльнай дэмагогіяй у самых шырокіх памерах, каб прыцягнуць дробную буржуазію, якая згубіла у эпоху інфляцыі 23 г. усе свае уклады, усе свае зберажэнні, абяцаюць «поўнае скасаванне неработнага і непрацоўнага даходу, знішчэнне процантнай кабалы, канфіскацыю ваенных прыбыткаў, адзяржаўленне буйных прадпрыемстваў, трэстаў і развіцце ў самых шырокіх маштабах забяспечання прастарэлых. Гаворачы ў туманнай форме аб дармовых адчужэннях у выпадку патрэбы і аб рашучай барацьбе з зямельнай спекуляцыяй, яны абяцаюць падтрыманне сялянству.

Аднача́сова з гэтай дэмагагічнай прапагандай ствараюцца баявыя атрады, у якіх развіваецца дух вайны, строгая ваенная дысцыпліна. Вядзецца шавіністычная ваенная прапаганда, якою нацкоўваюць сістэматычна дробна-буржуазныя масы на рэволюцыйных рабочых, як на памеху стварэння нацыянальнага германскага духа, неабходнага для таго, каб пакончыць з ганьбай Версальскага і Сан-Жэрменскага мірных дагавароў. З'яўляючыся па сутнасці партыяй, абараняючай паступова інтарэсы фінансавага капітала Германіі, фашысты скарыстоўваюць расчараванне [illegible] улады, бясконцую змену габінетаў. Яны прываблі́ваюць дробную буржуазію ідэяй моцнай улады, якая зможа ўзяць пад сваю апеку [illegible] ючых і пакрыўджаных, даць адпор іншаземнаму ворагу.

[illegible] кая буржуазія фактычна ўжо не эксплаа [illegible] клас, што яна сама пераможана, што нямецкі народ вымушан плаціць дзяржавам-пераможцам, плаціць тым, што гэты

народ у поце твару свайго вытварае і здабывае усё гэта пракладвала шлях і дапамагала фашысцкай прапагандзе.

Новае пакаленне, якое вырасла ва умовах найглыбейшага крызіса, частка якога не ведала ужо фабрык і заводаў, ніколі не ўдзельнічала ў вытворчасці, у значнай меры запаўняла рады штурмавых атрадаў і іншых вайсковых арганізацый фашыстаў.

Імперыялістычнай буржуазіі патрэбна было разбіць у крывавым тэроры ўсе тыя арганізаваныя сілы пролетарыята, якія перашкаджалі-б вядзенню вайны. Прышоўшы к уладзе, фашызм арганізуе супроць рабочага класа агалцелы тэрор, якога да фашыстаў Германія яшчэ не ведала. Фінансавы капітал бачыў самую буйную заслугу фашызма іменна ў тым, што асноўнай яго задачай была разбіць арганізаваны рабочы рух. Пры дапамозе фашызма фінансавы капітал спадзяваўся забяспечыць сабе поўную свабоду ўнутранай эксплаатацыі —магчымасць перакласці на шырокія працоўныя масы Германіі увесь цяжар крызіса, увесь цяжар міжнароднага і унутранага становішча Германіі.

Ідэалагічная падрыхтоўка вайны выражаецца ў насаджэнні і раскальванні самага дзікага азвярэлага шавінізма. Вучоныя загніваючай буржуазіі з усіх сіл імкнуцца падвесці «навуковы» базіс пад інтэрвенцыянісцкія планы Гітлера. Для гэтай мэты нямецкія фашысцкія балаці сцвярджаюць, што самым адборным народам з'яўляюцца немцы, што іншыя народы, асабліва славяне, ёсць ніжэйшая раса, ледзь не паўлюдзі.

Асноўная задача—даць шырокі прастор вышэйшай расе і абуздаць ніжэйшую расу, якая сваім нізменным духам атручвае увесь свет. Інакш кажучы, большэвізм—гэта параджэнне ніжэйшай расы, і немцы (г. зн. нямецкая буржуазія) павінны ачысціць свет ад гэтай «чумы», скарыстаць шырокія прасторы Расіі для развіцця сапраўднага нямецкага духа. Так «навукова» абгрунтоўваецца і асвяшчаецца интэрвенцыя.

Эканамічная расхістанасць Германіі, надзвычай цяжкае міжнароднае становішча яе яшчэ больш паглыбілася з прыходам к уладзе фашыстаў. Праўда, фашызму ўдалося шляхам крывавага тэрора і гвалту часова загнаць у падполле компартыю Германіі кіраўніка рэволюцыйнага руху, загнаць у турмы, канцэнтрацыйныя лагеры рэволюцыйных правадыроў германскага пролетарыята, выгнаць іх у эміграцыю. Але яму не ўдалося падавіць рэволюцыйны рабочы клас Германіі.

У апошніх выбарах фабрычна-заводскіх камітэтаў, не гледзячы на тэрор, фашысты ледзь-ледзь змаглі атрымаць 20 проц. рабочых галасоў. У 35 фабрыках найбольш індустрыяльных раёнаў Германіі колькасць галасоў не дасягала нават шасці процантаў. Правадырам фашызма прыходзілася адкрыта прызнаваць, што комуністычны рух, не гледзячы на люты тэрор, працягвае нарастаць ва ўсёй краіне і што прыходзіцца прыймаць усё новыя і новыя меры, каб перашкодзіць сувязі комуністаў з масамі, каб змагацца з усякімі формамі прапаганды комуністычнай партыі.

Тая раздробленасць у рабочым класе, якую стварыла соцыял-дэмакратыя, пачынае знікаць, паколькі соцыял-дэмакратычныя рабочыя, пачаўшы адыходзіць ад сваіх правадыроў, сталі групавацца ў рэволюцыйныя арганізацыі, пераходзіць у падпольныя арганізацыі компартыі, выражаць усяляк сваё сімпатыі ёй. Мноства так званых «німых» маніфестацый, паасобных стачак ва ўсёй краіне, пераважны ўплыў компартыі ў асноўных рабочых раёнах Рурскай вобласці, у

Гамбургу, у рабочых раёнах Берліна, дзе кожная рабочая сям'я ўсімі сваімі паводзінамі пратэстуе супроць фашысцкага тэрора, поўнае маральнае і палітычнае паражэнне, якое пацярпелі фашысцкія правадыры ў працэсе Дзімітрова,—усё гэта паказвае, наколькі нямецкі фашызм слаба справіўся з той адзінай задачай, якая з'яўляецца яго прызнанай заслугай перад фінансавым капіталам Германіі. Ён не мог задушыць рэвалюцыйны рабочы клас Германіі і яго партыю.

На міжнароднай арэне Германія таксама церпіць паражэнне. План ізалявання Францыі, спробы згаварыцца з Італіяй, атрымаць падтрыманне Англіі, ствараючы такім чынам блок чатырох магутных дзяржаў—Японіі, Англіі, Італіі, Германіі—пры ізаляцыі Францыі, скарыстоўваючы ўсе тэтыя супярэчнасці для таго, каб і ў адносінах Францыі і ў адносінах Польшчы перагледзець міжнародныя дагаворы,—гэты план пацярпеў поўны крах. Англія, сапраўды гатовая скарыстаць барацьбу паміж Германіяй і Францыяй, каб аслабіць абодва бакі, зусім не збіралася дазволіць Германіі адмовіцца ад плацяжоў і сарваць Версальскі дагавор. З другога боку, найбольш асцярожныя колы англійскага фінансавага капітала, напалоханыя ростам германскай авіяцыі, убачылі ў гэтым спробу пагрозы Англіі і тым больш сталі настойваць на ўмацаванні ваеннага саюза з Францыяй. Германскі фашызм не здолеў наладзіць ніякіх «таварыскіх адносін» і з Італіяй.

План германскага фашызма аб'яднацца з Аўстрыяй з'явіўся самай сур'ёзнай перашкодай для палепшання адносін з Італіяй, пагражаючы заваёвам Італіі ў сусветнай вайне (італьянскія правінцыі былой Аўстрыі). Гэта пагражала парушыць інтарэсы Італіі на Балканах. Таму 11-тысячная італьянская армія была падцягнута да аўстрыйскай граніцы, гатовая кінуцца ў бой у сувязі з апошнімі наступленнямі фашыстаў на Аўстрыю.

Гэта нам раскрывае інтэрвенцыяністцкі план нямецкага фашызма. Не выпадкова Германія знаходзіцца ў такой «сардэчнай дружбе» з Японіяй. Фашысцкая Германія натхняе ўсіх інтэрвентаў. Знешняя палітыка нямецкага фашызма разлічана на такія камбінацыі, дзе ў цэнтры стаіць пытанне аб інтэрвенцыі, у выніку чаго Германія атрымае «тлусты кусок». Розенберг прама ставіў к часу захопу ўлады гэту задачу, як асноўную ў міжнароднай палітыцы Германіі: «Няма цвёрдых граніц на ўсходзе. Расійская зямля бачыла многакратныя змены. Мы ўжо знаходзіліся каля Урала, на Доне, ля Варшавы, у Каўказскіх гарах і т. д.». Германія мяркуе скарыстаць далёка-ўсходнюю вайну.

Нямецкі фашызм ствараў абстаноўку вайны. Але, ствараючы абстаноўку вайны, узначальваючы крыжовы паход супроць СССР, фашысцкая Германія гэтым самым становіцца фактарам зруйнавання капіталістычнай сістэмы.

«Калі буржуазія выбірае шлях вайны, то рабочы клас капіталістычных краін, даведзены да адчаю чатырохгадовым крызісам і беспрацоўем, становіцца на шлях рэвалюцыі» (Сталін, даклад на XVII партз'ездзе).

Што абяцалі і што далі фашысты шырокім масам

Германскі фашызм не выканаў ні адной са сваіх дэмагагічных абяцанак. Яго самае асноўнае абяцанне, якое павінна было супакоіць дробную буржуазію ў тым, што ніколі не паўторыцца ў Германіі новая інфляцыя, якая да гэтага часу цяжка адчуваецца шырокімі ма-

самі дробнай буржуазіі ў Германіі,—ужо поўнасцю парушана за апошні час.

Падрыхтоўка новай вайны і закупкі сыравіны, поўфабрыкатаў з ваеннаю мэтай прывялі к таму, што запасы золата катастрафічна палі. Залатое пакрыццё даходзіла да двух процантаў і амаль звялося да нуля. Нямецкі рэйхсбанк пастаўлен перад самымі цяжкімі задачамі. Ён не можа плаціць за сыравіну, заказы заграніцай рэзка палі.

Спробы паказаць, што беспрацоўе скарацілася, пацярпелі поўны крах. Рэзкае падзенне экспарта, расходванне залатога запаса адкрываюць самую небяспечную перспектыву спынення работы і новай хвалі беспрацоўных. Галеча набыла вострыя формы. Дробная буржуазія не карыстаецца ніякай ласкаю. Буйная буржуазія стала плаціць у 1933 годзе штомесяц амаль на 20 мільёнаў марак менш налогаў, чым плаціла ў 1932 годзе. Гэта палёгка для буйнай буржуазіі вялікім цяжарам клалася на плечы працоўных. Міністэрства фінансаў афіцыйна заяўляе аб тым, што паніжэнне налогаў не прадбачыцца.

У той-жа час адкрыта ставіцца пытанне аб зніжэнні зарплаты служачым. Зарплата кожнага рабочага і служачага знізілася за 6 месяцаў у сярэднім на 16,5 марак, што складае суму ў 230 мільёнаў 250 тысяч марак, тады як цэны на прадметы першай неабходнасці ўзраслі. Амаль на 50 проц. скараціўся з 1929 г. па 1932 г. лік рабочых, якія атрымлівалі-б больш 36 марак у тыдзень. Пагоршыліся умовы сацыяльнага страхавання ад хвароб, ліквідаваны калектыўныя дагаворы, 8-гадзінны рабочы дзень, фабзаўкомы, знішчана свабода сходаў, стачак, друку, палітычных аб'яднанняў і т. д. Сотні тысяч рабочых, выгнаных з фабрык, знаходзяцца ў канцэнтрацыйных лагерах і фактычна аб'яўлены па-за законам.

Наступова фашысцкі рэжым ліквідаваў усе тыя мерапрыемствы ў адносінах вёскі, якія павінны былі паказаць хоць-бы з надворнага боку, што становішча палепшылася. Фашызм зусім адкрыта абараняе інтарэсы кулацкіх слаёў, з усёй сілай абрушваючыся на бедныя і серадняцкія сялянскія гаспадаркі. За няўплату налогаў сялянская гаспадарка падлягае распрадажы. Гэта адносіцца да агромнай колькасці сялянскіх гаспадарак, акрамя невялікай групы так званых спадчынных двароў, г. зн. буйных кулацкіх гаспадарак. На 5 мільёнаў 143 тысячы сялянскіх гаспадарак Германіі звыш 3 мільёнаў гаспадарак маюць менш двух га зямлі. Абяцанне даць гэтым гаспадаркам зямлю не толькі не было выканана, але наадварот, сістэматычна з гэтых участкаў імкнуцца выжываць бядняцкія і серадняцкія гаспадаркі.

Дрэнны ўраджай 1934 г. ударыў усім сваім цяжарам па асноўных масах вёскі і пахіснуў у значнай меры ўладу фашыстаў на вёсцы, дзе пачынаецца голад, ідзе забой жывёлы.

Яшчэ у больш цынічнай форме фашызм выступіў супроць беспрацоўных. Фашысты заяўлялі, што ліквідацыя беспрацоўя—асноўная задача фашысцкай дзяржавы. Да захопу ўлады існавалі сталовыя для беспрацоўных. Беспрацоўныя размяшчаліся ў казармах, накіроўваліся на ваенныя работы. З іх у значнай меры рэкрутаваліся масы штурмавікоў. За апошні час змяншалася паступова дапамога, беспрацоўныя выганяліся як небяспечны элемент са штурмавых атрадаў, уводзілася прымусовая праца беспрацоўных, масамі выганяліся з буйных гарадоў, не знаходзячы ў той-жа час ніякага прымянення сваім сілам у вёсцы.

Фашызм прышоў к уладзе, карыстаючыся ў шырокіх размерах сацыяльнай дэмагогіяй. Але дасягнуўшы ўлады, фашысты паказалі

шырокім масам свой сапраўдны твар палачоў рабочага класа. Яны гаварылі аб урэзванні апетытаў фінансавых магнатаў, аб забяспечанні беспрацоўных, прастарэлых рабочых і т. д. Зараз фашысцкая «навука» усяляк даказвае, што беспрацоўны—гэта «малакаштоўны экземпляр», біалагічна непрыспасоблены, яго так ці інакш трэба знішчыць у імя вызвалення чалавецтва ад лішніх «няўдалых» чалавечых экземпляраў. Фашысцкі друк крычыць аб тым, што інваліды і старыкі пагражаюць дзяржаўнаму бюджэту, што соцыяльнае страхаванне ад хвароб і калецтва прывучае рабочых к лені, шкодна адбіваецца на натуральным адборы людзей. Хто багаты, той і здольны, той—прадстаўнік «поўнацэнных людзей», хто галодны—той тупы, малацэнны і падлягае знішчэнню, стэрылізацыі і т. д. У гэтым—«гвоздз» фашысцкай «навукі» і прапаганды на даным этапе.

Старыя формы соцыяльнай дэмагогіі далі трэшчыну. Супярэчнасць паміж соцыяльным характарам фашызма і яго масавай апорай выплыла на паверхню. Гэта з асаблівай сілай сказалася пры падзеях 30 чэрвеня.

Падзеі 30 чэрвеня з асаблівай нагляднасцю паказалі, наколькі ўскладнілася становішча германскага фашызма. Зусім відавочна, што бліжэйшыя супрацоўнікі Гітлера—Рэм, Эрнст і іншыя, здраднікі і зверскі забітыя фашыстамі, і не думалі падрыхтоўваць другой рэвалюцыі. Яны служылі так сама сумленна фінансаваму капіталу, як яму служыць кіруючая галоўка фашысцкай партыі. Але яны узначальвалі мільенныя масы штурмавікоў, масы, якія у значнай меры верылі, што, громячы крамы яўрэйскіх гандляроў, яны наносяць удары фінансаваму капіталу, якія прымалі за чыстую манету абяцанні хуткай пасляхованай вайны, якія асабліва верылі ў тое, што іх становішча хутка палепшыцца.

Законны страх фашызма перад тым, што падтрыманыя масамі беспрацоўных, абяздоленых сялян, гэтыя атрады могуць ператварыцца з аплота ў пагрозу панаванню фінансавага капітала, прымусіў Гітлера быстра дзейнічаць.

Крывавая расправа 30 чэрвеня абудзіла ад фашысцкіх ілюзій значную частку дробнай буржуазіі. Маса разброеных штурмавікоў павялічыла колькасць беспрацоўных. Гэта нанесла агромны удар прэстыжу фашызма ва ўсім свеце і ў самой Германіі. Некаторыя буйныя прадстаўнікі фінансавага капітала, стварыўшыя фашысцкую партыю, як напрыклад Тіссен, палічылі за лепшае выйсці з яе радоў. Хістанні ў асяроддзі фінансавага капітала, тэндэнцыі што-небудзь «змяніць» і што-небудзь перагледзець у палітыцы фашысцкай партыі, тэндэнцыя адстараніць адных і прыцягнуць другіх,—немінуча пры такой абстаноўцы.

Фашызм губляе сваю масавую базу. Ва ўмовах растучага голаду, галечы, нездаволенасці, страху перад інфляцыяй, расчараванняў і няўдач немінуча наспяванне рэволюцыйнай вайны.

Усё гэта яшчэ не азначае падзення фашысцкай дыктатуры. Фінансавы капітал не можа страціць сваю ўладу самацёкам. Толькі пераможная рэволюцыя можа вырваць уладу з яго рук. Вось чаму ні падзеі 30 чэрвеня, ні няўдалыя авантурныя напады на Аўстрыю не змаглі самі па сабе прывесці к краху фашызма.

Падзеі апошняга часу прывялі шырокія масы на шлях немінучага выступлення супроць фашысцкага панавання. Яны паказалі з усей выразнасцю пагрозу вайны, паказалі наколькі фашызм ва ўмовах сучаснага крызіса ў Германіі не можа забяспечыць за фінансавым капі-

талам шырокай масавай базы. Тэрор пачынае пераважаць над усімі іншымі сродкамі і метадамі фашысцкай улады. Германія знаходзіцца **напярэдадні вастрэйшых класавых баёў.**

Сучасная барацьба компартыі Германіі — гэта не проста барацьба за большасць рабочага класа, а перыяд **фармавання рэволюцыйнай армії для рашучых класавых баёў за пролетарскую ўладу.**

Самае важнае ў справе фармавання рэволюцыйнай арміі—тактыка адзінага фронта. Апіраючыся на перадавую рэволюцыйную частку германскага пролетарыята, узначальваючы стыхіннае узбуджэнне мас компартыя мабілізуе рабочы клас, ні на імгненне не выпускаючы рух са сваіх рук. Побач з гэтым компартыя Германіі высоўвае лозунг усеагульнай палітычнай стачкі, для якой неабходна мабілізаваць масы шляхам разгортвання раду эканамічных баёў пролетарыята. Лозунгамі палітычнай стачкі з'яўляецца: свабода выбараў у фабзаукомы, асла-баненне ўсіх арыштаваных рэволюцыйных дзеячоў і рабочых, звяржэнне фашысцкай дыктатуры, устанаўленне совецкай улады.

Перамога пролетарыята ў Германіі будзе мець буйнейшае значэнне для перамогі пролетарскай рэволюцыі ва ўсёй Еўропе.

> «Фашысцкая Германія мініруе глебу для рэволюцыйных выбухаў у сябе дома. Але з гэтага дома, які напамінае зараз вар'яцкі дом, бікфордавы шнуры цягнуцца ва ўсе канцы Еўропы» **(Мануільскі).**

Пытанні нямецкага рэволюцыйнага руху з'яўляюцца асноўнымі пытаннямі пярэдадня другога тура рэволюцый і войн. І гэта накладае на ўсе компартыі, на ўсіх комуністаў, на рабочы клас усіх краін найвялікшую адказнасць за лёс нямецкага рэволюцыйнага руху.

Аб першапачатковай апрацоўцы лёну

Барацьба за высокую якасць прадукцыі, асабліва лёну, не абмяжоўваецца толькі высокім ураджаем. Атрымаць добры ураджай не азначыць яшчэ атрымаць высокаякаснае валакно. Пасля ўборкі лёну пачынаецца адказнейшы перыяд—працэс апрацоўкі.

Практыка мінулага году паказала, што ў радзе раёнаў, калгасаў і вёсак, дзе няўважліва падышлі да апрацоўкі лёну, не мабілізавалі калгаснікаў і аднаасобнікаў на барацьбу за высокаякаснае ільнявалакно, а парушалі агратэхнічныя правілы ў працэсе першапачатковай апрацоўкі і т. д.—з добрага ўраджаю атрымана ільнавалакно нізкай якасці. Такім чынам калгасы і аднаасобнікі нанеслі сабе матар'яльныя страты, бо недабраякаснае валакно пры здачы дзяржаве аплачвалася значна ніжэй высокіх нумароў. Акрамя таго, ад нізкаякаснага валакна церпіць пралетарская дзяржава.

Паасобныя калгасы леташ несвоечасова мачылі, рассцілалі і падымалі лён са сцелішч, значная частка лёну была згноена і засталася пад снегам. Таму ў гэтым годзе задача партыйных, савецкіх загатоўчых арганізацый і праўленняў калгасаў—увесь працэс першапачатковай апрацоўкі лёну паставіць так, каб унікнуць страт і атрымаць валакно найлепшай якасці. Ад гэтага залежыць, асабліва ў ільнаводных гаспадарках, паляпшэнне матар'яльнага становішча калгаснікаў і забеспячэнне сацыялістычнай прамысловасці добрай сыравінай. Барацьба за высокую якасць і своечасовае выкананне кантрактацыйных дагавораў па здачы (продажы) ільнапрадукцыі дзяржаве непарыўна звязана з барацьбой за бальшэвіцкія калгасы і заможнае калгаснае жыцце.

Дасягнутыя поспехі ў веснавой сяўбе, у прапалцы тэхнічных культур павінны быць замацаваны новымі поспехамі ў апрацоўцы.

Ніжэй указаны асноўныя мерапрыемствы па першапачатковай апрацоўцы лёну, ад выканання якіх залежыць высокая якасць ільнявалакна.

Рассціл і замочка

Каб атрымаць валакно высокай якасці і без страт, трэба добра падрыхтаваць месца для рассцілу і замочкі лёну. Лепшыя месцы для рассцілу гэта незабалочаныя, роўныя лугі, адкрытыя лясныя лугавыя паляны, канюшынішча і травяністае жытнішча.

Лён нельга рассцілаць на забалочаных іржавых лугах, на полі, дзе мяркуецца пасеў лёну ў будучым годзе, на высокіх адкрытых даступных ветру месцах, на нізінах, па якіх сцякае вада, а таксама на голым ворыве.

Сцелішчы трэба загадзя падрыхтаваць, ачысціць ад галля, смецця і іншых пабочных прадметаў.

Для замочкі лёну неабходна выкарыстаць усе прыгодныя натуральныя вадаемы і мачыльныя ямы, выбіраючы рэкі, азёры, пруды з ціхім цячэннем і «мяккай вадою».

Лён на сцелішчы трэба ўкладваць тонкім, роўным слоем, таўшчынёй не больш 1 см., бо толькі ў гэтым выпадку вылежка лёну будзе роўнамернай, а лён аднакалёрным.

Лепшай нормай рассцілу лічыцца 1,5 га плошчы на ўраджай лёну з 1 га.

Лён рассцілаецца жамлямі супроць пануючых вятроў. Паміж радкамі трэба пакідаць праход, каб салома не блыталася і не тапталася пры пераварочванні лёну і ўборцы трасты са сцелішча.

Ільняную салому перад рассцілам і замочкай трэба абавязкова сартаваць па даўжыні, таўшчыні, колеру і заражанасці грыбнымі хваробамі. [illegible] па якасці партыі саломы рассцілаюцца асобна, каб не паблытаць іх у час рассцілу, пад'ёму, звозкі з поля і апрацоўкі.

Для насенных ільноў павінны быць адведзены асобныя сцелішчы. Рассціл і замочка неабмалочанага або неачосанага лёну строга забаронена.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР у сваёй пастанове катэгарычна папярэджваюць, што вінаватыя ў псаванні лёну з-за несвоечасовага і няправільнага рассцілу або пад'ёму са сцелішчаў будуць прыцягвацца да суровай адказнасці.

Улічваючы асаблівую важнасць своечасовага пад'ёму лёну са сцелішч, неабходна за вылежкай саломкі ўстанавіць суровы бязупынны кантроль, асабліва ў апошнія дні. У калгасах гэта справа даручаецца спецыяльным інспектарам, вылучаным з вопытных калгаснікаў льнаводаў, а ў аднаасобным сектары—аграўпаўнаважаным. Штодзённа беручы пробы, яны павінны ўстанавіць гатоўнасць трасты, ні ў якім разе не дапускаць недалежкі ці пералежкі, перамочкі ці перасушкі лёну.

Пад'ём трасты са сцелішч праводзіцца выбарачным парадкам, па меры яе гатоўнасці незалежна ад надвор'я. Пры дажджлівым надвор'і лён трэба звезці пад павеці ці ў сухія крытыя памяшканні, дзе снапы развязваюцца і расстаўляюцца для прасушкі. Пры сухім надвор'і трасту са сцелішч трэба адвозіць непасрэдна на льназаводы, адсартаваўшы і прасушыўшы яе.

Пры пад'ёме ўсёй трасты са сцелішч трэба акуратна яе пасартаваць, каб не пераблыталася ў час вязкі ў снапы і возкі з поля. Рассартаваную па якасці гатовую трасту складваць асобна па гатунках.

Сушка трасты перад мяццем

Наступны працэс апрацоўкі ўраджаю—сушка звезенай з поля трасты. Сушылкі неабходна загадзя адрамантаваць, абсталяваць печамі і іншымі прыладамі, а таксама тэрмінова закончыць будаўніцтва сушылак палепшанага тыпу.

Зараз-жа праверыць, ці забяспечаны сушылкі апалам, а калі не, то неадкладна загатовіць і вывезці дровы для гэтай мэты.

Сушка лёну павінна быць даручана вопытным льнаводам сушыльшчыкам. Сушцы падлягае ўся ільняная траста вільготнасцю вышэй 12 проц.

Траста ў сушылцы падсушваецца пры ўмеранай тэмпературы ў 50—60 градусаў, каб магчыма было трымаць руку. Больш высокая тэмпература псуе трасту, дае жорсткае, з вялікім працантам пакл. валакно.

Сушыць лён трэба адным нагрэтым і сухім паветрам, без пары і дыму. Для награвання сушылкі карыстаецца сухімі, несмалістымі дровамі, найлепш бярозавымі. У сушылцы павінны быць абавязкова выцяжныя і дымавыя трубы.

Працэс сушкі трасты нармальнай вільготнасці (16—18 проц.) працягваецца да 7—8 гадзін пры тэмпературы 50—60 градусаў. У гэтым выпадку траста высыхае да 6—8 проц. вільготнасці. Ні ў якім разе нельга дапускаць перасушкі трасты. Шчыльнасць нагрузкі ў сушылку не павінна перавышаць 30 кгр. трасты на адзін кв. метр.

Каб траста лепш і хутчэй сохла, снапы трэба развязаць і пры пасадцы на каласнікі распраўляць у тонкія пласты, пільна сочачы за тым, каб яны роўна, не блытаючыся, датыкаліся адзін другога.

Падсушаная да 6—8 проц. вільготнасці траста павінна адлзжацца каля сутак. Мяць гарачую трасту ні ў якім разе нельга, бо будуць вялікія страты.

Лепшай для мяцця з'яўляецца траста, якая адляжалася і мае 10—12 проц. вільготнасці.

У сваей пастанове аб уборцы і першчнай апрацоўцы ўраджаю лёну і канапель ЦК КП(б)Б і СНК БССР ставяць першачарговай задачай — аўладаць тэхнікай чыгуннай мялкі (рэгуліроўка, хуткасць абаротаў і т. д.). Для гэтага патрэбны кваліфікаваныя кадры, асабліва падавальшчыкі, дыферэнцыяваны падыход да мяцця кожнай партыі лёну ў залежнасці ад яго таўшчыні, вільготнасці і вылежкі. Гэтыя кадры павінны быць падрыхтаваны да пачатку мяцця, каб яны маглі поўнасцю аўладаць тэхнікай чыгуннай мялкі.

Зараз-жа трэба праверыць гатоўнасць усіх мялак, конных прыводаў, мяльна-трапальных пунктаў і іх абсталявання, а таксама заняцца асваеннем тэхнікі чыгуннай шасціпарвальнай мялкі.

Пры мяцці лёну вальцы шасціпарвальнай мялкі павінны рабіць не больш 80—90 абаротаў у мінуту. Жменя трасты пры ўмове, калі яна будзе мець нармальную вільготнасць, павінна быць пры падачы ў мялку вагою прыкладна ў 110—140 грам. Таўшчыня жменькі, калі яе ахапіць і моцна сціснуць пальцамі сярэдняй рукі, павінна быць 4—5 см.

Каб уникнуць страт і атрымаць найбольшую колькасць доўгага валакна, неабходна:

а) перад падачай у мялку трасту старанна адсартаваць і правільна падрыхтоўваць жмені;

б) прасачыць ці правільна ўстаноўлена мялка, ці не прабаксуе перадатачны вал ад коннага прывода да мялкі;

в) у мялку падаваць роўныя ў камлявой часцы і ачышчаныя ад блытаніны жмені;

г) жменю распластваць роўнамерным слоем на ўсю шырыню стала верхавінаю уперад; на гэту работу ставіць вопытнага, спрытнага работніка;

д) лён пры выхадзе з мялкі прымаць двума рукамі, не расцягваючы і не блытаючы валакно; прамяты лён укладваць камлямі разам, крыж на крыж, або злёгку перакручваючы жмені;

е) недастаткова прамятыя жмені адкладваць у бок для паўторнага пуску ў мялку;

ж) перад работай мялку агледзець і змазаць, што робіцца не менш 3—4 раз на дзень;

з) асаблівую ўвагу звяртаць на націск вальцаў; сіла націску рэгулюецца ў залежнасці ад гатунку трасты, ступені вільготнасці, велічыні жмені, таўшчыні сцябла і сухасці трасты.

і) зуб'і вальцаў перад работай агледзець, каб яны былі добра адшліфаваны, не мелі зазубрын і ракавін, бо валакно ад гэтага псуецца.

Каб дабіцца добрай прадукцыйнасці мялкі, неабходна ў брыгадзе для кожнай змены вылучыць сталае звяно мяльшчыкаў і замацаваць за ім пэўныя месцы на гэтай рабоце.

Тропка лёну

Сырэц-валакно абавязкова павінна адляжацца перад тропкай не менш сутак. Трапаць лён адразу з-пад мялкі ні ў якім разе нельга. Вільготнасць сыравіны перад ручною тропкай не павінна перавышаць 12—13 проц. Сырэц складваць для адлежкі, па магчымасці рыхла, у сухім памяшканні і абавязкова на насціл з жардзін, або дошак.

У тропцы вялікае значэнне мае ільнатрапальная машына Гарлачова. Тым часам, выраб яе і своечасовае абсталяванне ею калгасных мяльнатрапальных пунктаў знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Не гледзячы на пастанову СНК БССР, амаль нідзе не прыступлена да вырабу ільнатрапалак Гарлачова, у прыватнасці нават у Мсціслаўшчыне, хоць вынаходца іх тав. Гарлачоў з'яўляецца калгаснікам гэтага буйнага ільнаводнага раёна.

Выраб ільнатрапалкі Гарлачова і прыстасаванняў да трапальных колаў малацілкі «Эддзі» трэба неадкладна фарсіраваць.

Трэба ўзяць за правіла —сартаваць лён перад тропкай, бо неаднолькавы па моцнасці лён трапальная машына ў значнай меры саб'е на паклю. Слабы лён лепш за ўсе адабраць і апрацаваць ручным спосабам.

Трапаць лён абавязкова ў два прыемы—начарна і набела. Для тропкі набела выдзяляюцца лепшыя трапальшчыкі.

Перад пачаткам тропкі дэталёва агледзець ці правільна ўстаноўлена трапальная машына, ці добра яна змазана. Хуткасць абаротаў трапальнага кола не павінна перавышаць 120—130 у мінуту, а для поўтропкі 140—160; хуткасць абаротаў знаходзіцца ў простай залежнасці ад якасці лёну. Трапальшчык павінен адносіцца да валакна асцярожна, акуратна, уважліва; пры максімальнай ачыстцы лёну ад кастрыцы—не пашкодзіць моцнасці і каштоўнасці валакна; сачыць, каб было ў ім як мага менш паклі.

Тропанае валакно вязаць у кулікі вагою 3—4 кгр.

Улічваючы вялікія страты з-за ігнаравання сартоўкі і правільнай падвязкі трапальнага валакна ў мінулыя гады, ЦК КП(б)Б і СНК БССР абавязваюць усе РК, РВК, старшынь сельсоветаў і калгасаў звярнуць пры сартаванні валакна асаблівую ўвагу на вязку, дзеля чаго ва ўсіх ільнаводных калгасах павінны быць вылучаны сартавальшчыкі валакна.

Пры ўсіх працэсах апрацоўкі лёну абавязкова павінны прымаць удзел камісіі па якасці. Уважлівы бракераж кожнай работы, асабліва пры трапанні, павінен стаць правілам.

Неабходна шырока растлумачыць усім калгаснікам, калгасніцам і працоўным аднаасобнікам, што толькі пры ўмове строгага захавання агратэхнікі апрацоўкі лёну можна дабіцца высокаякаснага валакна,

а разам з тым атрымаць з фондаў стымулявання па ільняным працадням большую колькасць хлеба і промтавараў.

Строгае размеркаванне прэміяльных фондаў па ільняным працадням, арганізацыя соцспаборніцтва, прэміяванне лепшых і паказ горшых ёсць метады, якія дапамагаюць своечасова, поўнасцю і без страт апрацаваць ураджай лёну.

Арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў, ранняя ўборка ураджаю, дазваляюць у гэтым годзе пры ўзрослай свядомасці калгаснікаў датэрмінова распачаць перапрацоўку і здачу дзяржаве лёну па кантрактацыі.

Перадавыя калгасы пачалі ўжо апрацоўку і здачу валакна і трасты дзяржаве.

Задача ўсіх раёнаў—фарсіраваць загатоўку ільнавалакна нароўні з зярнопастаўкамі, каб забяспечыць датэрміновае выкананне загатовак і здачы дзяржаве ільнапрадукцыі высокай якасці.

Ф. Вайновіч.

КРЫТЫКА І БІБЛІЯГРАФІЯ

Аб кніжцы „ЛКСМБ у дакументах і матар'ялах"

Гісторыя комсамола Беларусі—гісторыя барацьбы працоўных мас пад кіраўніцтвам ленінскай партыі за сваю дыктатуру.

Нарадзіўшыся ў агні грамадзянскай вайны і прайшоўшы пад баявым сцягам ленінскай партыі суровую школу барацьбы з буржуазіяй, комсамол Беларусі ўпісаў не мала слаўных баявых старонак у гісторыю барацьбы працоўных за сваё вызваленне.

Разам з усёй партыяй яе верны памочнік комсамол прашоў шлях грамадзянскай вайны, крывавых сутычак з сусветнай буржуазіяй за кожны кавалачак зямлі Совецкай Беларусі, шлях барацьбы з разрухай і голадам, і стаў верным удзельнікам соцыялістычнага будаўніцтва. На фронтах, у падполлі, у партызанскіх атрадах, у барацьбе з рознымі нацыяналістычнымі і контррэволюцыйнымі партыямі атрымаў баявое хрышчэнне ленінскі комсамол.

Совецкая Беларусь у барацьбе за соцыялістычнае будаўніцтва не ведае такіх момантаў, калі-б не кіпеў энтузіязм працоўнай моладзі пад сцягам комсамола.

Багатая баявымі ўчынкамі гісторыя комсамола ўскладае агромную адказнасць за правільнае і добрасумленнае яе ізлажэнне.

Асноўная маса комсамольцаў—гэта маладыя рабочыя, калгаснікі. Яны прыйшлі ў комсамол у гады яго кіпучай дзейнасці на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва.

Гэтыя юныя будаўнікі новага соцыялістычнага бескласавага грамадства, стаўшы брыгадзірамі, кіраўнікамі цэхаў, старшынямі калгасаў, ударнікамі фабрык, заводаў, калгасных палёў, з'яўляюцца самі жывой гісторыяй комсамола ў эпоху будаўніцтва соцыялізма.

Невядомай для іх застаецца гісторыя комсамола Беларусі эпохі баёў з буржуазіяй і перамогі совецкай улады. Яшчэ няма такой кнігі, якая магла-б азнаеміць комсамольцаў і ўзрастаючую працоўную моладзь з гісторыяй узнікнення і барацьбы комсамола Беларусі. Зробленыя ў гэтым кірунку спробы канчаліся няўдачай.

Выданая ў 1924 годзе кніжка «Пяць год на аванпостах», у 1927 г. «Нарысы гісторыі комсамола Беларусі» і цэлы рад іншых дакументаў і артыкулаў,—усё гэта толькі ўрыўкі з гісторыі. У паасобных артыкулах працягвалася фальсіфікацыя сапраўднай гісторыі комсамола Беларусі, яго геройскай ролі на ўсіх этапах барацьбы працоўных мас за соцыялістычную Беларусь, авангарднай ролі КП(б)Б, яе выключнай ролі ў арганізацыі і кіраўніцтве ўсёй работай комсамола Беларусі

У выданых да гэтага часу паасобных дакументах і «працах» па гісторыі комсамола Беларусі, у паасобных артыкулах, змешчаных у гэтых выданнях, зусім адкрыта ідэалізаваліся нацыяналістычныя і контррэвалюцыйныя партыі. Такая партыя як «Бунд», якая на працягу ўсёй сваёй дзейнасці актыўна змагалася супроць нашай партыі, адною з першых стала на калені і цалавала боты нямецкіх юнкероў і белапольскіх «збаўцаў», сваімі правакатарскімі дзеяннямі супроць рабочага класа Беларусі ўсяляк імкнулася выслужыцца перад белапольскімі акупантамі, —выводзіцца ў гэтых «працах», як рэвалюцыйная арганізацыя яўрэйскіх працоўных мас, а яе верны памочнік ва ўсёй здрадніцкай дзейнасці —«Югенд-бунд» як папярэднік комсамола.

Актыўнейшая роля партыі большэвікоў у стварэнні комсамола Беларусі, безупыннае кіраўніцтва ўсёй яго работай і выхаваннем не атрымалі поўнага і правільнага асвятлення у паасобных выданнях. Затое значнае месца займае ідэалізацыя памылковых тэорый Розы Люксембург, паасобных трацкістаў (Ракаўскага), працягваецца цэлы рад трацкісцкіх тэорый, як авангардызм і т. п. Зусім ясна, што пасля ўсіх гэтых шкодных спроб сказіць і сфальсіфікаваць гісторыю комсамола, авангардную ролю партыі большэвікоў у яго арганізацыі, надзвычай неабходна выданне большэвіцкай, ідэалагічна вытрыманай гісторыі комсамола Беларусі.

Выпушчаная Інстытутам гісторыі партыі ў 1934 годзе кніга «ЛКСМБ у дакументах і матар'ялах» хоць і не прэтэндуе на паўнату асвятлення, усе-ж ставіць сабе адказнейшыя задачы: «1) паказаць, што КП(б)Б—адзін з атрадаў партыі Леніна—Сталіна—з'яўлялася арганізатарам і кіраўніком комсамола Беларусі; 2) паказаць, што комсамол рос, змагаўся і развіваўся пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі, як арганічная і неад'емная частка ўсяго комсамола Саюза; 3) паказаць, што комсамол Беларусі узнік і развіваўся ў барацьбе з контррэволюцыйнымі нацыяналістычнымі арганізацыямі моладзі, у барацьбе за большэвіцкія прынцыпы пролетарскага інтэрнацыяналізма». Кніжка ставіць сабе таксама мэтай «паказаць гераічную барацьбу, праробленую комсамолам Беларусі пад кіраўніцтвам партыі, пры дапамозе РКСМ у падполлі, на фронтах грамадзянскай вайны». Інакш кажучы,—асвятліць увесь той багаты баявы шлях, які прашоў комсамол Беларусі пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў у перыяд грамадзянскай вайны.

Ці вырашае гэта кніжка пастаўленыя перад сабой задачы?

З упэўненасцю можна сказаць —не. У кнізе асвятляецца цэлы рад бясспрэчна новых, неапублікаваных да гэтага часу дакументаў, надзвычай важных для таго, хто працуе над складаннем гісторыі комсамола Беларусі. Але, пры ўсім жаданні, кнізе не ўдаецца даць комсамольцам і працоўнай моладзі сапраўднае уяўленне аб ролі комсамола ў перыяд грамадзянскай вайны.

Асноўнага чытача, на якога разлічана гэта кніжка, не могуць задаволіць паасобныя, без усякай сувязі паміж сабою, дакументы аб дзейнасці комсамола. Яму патрэбна цэльная, папулярная, запоўненая канкрэтнымі фактамі гісторыя, якая-б асвятляла ролю і дапамогу партыі ў арганізацыі комсамола, у кіраўніцтве на фронтах, у баях, пры абароне кожнага горада, кожнай вескі кожнага кавалачка совецкай зямлі. Яму патрэбна ведаць, як партыя ва умовах падполля выхоўвала і вучыла комсамол змагацца з класавым ворагам, як трымацца ў партызанскіх атрадах, у дэфензіве, у турмах. Як партыя мабілізавала

комсамол на барацьбу з меншавіцкімі контрэвалюцыйнымі партыямі. Як комсамол са зброяй у руках гераічна змагаўся з салдатамі белапольскай арміі. Як комсамол Беларусі, выхаванец партыі Леніна—Сталіна, разам з усёй партыяй веў барацьбу супроць апартуністаў, з контррэвалюцыйным трацкізмам і іншымі ўхіламі ў нашай партыі Як комсамол паказвае бліскучыя ўзоры барацьбы на розных участках соцыялістычнага будаўніцтва.

Такая гісторыя патрэбна кожнаму комсамольцу і падрастаючай савецкай моладзі. Выдаць у бліжэйшы час такую кнігу—задача Інстытута гісторыі партыі і комсамольскага кіруючага актыва.

В. Олікер

Кніжная паліца

СТАЛІН. ПАЛІТЫЧНЫ АДЧОТ ЦК XVI З'ЕЗДУ ВКП(б)

Менск. Партвыдавецтва. 1934 г. Ст. 25. Ц. 15 к.

XVI партыйны з'езд (27 чэрвеня—2 ліпеня 1930 г.) увайшоў у гісторыю, як з'езд агульнага пераможнага наступлення сацыялізма на ўсяму фронту. Свой даклад тав. Сталін пачынае з аналізу знешняга становішча СССР і сусветнага крызіса капіталізма. Ускрываючы ўсе ўзрастаючы эканамічны і палітычны крызіс капіталістычнага свету, ён процістаўляе яму бесупынны ўздым нашай краіны і перавагі савецкай сістэмы гаспадаркі перад капіталістычнай.

Багатым лічбовым матар'ялам ілюструе тав. Сталін рост народнай гаспадаркі СССР, грамадныя поспехі ў галіне індустрыялізацыі краіны, паварот асноўных мас сялянства на шлях сацыялізма, павышэнне матар'яльнага і культурнага ўзроўню працоўных. Вызначаючы ўмовы бальшэвіцкага наступлення па ўсяму фронту, ён падрабязна спыняецца на задачах партыі ў галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі, транспарта і інш.

Тав. Сталін падкрэслівае, што для правільнага кіраўніцтва партыі будаўніцтвам сацыялізма патрэбна няўхільнае ажыццяўленне яе генеральнай лініі, непрымірымая барацьба на два фронты, жалезная дысцыпліна і адзінства партыйных радоў. На яркіх прыкладах ён паказвае поўнае банкроцтва правых ухілістаў і трацкісцкай апазіцыі. Даючы падрабязную характарыстыку ўхілаў у галіне нацыянальнага пытання, т. Сталін дае класавае азначэнне вялікадзяржаўнага шавінізма і мясцовага нацыяналізма і шляхоў развіцця нацыянальных культур ва ўмовах дыктатуры пролетарыята.

Ф. ЭНГЕЛЬС. РАЗВІЦЦЁ СОЦЫЯЛІЗМА АД УТОПІІ ДА НАВУКІ

Пад агульнай рэдакцыяй Д. Коніка. Менск. Партвыдавецтва. 1934 г. Ст. 45. Ц. 30 к.

Даючы характарыстыку французскага матэрыялізма XVIII в., утапічнага соцыялізма і гегелеўскай дыялектыкі, Энгельс у гэтай сваей класічнай рабоце паказвае іх ролю ў падрыхтоўцы навуковага камунізма, распрацаванага Марксам.

Характарызуючы матэрыялістычную дыялектыку, як тэорыю пазнання, Энгельс коратка фармулюе сутнасць дыялектыкі. Тут-жа ён дае асноўныя нарысы тэорыі гістарычнага матэрыялізма, тэорыі класаў і класавай барацьбы. Энгельс паказвае, як дзякуючы матэрыялістычнаму разуменню гісторыі, соцыялізм ператварыўся з утопіі ў на-

вуку. Ён устанаўляе глыбокую ўнутраную сувязь паміж матэрыялістычнай дыялектыкай і навуковым сацыялізмам, практычнае ажыццяўленне якога з'яўляецца гістарычнай місіяй пралетарыята.

НОВЫЕ МАТЕРИАЛЫ К РАБОТЕ В. И. ЛЕНИНА «ИМПЕРИАЛИЗМ, КАК ВЫСШАЯ СТАДИЯ КАПИТАЛИЗМА».

Под редакцией Варга, Мендельсона, Хмельницкой. Партиздат. 1934 г. Ст. 76. Ц. 90 к.

У гэтай кнізе, выданай Інстытутам сусветнай гаспадаркі і сусветнай эканомікі, сканцэнтраван вельмі багаты і мета[illegible] лічбовы матар'ял к рабоце Леніна «Імперыялізм, як вышэйшая стадыя капіталізма». Гэты матар'ял даволі ярка адлюстроўвае ўзмацненне ўскрытых Леніным асноўных рыс і тэндэнцый развіцця імперыялізма за апошнія 1½—2 дзесяцігоддзі. Ён служыць лішняй ілюстрацыяй таго, як бліскуча вытрымала гістарычную праверку ленінская тэорыя імперыялізма.

У сваім творы «Імперыялізм, як вышэйшая стадыя капіталізма» Ленін, як вядома, скарыстоўвае факты і лічбы даваеннага перыяду. Прыведзеныя ў тэтым выданні факты і лічбы капіталістычнай эканомікі наступных 20 год паказваюць далейшае [illegible] манаполій і іх гнёту, узрастанне на гэтай аснове паразітызма і загнівання капітала. Тым самым яны агаляюць адну з самых глыбокіх асноў той выключнай вострасці супярэчнасцей капіталістычнай сістэмы, якая спецыфічна для эпохі яе агульнага крызіса.

Ілюстрацыя ленінскага тэкста новымі данымі, праведзеная на працягу ўсёй кнігі, паказвае з якой выключнай хуткасцю ўзмацняюцца ўскрытыя Леніным рысы загнівання і паразітызма сучаснага капіталізма. Кніга карысна для ўсіх вывучаючых сучасныя праблемы імперыялізма і развіцця асноўных тэндэнцый сучаснай сусветнай гаспадаркі. Каштоўны матар'ял, сабраны тут, дае магчымасць яшчэ глыбей зразумець невычарпальнае тэарэтычнае багацце ленінскай тэорыі імперыялізма. Уступны артыкул Л. Мендэльсона дапаможа чытачу арыентавацца ў калонках лічб, за якімі скрываюцца важнейшыя аграмнага гістарычнага значэння зрухі і змены ў развіцці імперыялізма.

МАРКС. ЛЕНИН. ВКП(б). ТЕЗИСЫ ИНСТИТУТА МАРКСА—ЭНГЕЛЬСА—ЛЕНИНА ПРЫ ЦК ВКП(б)

Москва. Партиздат. 1934 г. Ст. 102. Ц. 65 к.

Брашура ядная тры дакументы, якімі Інстытут Маркса—Энгельса—Леніна адзначыў тры даты: 50-годдзе са дня смерці Маркса, 30-годдзе са дня II з'езда РСДРП і 10-годдзе са дня смерці Леніна. Першы дакумент дае сціслы нарыс дзейнасці і вучэння Маркса, другі характарызуе трыццацігадовы шлях ВКП(б) з часу II з'езда партыі; трэці прысвечан Леніну, як асновапалажніку сацыялістычнага будаўніцтва.

Усе гэтыя тэзісы, цесна звязаныя паміж сабою па свайму зместу, застаюцца такімі-ж актуальнымі і пасля таго, як мінавалі даты з повад якіх яны былі апублікаваны.

Надрукаваныя ў свой час у «Праўдзе» тэзісы Інстытута Маркса—Энгельса—Леніна з той пары не раз перавыдаваліся на рускай мове, на мове іншых нацыянальнасцей СССР і на замежных мовах і фак-

тычна ужо сталі дапаможнікам для партыйнага актыва, вывучаючага асновы рэвалюцыйнай тэорыі Маркса і Энгельса, Леніна і Сталіна.

Аб'яднанне тэзісаў у адной брашуры мае на мэце аблягчыць выкарыстанне гэтых дакументаў партыйным актывам і ў першую чаргу партыйнымі прапагандыстамі.

ВАРАШЫЛАЎ К. Е. АРТЫКУЛ І ПРАМОВЫ

Менск. Выдавецтва Беларускай Ваеннай Акругі. 1934 г. Ст. 298 Ц. 3 р. Пер. 75 к.

У хранапагічным парадку кніга змяшчае прамовы і артыкулы тав. Варашылава за 1924-1934 гг. Усе гэтыя матар'ялы ў асноўным прысвечаны пытанням абароны СССР і боездольнасці нашай Чырвонай арміі.

Цэлым радам лічбаў, прыкладаў і фактаў тав. Варашылаў ілюструе стан Чырвонай арміі на розных этапах апошняга 10-годдзя, яе гіганцкі рост у ваенна-тэхнічных і ідэйна-палітычных адносінах, узмацненне магутнасці і абараназдольнасці краіны. Побач з тэтым ён раскрывае інтэрвенцыянісцкія планы імперыялістаў у адносінах да СССР, іх мілітарыстычныя дзеянні, накіраваныя супроць нашай мірнай палітыкі і будаўніцтва соцыялізма.

У сваіх прамовах тав. Варашылаў удзяляе таксама шмат увагі індустрыялізацыі краіны, соцыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі, пытанням комсамольскай работы і падрыхтоўцы працоўных да абароны краіны.

СОВЕТСКАЯ ТОРГОВЛЯ МЕЖДУ XVI И XVII С'ЕЗДАМИ ВКП(б)

Материалы Наркомснаба СССР. Москва. Снабтехиздат. 1934 г. Ст. 112. Ц. 1 р. 30 к.

Прыведзеныя ў кнізе матар'ялы даюць малюнак барацьбы за развіццё совецкага гандлю паміж XVI і XVII партз'ездамі. Яны асвятляюць асноўныя рашэнні партыі і совецкай улады ў адносінах гандлю і паказваюць значэнне совецкага гандлю. Табліцы накіравання промтавараў у горад і вёску рысуюць рэалізацыю красавіковага рашэння ЦК ВКП(б) па шыропажыву.

Лічбовы матар'ял аб калгасным гандлі паказвае рост зваротаў калгаснага гандлю ў 1933 г.

Асобая ўвага ўдзелена ў кнізе развіццю рознічнага і аптовага гандлю. У заключэнне пералічаны асноўныя задачы дзяржаўнага гандлю і кааперацыі на бліжэйшы перыяд.

Гэта кніга—каштоўны дапаможнік для партыйнага, совецкага актыва і дакладчыкаў.

МАТЭРЫЯЛЫ ДА ГІСТОРЫІ МАНУФАКТУРЫ БЕЛАРУСІ Ў ЧАСЫ РАСПАДУ ФЕАДАЛІЗМА

Менск. Беларуская Акадэмія Навук. 1934 г. Ст. 300. Ц 8 р.

Праблема гісторыі мануфактуры на Беларусі ў час распаду феадальнай гаспадаркі мае вялікае значэнне. Нельга зразумець усяго складанейшага працэса распаду прыгоннай гаспадаркі і нараджэння капіталістычнага спосабу вытворчасці без глыбокага вывучэння мануфактуры, яе нараджэння і развіцця.

Выданыя Інстытутам гісторыі Беларускай Акадэміі Навук статыстычныя і дакументальныя матар'ялы па гісторыі мануфактуры на Беларусі дапамогуць вывучыць пытанне аб узаемаадносінах мануфактурнага і феадальнага спосабу вытворчасці.

Матар'ялы данага выпуску ахапляюць сорак пяць гадоў (1795—1840). Тут сабраны дакументы і матар'ялы па ўліку мануфактур, іх абсталявання, працоўнай сілы, прадукцыі, яе цаны і збыту, звароту капіталаў, а таксама класавага складу насельніцтва паасобных губерній. Акрамя таго, змешчан спіс заводаў былой Беларусі па губернiях, статыстычныя даныя аб гарадах і мястэчках Беларусі і статыстыка насельніцтва Беларусі паводле 8-й рэвізіі. У канцы даюцца геаграфічны, асабовы і прадметны паказчыкі.

МИРОВАЯ ВОЙНА В ЦИФРАХ

Москва. ГИЗ (Институт мирового хозяйства и мировой политики Компартии) 1934 г. Ст. 128. Ц. 2 р. 50 к.

Задача гэтай кнігі—даць прапагандысту, студэнту, камандным складу, шырокім колам чытачоў у найбольш кароткім і сціслым выглядзе лічбовы і фактычны матар'ял, які паказвае гіганцкі размах сусветнай вайны, выкліканае ею збядненне народных мас і страту гаспадарчых рэсурсаў, матар'ял аб ходзе ваенных дзеянняў, аб узбраеннях і арміях змагаўшыхся капіталістычных краін, аб колькасці ваенных расходаў і аб разрушэннях прадукцыйных сіл капіталістычнай гаспадаркі.

У зборніку звернута асаблівая ўвага на даныя аб становішчы працоўных мас у час вайны. Гэтыя даныя надзвычай важны для разумення працэса ператварэння вайны імперыялістычнай у вайну грамадзянскую.

Кароткі нарыс у канцы зборніка характарызуе падрыхтоўку капіталістаў да новай імперыялістычнай вайны.

Брыгада Бібліяграфічнага Інстытута БССР імя Леніна

ПАСТАНОВЫ ЦК КП(б)Б

Аб падрыхтоўцы жывёлагадоўчых соўгасаў і калгасных жывёлагадоўчых ферм да зімоўкі жывёлы

Пастанова Бюро ЦК КП(б)Б

Рашэнні пленумаў ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б аб жывёлагадоўлі, безумоўны рост арганізацыйна-гаспадарчага умацавання калгасаў і іх бальшэвізацыя, павышэнне актыўнасці калгаснікаў і беражлівых адносін да калгаснай маёмасці, ураджай, здавальняючы ўраджай хлеба, траў і карэньплодаў ствараюць усе ўмовы для добрай падрыхтоўкі і правядзення зімоўкі жывёлы ў гэтым годзе ў БССР. Аднак да гэтага часу яшчэ рад партарганізацый калгасаў і соўгасаў поўнасцю на падрыхтоўку жывёлагадоўчых ферм да зімы не пераключылася, многія райкомы, райвыканкомы і асабліва Ельскага, Дрысенскага, Заслаўскага, Лепельскага, Расонскага і іншых раёнаў, шчыльна да кіраўніцтва гэтым важнейшым мерапрыемствам не падышлі.

Зусім нездавальняюча ідзе падрыхтоўка да зімы і ў соўгасах. Так, соўгасы Менскага свінаводтрэста рамонт і перадзелку свінарнікаў на 15 жніўня выканалі толькі на 21.5 проц., будаўніцтва новых свінарнікаў на 30 проц., канюшні—на 66,5 проц. Такое-ж становішча і па другіх трэстах сістэмы Наркамсоўгасаў.

Бюро ЦК КП(б)Б лічыць, што РК партыі, РВК, палітаддзелы МТС і соўгасаў, зямельныя органы і соўгастрэсты павінны на працягу бліжэйшых дзён так перабудаваць сваю работу, каб у справе захавання дарослага пагалоўя і маладняка, яго ўкормленасці, забяспечання кармамі, цёплымі прадэзінфекцыяванымі памяшканнямі і добрым доглядам былі ўцягнуты ўсе партарганізацыі соўгасаў і калгасаў, кожны паасобны партыец і кожны калгаснік і калгасніца. Для гэтага **ЦК прапануе:**

1. ГК і РК, палітаддзелам МТС і соўгасаў арганізаваць праверку работы паасобных партарганізацый калгасаў, соўгасаў па кіраўніцтву справай жывёлагадоўлі і падрыхтоўцы да зімоўкі жывёлы калгасных і соўгасных ферм.

2. Заслухаць на бліжэйшых паседжаннях бюро РК аб стане паасобных ферм і кіраўніцтве зямельных органаў справай падрыхтоўкі да зімоўкі ферм.

3. З 15 верасня па 1 кастрычніка па ўсіх раёнах правесці масавы агляд стану жывёлагадоўчых ферм калгасаў і з 1 па 15 кастрычніка злёты загадчыкаў лепшых калгасных ферм з шырокім удзелам даярак, цялятніц, пастухоў,канюхоў і т. д. Прапанаваць сакратарам райкомаў

і начальнікам палітаддзелаў МТС разгарнуць падрыхтоўчую работу да злетаў. Арганізаваць соцспаборніцтва на лепшую ферму.

4. У канцы кастрычніка правесці ўсебеларускі злет лепшых жывёлагадоўчых ферм рэспублікі з удзелам калгаснікаў-ударнікаў жывелагадоўлі і спецыялістаў.

5. Даручыць Наркамзему і ЦП саюза МТС і батракоў правесці ў Менску, Гомелі, Віцебску і Магілеве міжраенныя канферэнцыі зоаветспецыялістаў і нам. нач. райза па жывелагадоўлі з пастаноўкай пытанняў аб падрыхтоўцы да зімы, захаванні маладняка і арганізацыі зоатэхвучобы. Даручыць райкомам партыі прыняць актыўны ўдзел у рабоце раённых вытворчых нарад спецыялістаў, праводзімых Наркамземам на працягу верасня месяца.

6. Прапанаваць рэдакцыям газет «Звязда», «Рабочий», «Калгаснік Беларусі» і інш., а таксама ўсім раённым і палітаддзельскім газетам шырока разгарнуць агляд падрыхтоўкі калгасаў і соўгасаў да зімы, да надыходзячых раённых і ўсебеларускага злёту.

7. У перыяд з 12 верасня па 1 кастрычніка правесці нараду дырэктароў соўгасаў, начальнікаў палітаддзелаў і парторгаў па пытанню аб падрыхтоўцы да зімоўкі па ўсіх соўгастрэстах.

8. У справе аўладання тэхнікай жывелагадоўлі і масавага разгортвання зоатэхвучобы даручыць БІМЗО, Наркамзему, Упаўнаркамсоўгасаў на працягу дэкады распрацаваць мерапрыемствы па арганізацыі сеткі гурткоў завочнай вучобы, сістэматычных кансультацый, а таксама выданне неабходнай літаратуры, даведнікаў і серыі красачных зоаветплакатаў, забяспечыўшы імі кожную калгасную і соўгасную ферму.

9. Абавязаць дырэктароў свінавод-і малакапромтрэстаў, а таксама ўсіх дырэктароў соўгасаў і начальнікаў палітаддзелаў забяспечыць скапчэнне рамонту кароўнікаў, свінарнікаў і т. д., іх ацяпленне і дэзінфекцыю не пазней 10 кастрычніка.

Даручыць Наркамзему распрацаваць на працягу дэкады рад мерапрыемстваў, забяспечваючых скапчэнне рамонту і новага будаўніцтва скотных двароў к устаноўленаму тэрміну. Прапанаваць РК, РВК і райза не пазней 20 верасня закончыць складанне кармавых балансаў па кожнаму калгасу, прадугледзеўшы такое размеркаванне кармоў, каб імі была таксама забяспечана жывела, якая знаходзіцца ў асабістым карыстанні калгаснікаў.

Звярнуць асаблівую ўвагу на пастаноўку ўліку і норм выдачы кармоў, увядзенне здзельшчыны і прэміяльнай аплаты.

10. Улічваючы, што ў асеннюю разводдзе большая частка соўгасаў бывае адрэзана ад снабжаючых і базісных цэнтраў, абавязаць тав. Жолудзева сумесна з дырэктарамі трэстаў на працягу дэкады распрацаваць рад мерапрыемстваў, забяспечваючых завоз у тэтыя соўгасы неабходнай колькасці кармоў мінімум на 3 месяцы. Апрача таго, да пачатку разводдзя завезці ў гэтыя соўгасы ўсе астатнія запланаваныя матар'ялы.

11. Даручыць сельгасаддзелу ЦК устанавіць сістэматычную праверку выканання данай пастановы.

Аб мясапастаўках і адгрузцы Ленінграду

Пастанова Бюро ЦК КП(б)Б

ЦК адзначае, што, не гледзячы на прамое ўказанне ЦК аб тым, што мясапастаўкі—гэта такая-ж справа, па сваей сур'ёзнасці, як і хлебапастаўкі, не гледзячы на адпаведныя рашэнні па мясапастаўках пленума ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б і рад пастаноў Бюро ЦК і тэлеграм з канкрэтнымі практычнымі прапановамі, рад раёнаў: Лёзненскі, Бешанковіцкі, Веткаўскі, Хойніцкі і інш.—прадаўжаюць займацца адпіскай, славеснай дэкларацыяй, заклінаннем замест большэвіцкай арганізацыі справы мясапаставак.

У рэзультаце квартальны план выкананы на 64,2 проц., а такія раёны, як Лёзненскі, Бешанковіцкі, Веткаўскі і інш., выканалі 21—31 проц., па сутнасці справы сарваўшы выкананне квартальнага плана па раёну.

ЦК лічыць такое становішча зусім нецярпімым і прапануе:

1. Устанавіць у ГК і РК абмеркаванне рэзультатаў кожнай пяцідзенкі па мясапастаўках, таксама як па хлебу, з неадкладным прыняццем мер па узмацненню работы. Адказнымі за своечасовую дачу пяцідзенных зводак з'яўляюцца ў раёне заг. райзаготжывелы і старшыня РВК.

2. Абавязаць тав. Сідарава (Белзаготжывела) арганізаваць у сваім апараце складанне пяцідзенных рэзультатаў мясапаставак па БССР і адгрузцы Ленінграду (не парушаючы дэкаднай справаздачнасці) і рассылаць у ЦК і іншыя цэнтральныя органы у парадку, устаноўленым для пяцідзёнак па хлебапастаўцы.

3. Устанавіць такі-ж парадак аператыўнага кіраўніцтва мясапастаўкамі па жывёлагадоўчых трэстах і ўпоўнаркамсоўгасаў.

4. Абавязаць цэнтральны і раённы друк публікаваць зводкі аб ходзе мясапаставак і адгрузк. Ленінграду, таксама як па пяцідзёнках аб хлебапастаўках, даваць аналіз і заўвагі з паказам адстаючых і перадавых раёнаў.

5. Абавязаць камісію па соцспаборніцтву з Заходняй областцю ўключаць мясапастаўкі як асноўны паказчык для ацэнкі раёна ў спаборніцтве.

6. Абавязаць РК партыі там, дзе ў райзаготжывеле няма загадчыка, неадкладна выдзеліць з раённага актыва найбольш толковага работніка для гэтай работы. У астатніх раёнах РК абавязаны неадкладна ўзмацніць апараты Заготжывелы адпаведнымі работнікамі.

Даручыць сельгасаддзелу ЦК праверыць выкананне як данай дырэктывы, так і пастановы Бюро ЦК ад 17-VII аб ачыстцы і ўмацаванні

апарата Заготжывёлы і на наступным паседжанні Бюро далажыць аб рэалізацыі гэтых пастаноў па раёнах.

7. Лічыць недапушчальным перакідку плешчаніцкім РК КП(б)Б кіраўніка канторы райзаготжывёлы тав. Угольнікава на іншую работу без згоды белканторы Заготжывелы. Адмяніць рашэнне плешчаніцкага РК аб перакідцы т. Угольнікава на іншую работу.

8. Абавязаць старшынь РВК асабіста праверыць, як выконваюцца па раёну ўказанні пленума ЦК ВКП(б) аб прыраўнанні норм мясаздачы калгаснікамі калгасаў, маючых фермы і нявыканаўшых плана, да норм здачы калгаснікаў калгасаў, не маючых ферм, забяспечыўшы спагнанне мяса да 1-X 1934 г.

9. Неабходна РК, РВК і загатоўчым арганізацыям адначасова з узмацненнем мясапаставак забяспечыць своечасовую і поўную адгрузку мяса Ленінграду, не дапускаючы выпадкаў нескарыстання вагонаў.

За нескарыстанне жнівеньскай нормы вагонаў пад адгрузку жывёлы Ленінграду абвясціць суровую вымову кіраўніку старадарожскай райканторы Заготжывелы тав. Вайнзафу. Абавязаць тав. Сідарава арганізаваць у сябе ў апараце, а таксама ў райзаготканторах аперацыйнае кіраўніцтва перасоўкай загатоўленай жывёлы ў раёны падачы вагонаў, вылучыўшы для гэтага адказных работнікаў.

10. Партыйныя і савецкія арганізацыі Лёзненскага і Бешанковіцкага раёнаў з'яўляюцца найбольш адстаючымі па выкананню плана мясапаставак. Не гледзячы на неаднаразовыя папярэджанні ад ЦК спецыяльнымі пастановамі і шляхам тэлеграм, яны не зразумелі і недаацанілі таго, што пытанне мясапаставак—гэта перш за ўсё пытанне снабжэння рабочага класа, Чырвонай арміі, і пустымі размовамі і абяцаннямі змазвалі жывую справу.

ЦК пакуль абмяжоўваецца вынясеннем вымовы сакратарам указаных РК тт. Дзеніскевічу і Каждану і старшыням РВК тт. Шульге і Грышчанка з папярэджаннем, што калі на аснове гэтага рашэння ЦК імі не будуць зроблены адпаведныя вывады і не будзе створан пералом у мясазагатоўках на працягу бліжэйшых-жа дзён па выкананню верасnёўскага плана, ЦК вымушан будзе да іх прыняць усе меры пакарання, якія прымяняюцца ў адносінах невыканання хлебаздачы.

11. Даручыць тав. Валковічу і Картукову выклікаць у ЦК кіраўнікоў [illegible] і бешанковіцкай кантор Заготжывелы тт. Дзямідава і Сасіна, заслухаць тлумачэнні прычын недапушчальнага становішча з мясаздачай у іх раёнах і ўнесці прапанову аб далейшай іх рабоце і пакаранні іх.

12. Запатрабаваць тлумачэння ад сакратароў аршанскага, магілёўскага і [illegible] РК КП(б)Б, чаму знятыя пастановай ЦК і СНК з работы тт. Бабовіч, Бажанаў і Дукшт кіраўнік. раённых кантор Заготжывелы—лічацца яшчэ на рабоце, у рэзультаце чаго работа правалена.

13. Даручыць дырэктару Менскага свінаводтрэста прадставіць у ЦК падрабязны матар'ял аб становішчы соўгаса «Вясновa», а таксама наметіць мерапрыемствы па яго ўмацаванню, пасля чаго даць спецыяльнае рашэнне па гэтаму соўгасу.

14. Адзначыць, што план мясаздачы, устаноўлены для сельпо і млынавых прадпрыемстваў, выконваецца недапушчальна слаба.

Прыняць да ведама заяву тав. Баскіна, што па лініі сельпо да 1 кастрычніка план будзе поўнасцю выканан.

Абавязаць тав. Балціна і старшынь РВК безумоўна выканаць план мясапаставак па прадпрыемствах сельскага мукамолля, кіруючыся ўказаннямі савецкага кантроля 15-IX 1934 г.

15. Магілеўскі і Лезненскі палітаддзелы, якія выдрэнна справіліся з хлебаздачай, і ў той-жа час недастаткова аддаюць увагу здачы мяса калгаснымі фермамі. ЦК абавязвае іх, а таксама і астатнія палітаддзелы, павярнуцца як след да справы мясаздачы і забяспечыць своечасовае выкананне квартальнага і гадавога плана калгасамі зоны дзейнасці МТС.

Аб ходзе загатовак ільнапенькапрадукцыі

Пастанова Бюро ЦК КП(б)Б

Дзве апошнія пяцідзёнкі —на 20 і 25 верасня—далі прырост па ільнавалакну ўсяго 4,4 проц., па ільнанасенню 9 проц. і па пяньцы 0,4 проц.

Тэмпы загатовак зусім не забяспечваюць разгортвання загатовак і своечасовага выканання плана.

Раёны Ча[illegible], [illegible], Клічаўскі, Старадарожскі і інш. яшчэ зусім не прыступілі да загатовак ільнавалакна; Мсціслаўскі, Быхаўскі, Чырвонапольскі і інш. недапушчальна цягнуць са здачай ільнанасення.

ЦК лічыць, што гэта магло атрымацца толькі ў рэзультаце таго, што, па-першае, Белзаготлён і яго сістэма на месцах, ільнатрэст і заводы і Белкаапсаюз не ўзялі ў свае рукі справу загатовак, не разгарнулі аперацыйнага кіраўніцтва загатоўкамі, не адчуваюць прамой і непасрэднай адказнасці за план.

Па-другое, зямельныя органы ў раёнах і НКЗ недастаткова арганізуюць справу хутчэйшай і добраякаснай апрацоўкі лёну.

Па-трэцяе, у цэлым радзе раёнаў пасля выканання хлебаздачы наступіла яўнае самасупакаенне.

РК, РВК, палітаддзелы недастаткова рашуча патрабуюць ад партыйна-савецкіх і загатоўчых арганізацый бальшэвіцкай работы па ільназагатоўках і самі аслабілі кіраўніцтва гэтым адказнейшым участкам работы.

1. ЦК лічыць зусім нецярпімым падобнае становішча з загатоўкай лёну і абавязвае РК, палітаддзелы і РВК у бліжэйшую-ж пяцідзёнку намеціць рад мерапрыемстваў, якія-б забяспечылі рашучы пералом у ходзе ільнапенькazагатовак.

У прыватнасці неабходна:

а) у кожным калгасе, асабліва ільнаводных раёнаў, перавесці на ільнаапрацоўку не менш 50 проц. рабочай сілы;

б) забяспечыць сканчэнне арганізацыі мяльна-трапальных пунктаў і выраб непасрэдна ў калгасах трапальных агрэгатаў не пазней 30 верасня гг.;

в) устанавіць сістэматычны нагляд і кантроль прыёмачных пунктаў Заготлёну і ільназаводаў з пункту погляду правільнасці вызначэння нумарнасці прымаемых валакна і трасты.

Спецыяльна намеціць для гэтага членаў бюро РК і прэзідыума РВК;

г) арганізаваць праз апарат райза штодзенную праверку ходу пад'ёму лёну са сцелішч, каб не дапусціць пералежкі лёну.

2. ЦК лічыць зусім недапушчальнымі адносіны дырэкцый прадпрыемстваў, якім даручан выраб частак ільнатрапалкі «Гарлачова», да

выканання заказу і абавязвае НКЗ, пад адказнасць тав. Савостава, а таксама т. Папе (Белдрэў) і т. Левіна (Белметалтрэст) устанавіць нагляд за вырабам і адгрузкай не пазней 1 кастрычніка драўляных частак Бабруйскім і Гомельскім лесакамбінатамі і металічных частак заводамі Гомсельмаш, «Камунар» і імя Варашылава.

3. За зусім недастатковае кіраўніцтва ільназагатоўкамі ў Чачэрскім раёне, у рэзультаце чаго апошняя пяцідзёнка не дала ніякага прыросту, абвясціць вымову нам. сакратара Чачэрскага РК т. Юрчанка і старшыні РВК т. Падрэцкаму.

4. Папярэдзіць партсавецкае кіраўніцтва Быхаўскага, Шклоўскага, Клічаўскага і Мазырскага раёнаў, што на наступным бюро будуць разгледжаны рэзультаты пяцідзенкі спецыяльна па гэтых раёнах, як найбольш адстаючых.

5. Абвясціць вымову заг. Загатлен Бялыніцкага раёна тав. Новіку за дрэнную арганізацыю справы ільназагатовак, папярэдзіўшы тав. Новіка аб тым, што Бюро ЦК па ходу справы загатовак у наступную пяцідзёнку будзе судзіць аб далейшай яго рабоце.

6. Даручыць НКЗ спецыяльна праверыць работу загадчыкаў райзо Гомельскага і Коупскага раёнаў па пад'ёму са сцелішч лёну і прыцягнуць іх да адказнасці.

Даручыць тав. Кузміну расследваць факты непрыняцця ільназаводамі кудзельнай трасты, прывезенай калгасамі ў кошт плана ў Дрысенскім, Лёзненскім і Рагачоўскім раёнах.

Абавязаць у той-жа час РК узмацніць здачу турбіннай трасты на ільназаводы.

7. ЦК звяртае ўвагу райкомаў, РВК на тое, што аднаасобны сектар фактычна не прыступіў да здачы лёну.

ЦК абавязвае райкомы і РВК забяспечыць арганізацыю справы першаснай апрацоўкі і здачы лёну аднаасобным сектарам, прымацаваўшы з рашаючага па сельсаветах адказных работнікаў, на якіх ускласці сістэматычны нагляд і дапамогу сельсаветам у справе здачы лёну аднаасобнікамі.

8. Лічыць неабходным у рашаючыя раёны па льну выезд членаў Бюро ЦК, членаў і кандыдатаў ЦК тэрмінам на 5 дзён для праверкі і дапамогі раёнам у арганізацыі справы ільнаапрацоўкі і здачы лёну і пянькі.

9. Даручыць т. Валковічу канчаткова ўстанавіць раёны і тэрмін выезду.

Аб разгортванні марксісцка-ленінскай вучобы ў надыходзячы асенне-зімовы перыяд

Пастанова ЦК КП(б)Б

ЦК КП(б)Б канстатуе, што ў рабоце па марксісцка-ленінскаму выхаванню ёсць рад недахопаў. Нездавальняючы падбор і праверка работы прапагандыстаў, нізкі агульнапалітычны, культурны ўзровень значнай часткі прапагандыстаў і іх метадычная падрыхтоўка, нізкая якасць вучобы, нездавальняючая ступень усваення прапрацоўваемага слухачамі матэр'ялу, арганізацыйны бок у рабоце сеткі партасветы пастаўлен дрэнна.

Значная частка раённых камітэтаў партыі, палітаддзелаў МТС, соўгасаў канкрэтна арганізацыяй работы па партасвеце не кіруюць, у выніку чаго яшчэ ва многіх раёнах асабліва на вёсцы, да гэтага часу нездавальняюча разгорнута падрыхтоўчая работа да арганізацыі асенне-зімовай партвучобы.

У разгортванні асенне-зімовай партвучобы ў радзе партарганізацый мае месца механічны падыход у камплектаванні сеткі партасветы, няма дастатковага вывучэння ўзроўню кожнага комуніста.

Праверка вылучаемых прапагандыстаў праз спецыяльныя камісіі і зацвярджанне іх на бюро ГК, РК у радзе раёнаў не праводзіцца.

ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Прапанаваць усім ГК і РК КП(б)Б, палітаддзелам МТС і соўгасаў прыняць рашучыя меры да разгортвання асенне-зімовай партвучобы, паставіўшы ў цэнтры ўвагі барацьбу за высокую якасць прапаганды ленінізма і рашэнняў XVII з'езда партыі, ахоп вучобай усіх членаў, кандыдатаў партыі і спачуваючых.

2. Прапанаваць усім парарганізацыям правесці ўкамплектаванне сеткі партасветы на аснове ўліку вытворчых умоў і дакладнага вывучэння ўзроўню агульнай граматнасці і палітычнай падрыхтоўкі кожнага комуніста.

3. Абавязаць горрайкомы КП(б)Б, палітаддзелы МТС і соўгасаў вылучаных для работы ў сетцы партасветы прапагандыстаў абавязкова прапусціць праз спецыяльныя адборачныя камісіі. Да заняткаў дапускаць прапагандыстаў толькі пасля дакладнай праверкі зацверджання на бюро горрайкомаў і палітаддзелаў.

ЦК КП(б)Б прапануе усім горрайкомам КП(б)Б, палітаддзелам МТС соўгасаў прыцягнуць да прапагандысцкай работы ў школах і гуртках усіх падрыхтаваных таварышоў, якія могуць весці прапагандысцкую работу, з партактыва.

4. Стварыць для вучобы прапагандыстаў пропсемінары. Кіраўнікоў прапагандысцкіх семінараў зацвердзіць на бюро ГК і РК КП(б)Б

Асноўным зместам работы пропсемінараў павінна быць павышэнне агульна тэарэтычнага, метадычнага і культурнага ўзроўню прапагандыстаў, падрыхтоўка прапагандыстаў да кожных заняткаў як па сутнасці тэм, так і метада выкладання.

Устанавіць, што пропсемінары павінны займацца тры дні ў месяц з вызваленнем ад работы.

Ускласці алказнасць за работу пропсемінараў у райкомах персанальна на сакратароў райкомаў, у гаркомах—на загадчыкаў аддзеламі культуры і прапаганды ленінізма.

Даручыць аддзелу культуры і прапаганды ленінізма ЦК КП(б)Б прымацаваць да групы раёнаў кваліфікаваных таварышоў з Менска для вядзення заняткаў у пропсемінарах прапагандыстаў.

5. ЦК КП(б)Б падкрэслівае, што партгабінеты павінны адыграць выключна велізарную ролю ў справе палепшання якасці партвучобы.

Асноўным зместам іх работы павінна быць: аказанне тэарэтычнай і метадычнай дапамогі прапагандыстам і партактыву.

Папярэдзіць усе партарганізацыі супроць спроб ускласці на партгабінеты функцыі былых культпропаў.

Стварыць партгабінеты ва ўсіх раёнах і буйных прадпрыемствах.

На работу заг. партгабінетамі вылучыць найбольш тэарэтычна падрыхтаваных таварышоў.

Забараніць гаррайкомам рабіць замену і перакідку загадчыкаў партгабінетамі без ведама аддзела культуры і прапаганды ленінізма ЦК КП(б)Б.

Прапанаваць аддзелу культуры і прапаганды ленінізма мабілізаваць з Менска, Віцебска, Гомеля 25 таварышоў для пасылкі ў раёны ў якасці загадчыкаў партгабінетамі.

6. ЦК КП(б)Б падкрэслівае велізарнае значэнне радыёпартвучобы праз БІМЭО у справе павышэння ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню камуністаў, асабліва нізавога партыйнага, савецкага і калгаснага актыва.

Прапанаваць райкомам і палітаддзелам МТС і соўгас ў арганізаваць сур'ёзную пастаноўку задачы партвучобы ў гэтым годзе ў адпаведнасці з ранейданымі дырэктывамі ЦК.

Прапанаваць БІМЭО значна палепшыць пастаноўку вучэбнага працэса: кансультацыі, рэцэнзіі, канферэнцыі, радыёлекцыі, узмацніць канкрэтнае кіраўніцтва справай разгортвання завочнай партвучобы.

7. Адобрыць ініцыятыву менскай, гомельскай, барысаўскай партарганізацый аб разгортванні у рабоце па партасвеце метадаў соцспаборніцтва.

ЦК КП(б)Б прапануе ўсім партарганізацыям шырока ўкараніць спаборніцтва ў рабоце па партвучобе паміж школамі і гурткамі, пярвічнымі арганізацыямі, раёнамі на лепшую пастаноўку партвучобы.

8. Прапанаваць усім гаррайкомам КП(б)Б, палітаддзелам МТС, соўгасам устанавіць дакладную праверку якасці партвучобы, якасці работы школ і гуртков шляхам сістэматычнага наведвання заняткаў членаў бюро ГК, РК і перыядычнага заслухоўвання работы асобных школ і гурткоў, прапагандыстаў на бюро гаррайкомаў.

9. Прапанаваць дырэктару партвыдата тав. Арабею, дырэктару друкарні імя Сталіна тав. Фельдману выдаць партвучэбнікі на беларускай мове ў наступныя тэрміны: Сталіна „Пытанні ленінізма" не пазней 10 кастрычніка, палітграматы Волкава і Інгулава не пазней 15 кастрычніка, Быстранскага—„Хрэстаматыя па ленінізму" і Кнорына—„Гісторыя ВКП(б)" не пазней 15 лістапада, двухтомнік выбра-

ных твораў Леніна—к першаму снежня, Маркса—Энгельса—20 снежня.

10. У мэтах заслухоўвання інфармацый з месц аб ходзе работы па разгортванню асенне-зімовай партвучобы і аб чарговых задачах у галіне марксісцка-ленінскага выхавання ў асенне-зімовы перыяд склікаць 15 кастрычніка ў горадзе Менску ўсебеларускую нараду па пытанню арганізацыі марксісцка-ленінскай вучобы ў надыходзячы асенне-зімовы перыяд.

На нараду выклікаць: сакратароў РК КП(б)Б 3—5 раёнаў, нам. сакратароў РК КП(б)Б 10 раёнаў, загадчыкаў аддзеламі культуры і прапаганды ленінізма ГК КП(б)Б, нам. нач. палітаддзелаў МТС і соўгасаў па партмасавай рабоце інструктароў РК КП(б)Б—20 раёнаў (па аднаму чалавеку з раёна), загадчыкаў дамамі партактыва і партгабінетамі—15 чал. і 10 сакратароў парткомаў з раёна.

11. Зацвердзіць формы партвучобы, рэкамендаваныя аддзелам культуры і прапаганды ленінізма ЦК КП(б)Б партарганізацыям.

12. ЦК КП(б)Б падкрэслівае неабходнасць шырокага разгортвання партвучобы комуністаў на вёсцы, асабліва адзіночак.

Прапанаваць ГК і РК КП(б)Б, палітаддзелам шырока скарыстаць апраўдаўшыя ў радзе раёнаў формы партвучобы—семінары парторгаў, выклік на 3—5-дзённыя курсы адзіночак у раён, палітаддзелы: арганізацыя школ-перасовак, дача паасобным таварышам заданняў на дом і інш.

13. Прапанаваць ГК і РК КП(б)Б аказаць дапамогу транспартным партарганізацыям у разгортванні асенне-зімовай партвучобы, асабліва прапагандысцкімі кадрамі.

14. Устанавіць перыядычнае заслухоўванне на бюро ЦК КП(б)Б дакладаў паасобных ГК, РК, пярвічных партарганізацый аб становішчы работы па марксісцка-ленінскаму выхаванню.

15. ЦК КП(б)Б падкрэслівае, што работа па марксісцка-ленінскаму выхаванню радоў партыі з'яўляецца справай усёй партыі і кожнай партарганізацыі паасобку. Персанальна нясуць адказнасць за гэту работу сакратары гаркомаў, райкомаў, парткомаў, парторгі.

Прапанаваць усім ГК і РК КП(б)Б, палітаддзелам МТС і соўгасаў арганізаваць работу па партасвеце так, каб забяспечыць палепшанне якасці прапаганды марксізма-ленінізма і рашэнняў XVII з'езда партыі, падняць узровень ідэйна-палітычнай узброенасці членаў і кандыдатаў партыі і спачуваючых на яшчэ больш высокую ступень у адпаведнасці з дырэктывамі XVII з'езда партыі.



Галоўлітбел № А 5137
Тыраж 9325
465.920 друк. зн. ($8\frac{3}{4}$ арк.)
Здана ў набор 28/IX—34 г.
Падпісана да друку 13/X—34 г.
Набрана на лін. № 6
Адк. кар. друк. *Вгратынская, Гараўскі.*

Рэдкалегія: Мінкін (адк. рэдактар), Конік, Злоткін

Друкарня імя Сталіна. Зак. № 1220.

Цана 50 кап.

[illegible] ўсіх кр[illegible]

Інстытут Масавага [illegible] Партактыва [illegible]

Інстытут Масавага Завочнага Навучання Партактыва пры ЦК КП(б)Б даводзіць да ведама

[illegible]

радыёслухачоў, арганізацый, партыйных і [illegible]:

1. Гісторыя ВКП(б) (18 лекцый)

Курс перадаецца на працягу 4-х месяцаў і паўтараецца [illegible] 1934 г.—люты 1935 г. і люты—май 1935 г.).

Лекцыі па гісторыі ВКП(б) будуць перадавацца [illegible] 9, 11, 1[illegible] кожнага месяца.

2. Палітэканомія (16 лекцый)

Курс перадаецца таксама на працягу 4-х месяцаў і паўтараецца (кастрычнік 1934 г.—люты 1935 г. і люты—май 1935 г.)

Лекцыі па палітэканоміі будуць перадавацца на [illegible] месяца.

3. Пытанні гісторыі і праграмы Кам[illegible]

Цыкл перадаецца на працягу 3-х месяцаў [illegible] беларускай, польскай і яўрэйскай мовах.

4. Пытанні праграмы і статута ВКП(б)

Цыкл перадаецца ў лютым — маі 1935 г. на бе[illegible] мовах.

5. Ленінізм (12 лекцый)

Курс перадаецца ў лютым — маі 1935 г.

6. Як вывучаць творы класікаў марксізма-ленінізма.

Кансультацыі даюцца два разы ў месяц на працягу ўсяго навучальнага года.

7. Пытанні соцыялістычнай сельскай гаспадаркі

Цыкл перадаецца на працягу ўсяго навучальнага года па 3 лекцыі ў месяц у наступным парадку:

у кастрычніку—снежні — пытанні жывёлагадоўлі

у снежні—лютым — пытанні арганізацыі с.-г. вытворчасці

у сакавіку—маі — пытанні агратэхнікі.

8. Эканамічная геаграфія СССР (1[illegible] лекцый)

Цыкл перадаецца на працягу 3-х месяцаў: лістапад 1934 г.—студзень 193[illegible]

9. Пытанні 2-й пяцігодкі (12 лекцый)

Цыкл перадаецца на працягу 4-х месяцаў: лю[illegible] май 1935 г.

10. Эпізадычныя радыёлекцыі і кансультацыі

перадаюцца на працягу ўсяго навучальнага года.

11. Пытанні бягучай палітыкі партыі [illegible]

перадаюцца таксама на працягу ўсяго навучальнага года.

Радыёлекцыі Інстытута перадаюцца праз [illegible] радыёстанцыю [illegible] 40 мін. Календарны іх расклад на месяц загадзя абвяшчаецца ў газеце „Звязда“, [illegible] „навучанне“, у часопісе „Бальшавік Беларусі“, рассылаецца і па радыё.

Увага. Радыёлекцыі Інстытута пры ЦК ВКП(б) (Масква) [illegible] праз радыёстанцыю імя Камінтэрна з 1[illegible] да 19 г. 30 мін.

Лекцыі завочнай партвучобы слухайце ў спецыяльна абсталяваных радыёаўдыторыях пры палітаддзелах МТС, саўгасаў і транспарта, у партыйных [illegible], у калгасах, на прадпрыемствах, а таксама ў сябе дома на індывідуальныя прыёмнікі і точкі.

Запісвайцеся на арганізаванае слуханне радыёлекцый Інстытута.

З арганізаванымі [illegible] праводзяцца [illegible] Інстытута кансультацыі. Пасля здачы адпаведнага заліку слухачы [illegible] пасведчанне аб праслуханні адпаведнага курса лекцый.

Усе даведкі аб завочнай партвучобе можаце атрымаць у палітаддзелах, у РК КП(б)Б — у інструктара па завочнай партвучобе і [illegible] ІМЗНП пры ЦК КП(б)Б.

Пытанні, водзывы і заўвагі аб радыёперадачах дасылайце без марак на адрас:

Менск, вул. К. Маркса, 47/30, Інстытут пры ЦК КП(б)Б, радыёсектар.

ДЫРЭКЦЫЯ ІНСТЫТУТА.